ЛіМ ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

16 СТУДЗЕНЯ 2004 г. № 3/4240

I пол. 2004г. кат. №1-2.

АНОНС!

Набліжаецца 60-годдзе вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 60-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Установа «Літаратура і Мастацтва» праводзіць агульнанацыянальную акцыю па стварэнні кнігі «Наша Перамога». Запрашаем усіх, хто зацікаўлены, да супрацоўніцтва.

Уладзімір САЛАМАХА:

"Паступовае выцясненне літаратуры з адукацыі вядзе да духоўнай дэградацыі многіх нашых суайчыннікаў. Незалежна ад іх вялікіх ці маленькіх пасад і званняў."

4



ВЕЦЕР У ГРЫВАХ

У Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі экспануецца выстава скульптара Сяргея БАНДАРЭНКІ "Бронзавы век", асноўны лейтматыў якой — людзі і коні.

Стар. 15

ФОТА М. ЗАМУЛЕВІЧА

ЗМЕНА «ГІСТАРЫЧНАЙ АРЫЕНТАЦЫІ»

Як ні дзіўна, але апошнія размовы пра ідэалогію мне здаваліся крыху не своечасовымі, бо зусім не праблемы беларускай ментальнасці і духоўных пошукаў сёння самыя актуальныя. Толькі прачытаўшы артыкул Таісы Бондар у "ЛіМе" ад 28.11.03, я зразумеў, што на гэту тэму гаварыць ніколі не позна, а можа, нават ужо і не рана. Трэба толькі ведаць з кім і як весці гаворку.

Мне, як чалавеку, што пражыў у савецкім часе толькі палову свайго свядомага жыцця, крыху інакш бачыцца гісторыя распаду самай вялікай краіны XX ст. Напэўна, у момант свайго разбурэння ў яе сапраўды ўжо не было той моцы, таго маральна-духоўнага стрыжня, на якім яна трымалася многія дзесяцігоддзі. Спачатку сістэма абрынулася ўнутры, у душах людзей, што страцілі веру ў камуністычныя ідэалы. Толькі потым здарыліся тыя вонкавыя падзеі, добра вядомыя ўсяму свету. І не варта перабольшваць (хоць і немалыя) духоўныя здабыткі, якія прынесла савецкая эпоха. Сёння вядома, што не меншымі былі і страты — як духоўна-інтэлектуальныя, так і фізічныя. Пра тое, што духоўнасць савецкага чалавека была не вельмі трывалай, а бадай, павярхоўнай, сведчыць хуткасць і лёгкасць, з якой распаўсюджваецца гэтак званая "заходняя культура". Але пра сёняшняе вызначэнне "Захаду" і нашы ўзаемаадносіны з ім мне хацелася б пагаварыць больш дэталёва.

У нашай савецка-беларускай традыцыі "Захад" заўсёды набывае негатыўна-палітычную афарбоўку, а часам нават дэманічныя рысы: гэткі маналітны пачварны монстр, які сядзіць на вяршыні свету і бязлітасна пагнятае адну за адной малыя і слабыя краіны. І ўсё ж, адарваўшыся ад метафар, выбярэм наўскідку некалькі краін — Аўстралія, Японія, Фінляндыя, Чылі... Усе яны палітычна належаць да заходняга лагеру, хоць геаграфічна заходней Беларусі толькі адна Чылі. Усе яны ў той ці іншы час і ў рознай ступені спазналі уплыў (а некаторыя нават дыктат!) ЗША. І што з таго? Японія перастала быць Японіяй, а Фінляндыя стала больш падобна на Аўстралію? Рэальнасць сёння такая, што "Захад" — не імперыялістычны "монстр", а стракаты разнастайны свет, значна больш багаты і неаднародны, чым былая 1/6 частка сушы. І не трэба вынаходзіць веласіпед — існуюць шматлікія прыклады і напрацаваныя механізмы інтэграцыі ў сённяшні час і ў сусветную цывілізацыю. Хаця ёсць і іншыя ўзоры... Шчыра кажучы, як сапраўдны беларус, я бы з задавальненнем наследаваў вопыту Японіі XVII ст. і на пару вякоў адасобіў бы Беларусь ад іншых краін, каб адрадзіць і ўдасканаліць нашы нацыянальныя традыцыі і каштоўнасці. Толькі вось жывём мы, на жаль, не на востраве, а на еўрапейскіх ростанях, і пабудаваць вялізны фантастычна-ізаляцыйны плыт вакол нашай немаленькай краіны бадай нерэальна. Таму выбару ў нас няма. Трэба жыць тут і з тымі хто побач. А паколькі "Захад" падбіраецца да нас з усіх бакоў, часам нават і з усходу, то трэба... вучыцца. Бо каб выжыць у абдымках "Захаду", а тым больш, каб яго перамагчы, трэба навучыцца карыстацца ягонай зброяй, ягонымі здабыткамі і тэхналогіямі. А павучыцца ў "Захаду" ёсць чаму, і не толькі ў эканоміцы, палітыцы ці экалогіі. У той самай інтэлектуальнай і духоўнай сферы ў "заходніх" краінах абодвух паўшар'яў багата чаго карыснага і цікавага. Ёсць там не адны трылеры, кілеры і парнаграфія, але і шматвекавы вопыт сусветных цэркваў, і вяршыні філасофскай думкі, і глыбіні мастацкіх адкрыццяў ды літаратурных пошукаў. Трэба толькі ведаць, што мы хочам адтуль узяць, што будзе па "нашым памеры", па "нашым тэмпераменце" і па "нашых зубах". "Захад" ужо нельга ігнараваць або перамагчы прымітыўным "матам у тры хады". У яго можна толькі ўжыцца і крыху памяняць "пад сябе", але, канечне, памяняцца ў чымсьці давядзецца і самім. А гарантыяй таго, што мы застанемся беларусамі можа быць толькі наша мова і наша зямля. Мова, на якой мы будзем заўсёды размаўляць, і зямля, у якую мы будзем заўсёды сыходзіць і зноў паўставаць. Усё астатняе будзе мяняцца — архітэктура, тэхніка, палітычная мода, мастацтва і нават людзі. Не выключаю, што калісь беларусы стануць больш чарнявымі і цёмнаскурымі, чым сёння, але калі яны будуць размаўляць па-беларуску і любіць гэтую зямлю — яны таксама будуць беларусамі. Іншая "ідэалогія" сёння, у эпоху новага перасялення народаў і культурнай глабалізацыі не будзе мець перспектыў. Трэба прачнуцца ад ружовых сноў XX ст. і прыняць рэаліі новага часу, якімі б жахлівымі на першы погляд яны не здаваліся. Тым больш, што не ўсё так безнадзейна. Беларусам не раз у тысячагадовай гісторыі даводзілася ўжо мяняць сваю "гістарычную арыентацыю" і прыстасоўвацца да кардынальных геапалітычных перамен. Думаю і ў гэты раз мы выжывем і, спадзяюся , нават умацуем нацыянальны дух, характар і гістарычны аптымізм.

В. АЎРАМЕНКА,
г. Магілёў

ЛІМАЎЦЫ Ў СТУДЭНТАЎ

Напрыканцы снежня БДУ культуры наведалі супрацоўнікі "ЛіМа", пісьменнікі Леанід Галубовіч, Алесь Гаўрон і Наталля Дзянісава. На імпрэзе прысутнічалі студэнты розных факультэтаў, выкладчыкі кафедры беларускай філалогіі і прадстаўнікі творчай суполкі "БУКет", якой кіруе паэтка Алена Багамолава. Пасля грунтоўнай размовы пра газету адбыўся творчы ўзаемаабмен: "букетавец" Адам Шостак пазнаёміў прысутных са сваімі творамі, Леанід Галубовіч прачытаў вершы са сваёй апошняй кніжкі. Завяршылася сустрэча абмеркаваннем у коле выкладчыкаў і студэнтаў надзённых праблем грамадска-літаратурнага жыцця.

АДЗНАЧЫЛІ Ў ВОРЗЕЛІ

Міжнародны конкурс "Мастацтва XXI стагоддзя" прайшоў у г.Ворзелі, што паблізу Кіева. Арганізавалі гэтае творчае спаборніцтва Міжнародная асацыяцыя "Мастацтва і адукацыя ў XXI стагоддзі", украінскі Дом кампазітараў, Міжнародная школа музычнага, педагагічнага і выканальніцкага майстэрства. У намінацыі "сольнае фартэпіяна" ўдала выступіла студэнтка другога курса Беларускай акадэміі музыкі Людміла Канавалава. Наша маладая піяністка (дарэчы, вучыцца яна ў класе знанага педагога Яўгена Пукста) адзначана 3-й прэміяй і званнем лаўрэата.

Н.К.

«КРЫК НЕМАЎЛЯЦІ» — летапіс Берасцейшчыны

"Найвялікшае шчасце — быць сярод людзей, бачыць, чуць і ўмець захапляцца; бачыць парог роднай хаты і чысты блакіт неба, чуць гамонку будоўляў і музыку ліўня, захапляцца велічнасцю нашых здзяйсненняў і першым промнем світанку. З гэтым капіталам, найдаражэйшым на свеце, і даступным кожнаму, не сорамна глянуць у вочы сына і бацькі, людзей і Радзімы. Дзеля яго можна сотні разоў пераадольваць зямное прыцягненне, пракладаць новыя трасы ў нязведанае, не страшна згарэць у імклівым палёце і застацца яркай зорачкай арыенціра для ўсіх, хто прагне вышынь, а, значыць, найвышэйшага шчасця".

З такімі пранікнёнымі словамі звяртаецца Пётр Ільіч Клімук да нашчадкаў новага стагоддзя ў кнізе Міколы Панасюка "Крык немаўляці", якая выйшла ў свет у выдавецтве ААТ "Брэсцкая друкарня" ў 2003 годзе. Гэта пятае, перапрацаванае літаратурна-мастацкае выданне вядомага беларускага публіцыста і паэта, якое змясціла старонкі з жыцця Пятра Клімука, вершы, алфавіт для дзяцей і дарослых. Паэтычна-публіцыстычны зборнік прымеркаваны да 60-гадовага юбілею першага беларускага касманаўта. Аўтару кнігі амаль трыццаць год таму выпаў цудоўны шанц: пажыць у гасцініцы Зорнага гарадка "Арбіта", пабыць і госцем сям'і П. Клімука, і на вучэбнай арбітальнай касмічнай станцыі "Мір", вынікам чаго было з'яўленне дакументальных кніг "Арыенцір — сузор'е Арыёна" і "К созвездиям".

Зараз М. Панасюк стварыў паэтычны жыццяпіс славутага земляка-касманаўта, праспяваў гімн першаму зоркапраходцу Бацькаўшчыны, які тройчы пабываў у космасе і пакінуў запамінальны беларускі след "на пыльных тропинках далёких планет".

Напрыканцы зборніка змешчаны беларускі "Алфавіт для дзяцей і дарослых", складзены згодна трох важных катэгорый, якія асветнік Францыск Скарына, іншыя славутыя прадстаўнікі Эпохі Адраджэння лічылі трыма атлантамі, на якіх трымаецца гармонія свету — **Розум**, Справядлівасць, Хараство.

"Крык немаўляці" — гэта праўдзівы паэтычна-публіцыстычны летапіс Берасцейшчыны на пачатку новага стагоддзя.

Леанід РАМАНЕНКА

АДУХОЎЛЕНАЯ ЗЯМЛЯ

Кожны бачыць свет па-рознаму, па-свойму. Нядаўна мы мелі магчымасць зірнуць на навакольнае асяроддзе вачамі Сюзаны Баўман. У Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі прайшла персанальная выстава гэтай вядомай швейцарскай мастачкі.

"Малая сусветная выстава", у якую ўвайшлі 130 твораў апошніх дваццаці гадоў, нават сваёй назвай падкрэслівае, што гэта толькі ўласнае бачанне адным чалавекам усяго бясконцага Сусвету. У залах, дзе размясцілася экспазіцыя, з'яўлялася адчуванне, быццам ты апынуўся ў нейкім невядомым дагэтуль, незвычайным свеце. Шматлікія скульптуры, калажы і асамбляжы, нічым не падобныя адно да аднаго, ствараюць уражанне фантастычнай прыгажосці і ўзнёсласці. Звычайныя рэчы, адыходы цывілізацыі, знойдзеныя разнастайныя прадметы, дзякуючы відавочнаму таленту швейцарскай мастачкі, атрымалі сваё другое жыццё.

Гэтая экспазіцыя ўключала пяць тэматычных раздзелаў, з якіх самы галоўны і вялікі па колькасці твораў — "Жывая зямля", у якім Сюзана Баўман малюе зямлю адухоўленай істотай. Увогуле, было шмат знакаўсімвалаў зямлі — глобусы, шары розных колераў і памераў, цыферблаты і люстэркі. І ўся выстава прысвячалася багіні зямлі — Геі.

Энергетычную вежу, чароўную палачку, птушку Фенікс, дзіўныя аб'екты са шкла і металу ды шмат чаго іншага ўбачылі наведнікі "Малой сусветнай выставы".

Творчасць Сюзаны Баўман успрымалася як заклік да ўсяго чалавецтва — звярнуць увагу на жывы свет, які апынуўся пад пагрозай знішчэння.

Алеся ГРЫЧЫК

КУЛЬТУРА БУДЗЕ ПАДТРЫМЛІВАЦЦА

У апошнія дні года ў Беларускім дзяржаўным інстытуце праблем культуры праходзіў чарговы семінар "Дзяржава і творчая асоба", на якім выступіў намеснік міністра культуры Валеры ГЕДРОЙЦ:

— Каб стварыць перадсвяточны настрой, — сказаў ён, — па даручэнню калегіі міністэрства перадаю Святлане Рыбаравай і Мікалаю Казенку ганаровыя знакі "За ўклад у развіццё культуры Беларусі".

Сёння тут сабраліся работнікі культуры, якія стаяць у рэзерве кадраў і ў хуткім часе зоймуць больш адказныя, кіруючыя пасады. Раней прызначэнне кіруючых супрацоўнікаў міністэрства культуры было крыху фармалізавана, цяпер мы спадзяёмся, што на пасады будуць вылучацца людзі, якія прайшлі ўсе прыступкі культурніцкай работы, з вопытам і кіраўнічымі здольнасцямі.

Далей В. Гедройц расказаў пра задачы міністэрства, паставленыя Прэзідэнтам РБ А. Лукашэнкам на сустрэчы з творчай інтэлігенцыяй рэспублікі. З боку прысутных былі зададзены надзённыя пытанні, а прафесар І. Кулік выказаў заклапочанасць работаю Атэстацыйнай камісіі, якая не сур'ёзна ставіцца да навуковай творчасці бібліятэчных работнікаў.

На завяршэнні семінара В. Гедройц паведаміў, што ў новым годзе павялічацца дзяржаўныя выдаткі на культуру. Мяркуецца адкрыць новыя тэматычныя гранды, імянныя стыпендыі для найбольш выдатных талентаў, падтрымаць культуралагічныя выданні.

А. Г.

І КОЖНЫ З ІХ — НЕ ТОЛЬКІ МАЙСТАР!

Раство Хрыстова, Каляды, Новы год... Святы, што прыпадаюць на казачны зімовы час, поўняцца традыцыйнымі рытуаламі, размаітымі ўрачыстасцямі. Сюрпрызамі ды падарункамі. А самая, бадай, маладая, унікальная і прыгожая традыцыя, што звязана ў нашай краіне са святам Раства і з пачаткам новага года, — гэта ўручэнне прэмій "За духоўнае адраджэнне" і Спецыяльных прэмій Прэзідэнта Беларусі дзеячам культуры і мастацтва.

Святары, вучоныя, артысты, асветнікі... У гэты дзень яны на сцэне — поруч. Бо, як заўважыў Аляксандр Лукашэнка, віншуючы новых лаўрэатаў, вера і мастацтва непарыўна звязаныя. Нібы грані адзінага духоўнага чыну чалавека. Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што кожны з іх — не толькі майстар сваёй справы, а і цікавая асоба. Адметная асоба, якая аддае ўсе сілы розуму і душы служэнню роднай Беларусі.

Мы мелі магчымасць паглядзець цырымонію ганаравання па БТ, пазнаёміцца з уладальнікамі прэстыжных прэмій праз праграмы эфіру або аператыўны друк. Застаецца толькі нагадаць...

Такім чынам, лаўрэатаў прэміі "За духоўнае адраджэнне" 2003 года — чацвёра.

Протаіерэй Свята-Барысаглебскай царквы, што ў Гродне, Андрэй Бандарэнка (чытачам "ЛіМа" ён вядомы як і кампазітар, у свой час удастоены Дзяржаўнай прэміі Беларусі за стварэнне оперы "Князь Наваградскі").

Галіна Паўлянок. Тое, што яе майстэрства захапляе і заварожвае, неаднойчы адзначаў "ЛіМ". Цудоўны яе голас часта гучыць у сталічнай Зале камернай музыкі, у радыёэфіры. Выдатная спявачка, заслужаная артыстка Беларусі, салістка Гомельскай абласной філармоніі, а цяпер яшчэ і лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне "Галіна Паўлянок у чарговы раз была прадстаўлена на старонках тыднёвіка 31.10.2003 г. ("Самаадданае solo").

Іван Чарота. Імя шаноўнага навукоўца загадчыка кафедры славянскіх літаратур філалагічнага факультэта БДУ нашаму чытачу вядомае добра; а публікацыі Івана Чароты, сталага аўтара "ЛіМа", заўсёды прываблываюць увагу сваёй духоўнай змястоўнасцю.

Не мае патрэбы ў рэкамендацыях і вядучы майстар сцэны Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага, народны артыст СССР Расціслаў Янкоўскі — выбітная постаць у айчыннай культуры. (Дарэчы, не так і даўно быў ён у лімаўскай "Гасцёўні" — гл. нумар за 27.06.2003 г.)

7 студзеня ў Палацы Рэспублікі апроч чатырох прэмій "За духоўнае адраджэнне" ўручаліся і Спецыяльныя прэміі Прэзідэнта Беларусі ў розных намінацыях: за высокія творчыя дасягненні, за ўклад у выхаванне моладзі, за ўклад у міжнародныя культурныя сувязі і г.д. Тут лаўрэатамі названы 13 дзеячаў культуры і мастацтва, а таксама 8 творчых калектываў, бібліятэчных і музейных суполак. (Прыемна, што ў ліку іх ёсць і героі нашых публікацый). Сярод узнагароджаных — адзін з вядучых айчынных кампазітараў, прафесар Дзмітрый Смольскі, саліст Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы Беларусі Алег Мельнікаў, адказны сакратар часопіса "Бярозка" Алесь Наварыч, рэдактар аддзела часопіса "Беларуская думка" Міхась Шэлехаў, мастак і рэжысёр з Вілейшчыны Барыс Цітовіч, дырэктар, мастацкі кіраўнік Белдзяржцырка Таццяна Бандарчук, галоўны мастак Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы Барыс Герлаван, выкладчык Маладзечанскага музычнага вучылішча імя М.Кл.Агінскага Тамара Бялькова, калектыў Браслаўскага раённага аб'яднання музеяў, Гродзенскі абласны тэатр лялек, народны ансамбль музыкі ды спеваў "Палешукі" з Іванаўскага раёна...

Сёлетняя цырымонія ўручэння прэстыжных прэмій беларускім рупліўцам на ніве духоўнасці і культуры мела сапраўдную адметнасць. На ёй прысутнічаў шаноўны госць — сусветна вядомы куцюр'е, мецэнат і пасол добрай волі ЮНЕСКА, прадстаўнік Францыі П'ер Кардэн. Ён вядомы і як добры сябра нашага народа. Спадар Кардэн спрыяе развіццю франка-беларускіх культурных стасункаў (без малога два гады таму менавіта Цэнтр Кардэна наладзіў і паспяхова правёў у Парыжы Дні культуры Беларусі. Сярод іх удзельнікаў былі нашы лепшыя мастакі, артысты, спевакі, музыканты). А яго дабрачынная дзейнасць сталася важнай дапамогай у пераадоленні наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Вялікія заслугі П'ера Кардэна адзначаны высокай узнагародай Беларусі — ордэнам Францыска Скарыны, які быў уручаны нашаму госцю таксама 7 студзеня.

У канцэртнай праграме, што адбылася на вялікай сцэне Палаца Рэспублікі пасля цырымоніі ўручэння прэмій, удзельнічалі майстры мастацтваў (у тым ліку і ўладальнікі высокіх дзяржаўных узнагарод), творчая моладзь краіны. Мажліва, праз год хтосьці з іх і сам будзе героем гэтай прыгожай традыцыйнай цырымоніі.

С.Б.

НА ЗДЫМКУ: лаўрэаты прэмій "За духоўнае адраджэнне"-2003 г.

ЮБІЛЕЙ ПАЭМЫ

Мой родны кут!
Як ты мне мілы!
Забыць цябе не маю сілы!

Хто не ведае гэтых тэстаментных радкоў, якія хвалююць сэрца, не атрымліваў асалоды ад прачытання славутай паэмы Я. Коласа "Новая зямля"... Яе справядліва называюць "энцыклапедыяй народнага жыцця на пераломе XIX–XX стст.", дзе па-майстэрску паказаны тыпы беларускіх сялян, высокамастацкі адлюстравана жывапісная прырода Наднямоння.

Паэма пісалася на працягу больш чым 10 гадоў і была закончана ў 1923 годзе. Летась ёй споўнілася 80. З гэтай нагоды ў Дзяржаўным літаратурна-мемарыяльным музеі Я. Коласа адбылася вечарына. Уступнае слова аб значнасці "Новай зямлі" для беларусаў сказала дырэктар музея З. Камароўская. Вяла сустрэчу музейная супрацоўніца Г. Зайцава. Яна, у прыватнасці, сказала:

— "Новая зямля", гэты непераўзыдзены шэдэўр класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа будзе жыць, чараваць чытачоў, пакуль будзе жыць наша Беларусь.

У кожнага, хто выступаў, былі свае ўражанні ад паэмы. Пісьменнік і артыст Анатоль Жук, які сыграў ролю Міхала ў відэафільме "Новая зямля", што быў створаны яшчэ да 100-годдзя Я. Коласа, гаварыў аб гістарычнай лёсаносных галоўных герояў паэмы. Сын і ўнучка песняра Міхась Станцінавіч і Марыя Міхайлаўна Міцкевічы расказалі пра малавядомае з жыцця і творчасці Я. Коласа, прачыталі ўрыўкі з паэмы на беларускай і англійскай мовах. З вуснаў перакладчыка Валерыя Стралко радкі "Новай зямлі" гучалі і па-ўкраінску. Зямляк народнага паэта, пісьменнік Яўген Хвалей узгадаў "Сцяжыну новазямельцаў" са "Шляху Коласа", устаўленую драўлянымі скульптурамі герояў паэмы, якая вядзе са стаўбцоўскага гасцінца да Альбуці, прачытаў пра яе верш.

Урыўкі з "Новай зямлі" чыталі дыктар Беларускага радыё А. Вінярскі, актрыса, кіраўнік тэатра аднаго акцёра "Зьніч" Г. Дзягілева. Былі паказаны кадры з відэафільма "Новая зямля", прагучаў з магнітафоннай стужкі голас Якуба Коласа.

Алесь КРУШЫНА

УВАГА!

Шаноўныя маладыя літаратары, *22 студзеня ў 18 гадзін* пры **РВУ "Літаратура і Мастацтва"** адбудзецца чарговае пасяджэнне семінара-аб'яднання **"Літаратурны квартал"**.

Тут вы зможаце сустрэцца з вядомымі паэтамі і празаікамі, крытыкамі і літаратуразнаўцамі, пачуць водгукі на свае творы, прапанаваць лепшае для друкавання ў выданнях Рэдакцыйна-выдавецкай установы **"Літаратура і Мастацтва"**.

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

З Новага года максімальна скарочана паступленне "ЛіМа" ў розніцу. Адзіная магчымасць застацца нашымі чытачамі — падпісацца на газету!

Кошт індывідуальнай падпіскі:
(індэкс — 63856)
на 1 месяц — 2600 рублёў;
на 3 месяцы — 7800 рублёў.

Кошт ведамаснай падпіскі:
(індэкс — 63857)
на 1 месяц — 4100 рублёў;
на 3 месяцы — 12300 рублёў.

МАГІЛЁЎШЧЫНА

МАГІЛЁЎ

ЕРМАЛОВІЧ — ГЭТА ЦІКАВА...

Рэжысер народнага тэатра-студыі "Валянцін" Магілёўскага гарадскога цэнтра культуры і адпачынку Валянцін Ермаловіч з'яўляецца асобай знакавай і каларытнай. Ён цікавы суразмоўца, нястомны і апантаны прапагандыст беларускай літаратуры, нацыянальнай культуры. Таму і не дзіўна, што на творчую сустрэчу са слынным Валянцінам Ермаловічам, якую арганізавала магілёўскае грамадскае аб'яднанне "Кола сяброў", прыйшло шмат жыхароў абласнога цэнтра.

Валянцін Іванавіч з бліскучым гумарам распавядаў пра свой багаты, адметны, а нярэдка і зусім непрадказальны жыццёвы ды творчы шлях. Дастаткова сказаць, што да сёння Валянцін Іванавіч у сваім целе носіць асколак ад фашысцкай міны, а ў вайну бацькі атрымалі на яго пахаванку. Але Ермаловіч выжыў. Выжыў, каб звязаць свой лёс назаўсёды і даастатку з тэатральнай творчасцю, матчыным словам.

Як выкладчык Магілёўскага культасветвучылішча В. Ермаловіч падрыхтаваў некалькі сотняў рэжысёраў для самадзейных тэатральных калектываў. Як рэжысёр самадзейных тэатральных калектываў у Магілёве, Краснаполлі, Бялынічах, зноў у Магілёве паставіў больш за сотню спектакляў і сыграў прыкладна столькі ж галоўных роляў у іх...

На гэтай сустрэчы пра Валянціна Іванавіча шмат цёплых і прачулых слоў сказалі вядомыя ў Магілёве людзі: кандыдаты гістарычных навук – дэпутат гарсавета Аляксандр Агееў, Ігар Пушкін, журналіст і грамадскі дзеяч Сяргей Шышкін.

Сам Ермаловіч у чарговы раз прадэманстраваў уласную творчую нястомнасць, па-майстэрску прачытаўшы патрыятычную лірыку Янкі Купалы, Якуба Коласа, Аляксея Пысіна, свайго старэйшага брата, вядомага беларускага пісьменніка і гісторыка Міколы Ермаловіча.

Завяршылася творчая сустрэча паказам урыўка са спектакля па неўміручай камедыі Кандрата Крапівы "Хто смяецца апошнім? " у выкананні акцёраў народнай тэатральнай студыі "Валянцін" Яраслава Клімуця, Ігара Пушкіна і Алега Дзячкова.

ЧАВУСЫ

СПРАВАЗДАЧА ЛІТАБ'ЯДНАННЯ

Літаратурнае аб'яднанне, што дзейнічае пры Чавускай раённай газеце "Іскра", з'яўляецца адным са старэйшых на Магілёўшчыне і, бадай, самым актыўным.

Мясцовыя пачынаючыя паэты і празаікі, што называецца, стараюцца падтрымліваць трывалую сувязь са сваімі чытачамі. І не толькі праз публікацыю ўласных твораў на старонках "раёнкі".

Днямі па ініцыятыве кіраўніка літаратурнага аб'яднання журналіста і паэта Міколы Салаўцова чавускія літаратары зрабілі творчую справаздачу перад жыхарамі райцэнтра.

У раённым Доме культуры, куды сабраліся шматлікія прыхільнікі творчасці мясцовых пісьменнікаў, як кажуць у такіх выпадках, не было куды ўпасці яблыку. Характэрна, што паслухаць творы сваіх землякоў завіталі і прадстаўнікі мясцовых уладных структур. Віталі чавускіх творцаў колішні сакратар Магілёўскага аддзялення Саюза беларускіх пісьменнікаў празаік Іван Аношкін, рэдактар бялыніцкай райгазеты Мікола Падабед і іншыя.

Добра, што акцыю літаб'яднання падтрымалі і самадзейныя калектывы мастацкай творчасці Чавускага раённага цэнтра культуры.

БЯЛЫНІЧЫ

ДНІ КУЛЬТУРЫ СЕЛЬСАВЕТАЎ

Не сакрэт, што культурнае жыццё ў вёсках перажывае сёння далёка не лепшыя часы свайго гістарычнага развіцця. Яно, па вялікім рахунку, калі не памерла зусім, то знаходзіцца на мяжы выжывання. Паўстае пытанне, як дапамагчы сённяшнім вяскоўцам не толькі зберагчы культурніцкія традыцыі ды набыткі папярэднікаў, але і заявіць пра сябе?

Цікавую форму вырашэння пастаўленай задачы, думаецца, знайшлі ў Бялыніцкім раёне. Пад патранажам аддзела культуры і пры падтрымцы райвыканкама тут пачалі праводзіць дні культуры сельсаветаў. Яны прайшлі ўжо ў Галоўчынскім, Лебядзянкаўскім і Цяхцінскім сельсаветах. На чарзе – Запольскі, Вішоўскі, Эсьмонскі, Машчаніцкі і Ланькаўскі.

Паказальна, што ініцыятыва "зверху" ўва многіх мясцовасцях знайшла шырокую падтрымку і "знізу". А падобнае, як вядома ўсім, здараецца не вельмі часта.

Міхась КАРПЕЧАНКА

ЗАПАВЕТ ПАКАЛЕННЯМ

У 1977 годзе Уладзімір Караткевіч выдаў на Украіне нарыс аб Беларусі "Зямля пад белымі крыламі". У ім, як адзначае ў прадмове да яго 2-га выдання ў нас (Мінск, "Народная асвета", 1992 г.) Васіль Быкаў, "Як сапраўдны патрыёт і інтэрнацыяналіст ён (У. Караткевіч. — **У. С.**) імкнуўся свае багатыя веды пра Бацькаўшчыну зрабіць здабыткам іншых нацыянальнасцей, найперш маючы на ўвазе нашых братоў-украінцаў".

І далей у той жа прадмове Васіля Быкава "Шчырае слова аб Радзіме" чытаем: "...Вартасць гэтай кніжкі не абмяжоўваецца толькі фактаграфіяй, якой бы займальнай і праўдзівай тая ні была. Тут, што не менш важна, кожная думка аўтара сагрэта яго гуманістычным пачуццём, шчырай любоўю да Радзімы і яе жыхароў. Тут — стрымана выказаны высакародны **запавет пакаленням** (падкрэслена мной. — **У. С.**), якія толькі ўваходзяць у жыццё і яшчэ ў яго ўвойдуць. Запавет любові і надзеі, спраўдзіць якія належыць вам, цяперашнім і будучым чытачам кнігі".

І так, яшчэ раз акцэнтую ўвагу, што з часу напісання і выдання ў сябе дома гэтага твора мінула шмат гадоў. І яго першыя юныя чытачы даўно ўжо сталі дарослымі, са сваім, сфармаваным пад уздзеяннем розных жыццёвых акалічнасцей светапоглядам. А запавет вялікага майстра роднага слова, у творы аб радзіме, у якім "многія гістарычныя і іншыя звесткі пра Беларусь пададзены (...) з вычарпальнай навуковай аб'ектыўнасцю, якой не ставала працам нашых афіцыйных гісторыкаў", калі ўдумацца, і сёння актуальны. Хаця на дзіва просты. Расказаўшы чытачу пра Беларусь, яе мінулае, той час, калі пісаўся нарыс, Уладзімір Сямёнавіч казаў: "Любіце гэтую сваю святую зямлю аддана і да канца. Іншай вам не дадзена, ды й непатрэбна".

Несумненна, чытачы старэйшага пакалення, асабліва пісьменнікі, здзівяцца такому майму падрабязнаму нагаміну. Маўляў, навошта Саламаху спатрэбіўся такі "лікбез" у адносінах да Уладзіміра Караткевіча і яго некалі знакамітага твора? Адкажу так: таму, што сёння некалі папулярны нарыс, як гэта ні прыкра, нікому са школьнікаў, у каго пытаў, невядомы. На жаль, не ведаюць яго і нямала хто з пачынаючых і маладых пісьменнікаў, не кажучы ўжо пра іншых людзей.

Зрэшты, за гэты час жыццёвыя рэаліі вельмі змяніліся, ды так, што не толькі названы твор вялікага майстра і яго запавет, а і многія сапраўды выдатныя творы нацыянальнай літаратуры, у якіх створаны непаўторны вобраз Айчыны, найперш з-за нашага глупства (у тым ліку асобных чыноўнікаў і пісьменнікаў), могуць наогул "выпасці" з жыцця, адукацыі.

А паступовае выцясненне літаратуры з адукацыі вядзе да духоўнай дэградацыі многіх нашых суайчыннікаў. Незалежна ад іх вялікіх ці маленькіх пасад, званняў і г.д. (Настаўнікі сцвярджаюць, што наспеў час каардынальным чынам дапрацаваць падручнікі па літаратуры, якія не адпавядаюць патрабаванням часу...)

Так думаў я нядаўна, перачытаўшы згаданы твор Уладзіміра Караткевіча, засродзіўшыся на ягоным запавеце. Думаў, адкінуўшы палітычныя аспекты "Зямлі пад белымі крыламі", проста разважаючы аб такім асяродку нашага існавання, як прырода. У творы пра яе нямала. І запавет, выказаны класікам, яе таксама тычыцца.

Думаў і так: з таго часу, калі Уладзімір Караткевіч у сваёй гэтай працы захапляўся тым, што "наша з вамі зямля, можна сказаць, сочыцца вадою", дык яе "крыніцы, азёры, вымачыны, балоты, рэчкі, рачулкі, магутныя рэкі і вялікія азёры" вельмі змяніліся. Але, на асабістай карце пісьменніка, як ён піша, — дзе "памечаны толькі рэкі даўжынёй за пяць кіламетраў" — "такіх рэк на Беларусі дзве тысячы дзевяцьсот". (Калі ж верыць Энцыклапедычнаму выданню "Блакітная кніга Беларусі" (1994 г.), то ў нас усяго "20,8 тыс. рэк, іх агульная даўжыня 90.6 тыс. км". Што да азёр, то гэта ж выданне сведчыць: іх "за 10 тыс.".

Мабыць, працуючы над нарысам найперш "не для Беларусі", Уладзімір Сямёнавіч саромеўся казаць тамашняму люду, як наша зямля спаганена і спаганьваецца намі. Змаўчаў аб тым, як мы самі з году ў год, з дня ў дзень засмечваем яе, як няшчадна знішчаем лясы, рэкі, азёры і ўсё іншае, чаму абавязаны сваім існаваннем.

Пісьменнік толькі нібы мімаходзь зазначыў, што часам у нас здараецца — глумяць іх. Сказы пра гэта (можа, патрабаванне тагачаснай рэдактуры? самацэнзура?..) пабудаваны наступным чынам. Калі, скажам, зазначаецца, што, як след "не працуюць" нашы вялікія рэкі, бо "чыгункі, аўтамабільныя дарогі, самалёты зрабілі так, што рэкі нібы замерлі", таму, што "ракою" нібыта стала "нявыгадна" вазіць", то гэта ўсё нішто іншае, як глупства. "Глупства, — сцвярджае Уладзімір Сямёнавіч, — ракой і дагэтуль найбольш выгадна везці не дужа спешны або грувасткі груз". І далей: "Але выгадна гэта толькі тады, калі за ракою сочаць, чысцяць яе, умацоўваюць берагі, не высякаюць лес па яе берагах, каб не мялела".

Вядома ж, калі б у выданні, па якім, цытую, быў цэнзар (а яго тут няма) то і ён, да гэтых радкоў прэтэнзіі не меў бы.

Так, Уладзімір Сямёнавіч, нястомны падарожнік па родным краі, вялікі знаўца прыроды. Ён яе абаронца (між іншым, сярод беларускіх пісьменнікаў такіх шмат, і аб гэтым гаворка асобная). Вядома ж, падарожнічаючы, Караткевіч бачыў і, як піша, скажам, "Блакітная кніга Беларусі", што сотні, калі не тысячы нашых рэк, маюць "рэчышча на ўсім працягу каналізаванае". Або там жа чытаю, што яно "У верхнім цячэнні (...) каналізавана", ці "Ад вытоку на працягу (столькі-та км) каналізаванае".

Вядома, класік не мог не ведаць, што як казаў мне аднойчы адзін старавер на Віцебшчыне вялікі аматар прыроды Іван Парфір'евіч: "Реки эти, — убиенные человеком".

Так, сёння ў нас рэк і азёраў, знішчаных чалавекам, незлічоная колькасць.

За сёлетняе лета, сталася так, аб'ехаў я з сябрамі шмат мясцін нашай зямлі. Палессе, Магілёўшчына, Віцебшчына, Міншчына, Гродзеншчына... І ўсюды, дзе шмат гадоў не быў або быў упершыню, — гнятлівае ўражвае, што — ні ў каго не прашу прабачэння: мы паварварску, па-дзікунску ставімся да прыроды.

Прырода наша ўвачавідкі змянілася літаральна за апошнія не тое што дзесяць, пяць, а год-два. І найперш "благодаря" "ўсеагульнай матарызацыі" насельніцтва краіны. А яно, "беднае": сёння — "только" кожная 3-я наша сям'я мае некалі дзесяцігоддзямі недаступныя ёй "колы".

Сапраўды, калі яшчэ дзесятак гадоў таму многія непаўторныя, нават не ўключаныя ў запаведныя і ахоўныя зоны мясціны рэспублікі былі або цяжка даступныя, або недаступныя з дазволу сказаць тым аматарам прыроды, паводзіны якіх, псіхалогія накіраваны толькі на адно — узяць, знішчыць, то сёння, здаецца, у Беларусі няма ніводнага куточка, дзе б не прабягала кола аўтамабіля, не ступала нага чалавека-знішчальніка.

Але прашу ў чытача прабачэння за такое, нібы не да месца адступленне. Вернемся да ўласна тэмы гаворкі... Дык вось, аб'ехаўшы шмат якія мясціны нашай зямлі, пабачыўшы і добрае і кепскае, хачу выказаць наступнае: зараз у нас склалася становішча, што толькі строгі, а то і жорсткі дзяржаўны кантроль за такім нашым нацыянальным багаццем, як прырода, захавае яе ад знішчэння. Стварэнне запаведных зон, нацыянальных паркаў, якім у апошні час дзяржава надае вялікае значэнне, цалкам апраўдана. Вядома, шмат дзе чуецца незадаволенасць: "Агарадзілі, а самі бяруць". Не бяруць: праедзьце, паглядзіце. Зберагаюць. І чаму нехта "яны?" Дзяржава. Мясцовыя ж жыхары тых зон маюць права займацца гаспадарчай дзейнасцю. Але і яе, для агульнай карысці, рэгуляваць трэба. Мяне, напрыклад, абурае, што нейкія людзі невядома, якім чынам (хаця вядома якім і з якой мэтай) шмат дзе займелі ў арэнду (лічы, папрыватызавалі) рэкі, азёры і іншыя прыродныя "аб'екты". Ды сапраўды, чаму наша агульнанацыянальнае багацце становіцца ўласнасцю асобных людзей або груповак, а ўсе астатнія жыхары рэспублікі не могуць прыйсці туды, каб адпачыць?

Праблема — архіважная. Тэма спецыяльных навуковых, юрыдычных і іншых даследаванняў.


ФОТА К. ДРОБАВА

Кажучы так, я не баюся гэтых вызначэнняў, бо бачыў (мабыць, як і кожны з нас), што застаецца на лузе, у лесе, на беразе рэчкі, возера пасля таго, як там некаторыя з нас адпачываюць. Засмечанасць прыроды становіцца сапраўдным бедствам. (Так і хочацца сказаць нацыянальным, хаця дакладней, шматнацыянальным — такая ж у нас краіна.)

Пра пажары, якія ўзнікаюць ад непатушаных кастроў і якія знішчаюць жывёльны (не аднавіць) і раслінны свет, і гаварыць залішне: вядома кожнаму. Але, не кожны з нас ведае, што, напрыклад, калі птушкі адкладаюць яйкі ці выводзяцца птушаняты, то дым ад кастроў прымушае іх пакідаць свае гнёзды. Дым для іх — сігнал бедства — з незапомных часоў склалася так.

Канечне, можна гаварыць аб іншых, як бы "дробязях" — бітым шкле, пласціку, цэлафане і г. д. і г. д., аб сметніцах вакол гарадоў і вёсак (тысячы такіх, як кажуць, "несанкционированных свалок"). Але ні ў каго няма права рабіць так, як, напрыклад, летам зрабіла адна тэлескрынка (інакш не скажу), — ілжыва абвінаваціць у гэтым ужо канкрэтна цэлую групу людзей. А лепш за ўсё, каб балюча было — беларускіх пісьменнікаў, зняўшы на кінакамеру сметніцу недзе далёка ад іх дачных участкаў, напісаўшы таблічку, маўляў, «свиньи». Ды падмацаваць знявагу публікацыяй у якой-небудзь газецёнцы," — вось якія яны...

Але абвінаваціць без падстаў, зыходзячы толькі з нейчай уласнай прыхамаці, з аднаго "желания — унизить" пісьменнікаў як носьбітаў сапраўднай духоўнасці — праз хлусню, выкарыстоўваючы СМІ, — прасцей простага. Хаця, аказваецца, што звалка тая зрэшты не пісьменніцкая. Ды і пісьменнікаў на знакамітай Лысай гары сёння не больш чым іншага рознага люду. У тым ліку і "чиновничьего".

Пісьменнікі ж, калі так, за чысціню роднай прыроды, за яе зберажэнне для будучых пакаленняў, для захавання таго вобліку Айчыны, які яна мае, зрабілі і робяць больш, чым вось такія журналісты. І не толькі таму, што амаль усе сто працэнтаў нашых літаратараў (апошнія 10—15 гадоў не бяру ва ўлік, іншая генерацыя творцаў), як кажуць, выйшлі з прыроды. Па сутнасці, усе паэты і празаікі нарадзіліся ў вёсцы, а хто калі і не ў вёсцы, дык мае адтуль карані ("Усе мы з хат", — крылаты і дакладны выраз Янкі Сіпакова да пісьменнікаў падыходзіць найбольш) і кроўна, так, менавіта кроўна звязаны з прыродай. Думаю, у даным выпадку знявага пісьменнікаў — гэта была спроба чарговага наступу бездухоўнасці на духоўнасць. Чамусьці таксама падазраю, што такая "самадзейнасць" некаторых "радетелей за Беларусь", асабліва з іншых, не нашых тэрыторый, сёння, калі ідуць размовы аб выпрацоўцы ідэалогіі краіны, неўзабаве накоціцца з чарговай новай хваляй. Думаю таксама, што і пасля нядаўняй сустрэчы кіраўніка краіны з прадстаўнікамі творчай інтэлігенцыі знойдуцца і "свае" сілы, якія паспрабуюць зганьбаваць апошніх... Дапускаю таксама, што будуць арганізаваны новыя кампаніі, накіраваныя на тое, каб "адсекчы" літаратуру ад надзённых клопатаў...

Шмат якія вадаёмы, здадзеныя ў арэнду, ужо страцілі свае рыбныя запасы.

(Вядома, ёсць і такія арандатары, якія па-гаспадарску ставяцца да справы, але іх, сцвярджаюць людзі дасведчаныя, адзінкі.)

Мала таго, што няшчадна нішчаць азёры і рэкі свае "хозяева", дык, аказваецца, нейкім чынам былі, "повадились" нас "осчастливить" і чужыя. Вось Казімір Камейша, цудоўны паэт (як кажуць, дзякуй бацькам і прыродзе), расказваў мне, як паехаў на любімае з дзяцінства адзінае сапраўднае возера ў сваім краі, у сваёй пушчы, якую апеў у многіх сваіх творах. І возера, і пушча натхнялі і натхняюць не толькі яго, паэта, але, да слова, і празаіка Генрыха Далідовіча (раманы апошняга на той прыродзе "замешаны", на жыцці тамашніх людзей). Дык вось, калі Камейша туды прыехаў, возера аказалася яму недаступным. Чаму? Ды нейкія з чужой краіны людзі гаспадарылі.

Паэт узбурыўся: "Ваша бацькаўшчына? Бацька — ляднік, што стварыў возера для ўсіх людзей: і сваіх, і гасцей". Слова нашага новыя "хозяева не поняли". А калі ўжо летам я спецыяльна вазіў на тое возера, у тую пушчу дзяцей (чужых таксама), каб паказаць, якую прыгажосць мае наша, мая, іх, юных, краіна са светлым імем Беларусь, то мясцовыя людзі казалі, што тыя "хозяева" возера "працадзілі" і "осчастливили" нас тым, што іх "след простыл". Але і па сёння каля возера стаяць шчыткі, што гаспадар яго нейкае "000" (з якой адказнасцю і перад кім?). Дык вось, калі мы туды прыехалі, "хозяин", нейкі п'яны, апухлы дзяцюк, прыглядаючыся да нумара маёй машыны, пры дзецях палохаў: "Глядзіце, вернецца мая жонка, будзе сварыцца, што вы тут". "Дзе?" — спытаў я. "На нашым возеры".

На жаль, часу дачакацца "хозяйки", прыродай падараванага нашаму народу возера, не было.

Канечне, вельмі добра, што дзяржава самым сур'ёзным чынам ставіцца да захавання нашых агульнанацыянальных багаццяў, у прыватнасці, той часткі прыроды, пра якую размова. Яшчэ лепш было б, калі б кожны з нас (незалежна ад пасад, званняў і г. д.) усвядоміў, што, як пісаў Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч, трэба "любіць сваю святую зямлю аддана і да канца". Што "іншай вам (нам. — **У. С.**) не дадзена, ды й непатрэбна".

Як усё проста сказаў класік, нібы іншаму, не нашаму чытачу. І як усё гэта звернута да нас. З вялікім, скажам без перабольшання, глабальным, лёсаносным сэнсам для ўсіх, хто жыве на нашай святой зямлі.

Уладзімір САЛАМАХА

МЕРКАВАННЕ

ГАЛОПАМ ПА... МОВАХ

Мова, як вядома, з'яўляецца галоўным сродкам зносін паміж людзьмі: камунікатыўным, інфармацыйным і гэтак далей. Зразумела, яна не можа знаходзіцца на адным і тым жа ўзроўні, а, нібы жывая істота, нараджаецца, развіваецца, сталее і часам сыходзіць у нябыт. Сведчанне таму – санскрыт, лацінская і многія іншыя, так званыя "мёртвыя" мовы. Дарэчы, людзі іх вывучаюць. Ні адзін урач не абыходзіцца без лаціны. Спецыялісты ў многіх галінах мастацтва, літаратуры, мовазнаўцы даследуюць, вывучаюць і перакладаюць багатую спадчыну, якую пакінулі нам даўнія, у чалавечым разуменні, цывілізацыі.

У сучасным свеце існуе шмат краін і яшчэ больш моў. Наша суверэнная Беларусь не з'яўляецца выключэннем і займае сваё асабістае месца ў сусветнай супольцы. Тое ж адносіцца і да нашай роднай мовы. Яна таксама прайшла доўгі шлях развіцця. На працягу стагоддзяў шмат чаго надаралася: з'яўлялася дзяржаўнай у Вялікім княстве Літоўскім, была ў загане ў польскай і расійскай улад, перажывала заняпады і росквіт.

Падобны шлях прайшлі і многія іншыя мовы. Узяць да прыкладу Вялікабрытанію. Шатландцы і валійцы ўвесь час змагаліся з англічанамі, адстойвалі свае самабытныя культуры і мовы. Валійцы нават аднаму са сваіх гарадоў далі назву, якая складаецца больш чым з пяцідзесяці літар. Прычым у сярэдзіне слова стаяць чатыры літары "л" запар. Усё дзеля таго, каб англічане не маглі яго вымавіць.

А што зараз у нас, на Беларусі? Як мы адносімся да сваёй роднай мовы? На вуліцы, у грамадскім транспарце (акрамя запісу абвестак прыпынкаў у метро) і крамах яе зрэдку пачуеш. Парадаваць вуха можа, і то не заўсёды, толькі радыёэфір па правадной сетцы. Асабліва абражае, калі госці радыёперадач прадстаўляюцца вядучым, як: наш беларускі пісьменнік, паэт і гэтак далей. Калі ён наш, то, зразумела, – беларускі, а не карэйскі ці чыйсьці яшчэ. Але ёсць і іншыя не вельмі прыемныя моманты, напрыклад, калі былі запрошаны "Беларускія песняры". Называючыся "беларускімі", яны размаўлялі толькі па-руску. Дарэчы, здзіўляўся не я адзіны, але і іншыя радыёслухачы. Нават было тэлефанаванне ў прамым эфіры ў студыю і абуральнае пытанне з гэтай нагоды. Гэта тычыцца і розных "беларускіх" драматургаў, спевакоў...

Калі няма дакладных ведаў і цяжка размаўляць па-беларуску – ніхто не патрабуе літаратурнай мовы, хай бы ўжо ўжывалі славутую трасянку. Амерыканцы і еўрапейцы, не заўсёды атрымаўшы выключныя веды па філалогіі, карыстаюцца мовамі як заўгодна, да месца і не зусім, але з гонарам і годнасцю. У адрозненні ад іх большасць нашых людзей (не ведаю, ад чаго гэта залежыць – ад нашага выхавання ці, увогуле, менталітэту) няёмка сябе адчуваюць ці саромяцца выказвацца, баючыся нарабіць у гутарцы памылак і быць няправільна зразумелымі (тычыцца ўсіх моў: роднай і замежных). Як ужо ўзгадвалася, хай бы мы ні саромеліся і напачатку спрабавалі размаўляць. З цягам часу ўсё нармалізуецца, было б толькі хаценне. Для гэтага зусім не патрэбна агулам закончваць філалагічныя факультэты універсітэтаў і інстытутаў (калі апошнія яшчэ засталіся). Некаторыя, я гэта дакладна ведаю, ні хочуць размаўляць на роднай мове, каб не быць "белай" варонай. Ім, хутчэй за ўсё, непрыемна лавіць на сабе касыя позіркі беларусаў, таму што, як ні парадаксальна, яны размаўляюць па-беларуску. Адчуванне такое, нібы яны выстаўлены ў клетцы ў якім-небудзь заапарку, быццам экзатычныя жыхары рэзервацый. Гучыць больш чым парадаксальна: чуць такое ў дачыненні да роднай мовы на радзіме.

А наконт Першага нацыянальнага тэлеканала і іншых беларускіх каналаў, то з'яўляецца такое пачуццё, што паміж імі ідзе нейкае (нават зараз не забытае) сацыялістычнае спаборніцтва. І той, хто менш за ўсіх будзе выкарыстоўваць родную мову, не ведаю: месяц, пяцігодку ці болей, – атрымае які-небудзь вымпел, узнагароду або ганаровую грамату. Афіцыйна ж было дадзена прыкладна такое тлумачэнне: што паміж беларускімі тэлеканаламі ідзе барацьба за гледача, за рэйтынг сваіх праграм, таму яны і скарацілі ўжыванне роднай мовы. Нават не турбуючыся пра таго ж гледача і не спытаўшыся ні ў кога. Ды і чаго пытацца, усё роўна адказ паўсюль аднолькавы: "Всё делается на благо народа!" Але што рабіць з мовай? Бо тут крышачку адшчыкнулі, там адкусілі кавалачак, у трэцім месцы зусім ад яе адмовіліся. Яшчэ крышку часу і "братэрскіх" рэформ – і будзем змушаны збіраць сваю мову, як дзіцячы канструктар "Лега". Таму і атрымліваецца жахлівы моўны вінегрэт: на тэлеканале АНТ, у "Наших новостях", напрыклад, рэпартаж з Гродна з нагоды 90-годдзя адзінага прыжыццёвага зборніка вершаў Максіма Багдановіча "Вянок" вёўся на беларускай мове (вядома ж не дыктарам), а надпіс унізе паруску "Венок". Хоць бы тыя, хто "Не вместо, а вместе", суадносілі адно да аднаго. А інакш атрымліваецца менавіта так, як спяваў В. Цой:

"Все говорят, что мы вместе.
Все говорят,
но не многие знают в каком".

Вось і яны, мабыць, не вырашылі, у якой краіне выходзяць у эфір. Тлумачыцца ўсё гэта будзе тым, што ў нас дзве дзяржаўныя мовы: беларуская і руская. Калі прыгледзецца ды прыслухацца, то ў выніку беларуская мова знаходзіцца не на другім і, на жаль, не на трэцім месцы, а ўвогуле няведама дзе.

Стваральнікі новага тэлеканала "ЛАД" абяцалі нам праграмы на роднай мове, што будзе адраджэнне беларускай культуры. А што на самай справе: нецікавыя перадачы, у якіх каторы раз пракручваюцца серыялы, якія ўжо і так скакалі з аднаго расійскага канала на другі, чарговая лацінаамерыканская "мыльная" опера (іх і так зашмат) і нават спорт. Можа, я не разумею і мне хто-небудзь растлумачыць – якое дачыненне, як нам абяцалі, да нашага культурнага жыцця і мастацтва мае дзённік тура чэмпіяната Італіі па футболу? Пра якасць каментара, гаворку можна і не весці.

Калі ў краіне адкрываецца беларускамоўная школа, то гэта так званае "дасягненне", "сенсацыйная" навіна гучыць па радыё, друкуецца ў перыядычных выданнях. А якія яшчэ школы могуць адкрывацца ў Беларусі? Ва ўсіх краінах (не мае розніцы Польшча то, ці Італія з далёкай Японіяй) усё цалкам наадварот – так проста павінна быць. Выхаванне, адукацыя, сродкі масавай інфармацыі, ды што там пералічваць, – паўсюдна ўжываецца родная мова.

Нам няма сябе з кім параўноўваць, усё не на нашу карысць. Народнае мастацтва, фальклор карыстаюцца большым попытам у Нідэрландах і Германіі, чым на радзіме. І гэта ў той час, калі творы на беларускай мове ўвайшлі ў сусветную літаратурную скарбонку.

Не трэба далёка хадзіць. У нашым штодзённым жыцці дастаткова толькі пільней прыглядацца на тыя ж шыльды. Ёсць такія, што і напружваць зрок няма патрэбы. Напрыклад, каля станцыі метро "Фрунзенская" знаходзіцца гаспадарчая крама, а над ёй надпіс вялікімі літарамі: "ТЭХНІКА У БЫТУ". Не будзем нават падлічваць, колькі тут памылак. Калі браць у маштабе Мінска, не кажучы ўжо пра ўсю краіну, то розных шыльд, назваў вуліц і прыпынкаў, рэкламы назбіраецца зашмат. Як казаў адзін мой сябар: усё гэта пісалі па-беларуску "палонныя" кітайцы. Акрамя таго вочы натыкаюцца на розныя брэнды, буцікі і надпісы на англійскай мове.

Так, жыццё не стаіць на месцы. Развіваюцца новыя тэхналогіі, з'яўляюцца адпаведныя тэрміны. Таксама развіваецца і мова, узбагачаецца словамі. Адна справа, калі яна ўзбагачаецца, і зусім іншая – калі засмечваецца рознымі запазычваннямі. (Я не маю на ўвазе інтэрнацыянальнай лексікі). Лепш за ўсё гэта адзначаеш, калі чуеш выступленні афіцыйных прадстаўнікоў. Яны не толькі не размаўляюць па-беларуску, але і ўжываюць мноства слоў з іншых моў, у большасці з англійскай. Часам з'яўляецца такое ўражанне, што чыноўнікі проста агучваюць завучаныя на памяць словазлучэнні і сказы, так неяк у іх усіх аднолькава атрымліваецца, а вось сэнсу не разумеюць. Самае цікавае – у беларускай мове ўжо ёсць адпаведныя словы, якія знаёмыя кожнаму і прасцей вымаўляюцца. Дык навошта ўводзіць імпартных "двайнікоў"? Дзеля моднай звычкі? Няма ніякай нагоды несціся нам галопам па мовах.

Людзі ствараюць нават штучныя мовы, якія існуюць і маюць сваіх прыхільнікаў. Але нам не трэба нічога вынаходзіць і тым больш захапляльна-пакорна зазіраць у "моўны" рот, як пісаў Джордж Оруэл, "вялікага брата". Адзінае ж, што патрабуецца ад нас, – гэта навучыцца карыстацца тым, што маем, што дадзена нам з дня нараджэння на гэтай зямлі. Вывучаць, ужываць і паважаць родную мову, а не здзекавацца з яе і ганьбіць. І не дай нам, Божа, каб надышоў той час, калі і яе далучаць да "мёртвых" моў. А вывучэннем і даследаваннем беларускай мовы будуць займацца толькі спецыялісты.

Віктар КАВАЛЁЎ

КУФАР-NEWS

НАШ АДКАЗ "ЛІТАРАТУРНЫМ НЕГРАМ"

Адгэтуль супрацоўнікі пошты могуць вам прынесці дадому не толькі газету ці часопіс, але і... кнігу. Такую паслугу прапанавала рэспубліканскае аб'яднанне "Белпошта", змясціўшы ў падпісным каталогу падпіску на нацыянальную кніжную серыю "Сад прыгод".

Заснавальнікам серыі выступіў пісьменнік-фантаст Міхаіл Дзеравянка, які лічыць, што паліцы айчынных кнігарань запоўніла літаратура, а дакладней, падробка пад яе, выкананая на хуткую руку "літаратурнымі неграмі". У новай серыі не будзе твораў, падпісаных псеўданімамі, за якія так любяць хавацца халтуршчыкі. Да таго ж, кошты на кнігі будуць такімі, каб іх маглі набыць усе жадаючыя, у тым ліку і зусім незаможныя. Першыя тры кнігі серыі выйдуць у першай палове гэтага года. Распачнецца "навінка" творам Анатоля Драздова "Ізумруд Люцыфера".

БЫЎ КОНКУРС...

У гэтым месяцы адбудзецца цырымонія ўручэння дыпломаў і ўзнагарод пераможцам IV конкурсу імя Ежы Гедройца.

Конкурс на лепшую журналісцкую работу ў беларускіх СМІ на тэму польска-беларускіх адносін у галіне культуры, навукі і мастацтва быў аб'яўлены Польскім Інстытутам у Мінску. Умовай для ўдзелу ў ім з'яўлялася прадстаўленне арыгіналаў ці копій надрукаваных у мінулым годзе артыкулаў, гука- і відэазапісаў перадач, прысвечаных дадзенай тэматыцы. Матэрыялы прымаліся да 30 снежня 2003-га. Наперадзе нас чакае новы конкурс?

У ЯРАСЛАЎЛІ ПАМЯТАЮЦЬ

Напрыканцы мінулага года ў расійскім горадзе Яраслаўлі ў мемарыяльным доме-музеі Максіма Багдановіча гучалі песні і вершы на беларускай мове. Свята прайшло з нагоды чарговага дня нараджэння класіка нашай літаратуры.

Як вядома, сям'я Багдановічаў пераехала ў Яраслаўль у 1908 годзе. У драўляным доме на былой Любімскай вуліцы, дзе зараз месціцца музей, яны пражылі два гады (астатні час пераязджалі з кватэры на кватэру). Старадаўні будынак захаваўся намаганнямі саміх гараджан, – згодна плана забудовы, яго павінны былі знесці... Дзякуючы рэканструкцыі былі аднаўленыя ўнутраныя памяшканні, фрагменты гасцёўні і пакоя маладога паэта, дзе былі напісаныя вядомыя ўсім нам вершы, што пазней склалі адзіны прыжыццёвы лірычны зборнік "Вянок". Рукапісы твораў, а таксама асабістыя рэчы Багдановіча тут можна пабачыць на свае вочы. Дарэчы, помнік Максіму (не горшы, чым у Мінску ля Опернага тэатра) стаіць ля ўваходу ў адзін з карпусоў Яраслаўскага універсітэта імя Дзямідава, раней тут была мужчынская гімназія, якую скончыў наш пясняр. Вядома, што ў гэтым горадзе паэт спазнаў і сваё каханне, – дачка купца Ганна Кукуева натхніла яго на напісанне шэрагу любоўных вершаў.

Зразумела, духоўнае станаўленне будучага класіка беларускай літаратуры адбывалася на яраслаўскай зямлі. Прыемна ўсведамляць, што мясцовыя жыхары ганарацца гэтым і шануюць памяць паэта. Да слова сказаць, музей насамрэч выконвае ролю цэнтра беларускай культуры. Яшчэ і таму, што тут рэгулярна збіраецца беларуская дыяспара – грамадскае аб'яднанне "Сяброўства".

СІБІРСКІЯ... БЕЛАРУСЫ

Нядаўна ў Новасібірску завяршыўся першы міжрэгіянальны фестываль беларускай культуры, які прайшоў у рамках Федэральнай праграмы "Культура Расіі 2001 – 2005".

Фінансавалі праект, у якім прынялі ўдзел прадстаўнікі беларускіх таварыстваў з усёй Новасібірскай вобласці, з гарадоў Цюмень і Томск, Міністэрства культуры РФ і мясцовыя ўлады. Сярод удзельнікаў былі і прафесіяналы, і пачаткоўцы. Па словах дырэктара Новасібірскага беларускага культурнага цэнтра Ніны Кабановай, мэтай фестывалю было сабраць людзей з розных куточкаў Сібіры, перазнаёміць іх і тым самым пашырыць творчыя гарызонты. Думаю, цікава даведацца, што, да прыкладу, у Цюменскай вобласці захаваліся цэлыя паселішчы, дзе пражываюць нашыя суайчыннікі, але да якіх можна дабрацца хіба што некалькі разоў на год, – калі таго дазваляюць поры года і надвор'е. Так што не дзіва, што менавіта ў такіх мястэчках і захавалася старадаўняя беларуская культура, народныя песні і мова. А вось яшчэ згадайма сібірскае паселішча Новаміхайлаўка, якое беларусы заснавалі аж у 1916 годзе. Наўрад ці мы можам сказаць, што зараз там жывуць адны толькі "чыстыя" беларусы, бо з часам нехта з'ехаў, нехта прыехаў і да т.п., але ж гучыць там спеўная мова з характэрным нашым акцэнтам. Дарэчы, дзякуючы фестывалю менавіта ў Новаміхайлаўцы адкрыўся філіял Новасібірскага беларускага культурнага цэнтра.

Рубрыку вядзе ВІКа

ПРЫПАДАЮЧЫ ДА ВЫТОКАЎ...

Сярод немалаважных фактараў, што сваім непасрэдным уздзеяннем абумоўліваюць сінкрэтызм многіх разнавіднасцей сучаснай гістарычнай прозы, трэба асабліва вылучыць характэрны для ўсёй літаратуры XX стагоддзя ўплыў на мастацтва слова паэтыкі вуснай народнай творчасці і ўласна міфа. Плённасць такой выразнай скіраванасці і міралюбнасці суіснавання выяўляецца ў абнаўленні зместу формы, актывізацыі эстэтычных пошукаў, значным пашырэнні прасторава-часавых межаў і спосабаў іх вымярэння, "ва ўскладненні сімволікі, імкненні да прытчы, сэнсавай шматпластавасці мастацкіх тэкстаў"

Аналізуючы ідэйна-эстэтычныя пошукі Алеся Наварыча ў малых празаічных формах і адзначаючы выразную самабытнасць творчай індывідуальнасці гэтага сучаснага пісьменніка, даследчык І.Штэйнер яшчэ колькі год таму ў артыкуле "Вяртанне наперад" здолеў прадказаць зварот свайго таленавітага земляка да буйной эпічнай формы, дзе, "як і ў жыцці, знойдзецца месца і для трагічнага, і смешнага, і фантасмагарычнага, і развагам пра каханне і філасофію бытавання, як чалавечага, так і братоў нашых меншых, дзе прагучаць як словы літаратурныя, так і паляшуцкія". І сапраўды, ужо праз досыць хуткі час А.Наварыч прадстаў перад чытачамі аўтарам адметнага найперш сваёй паэтыкай гістарычнага рамана "Літоўскі воўк" ("Маладосць". 2003. №№ 4 – 6).

У адрозненне ад многіх іншых узораў гістарычнага жанру твор празаіка, які і на гэты раз не адступіўся ад магчымасці прызнацца ў любові мове і прыродзе, звярына-птушынаму царству, Гарыні, усяму непаўторнаму палескаму паўднёва-заходняму краю. Звяртае на сябе ўвагу падкрэсленым адмаўленнем аўтара ад традыцыйнага тэматычна-храналагічнага прынцыпу падачы матэрыялу. Рэзка парушаючы звыклую паслядоўнасць асноўных этапаў сюжэта, пісьменнік выводзіць у пачатак рамана развязку. І гэта пры тым, што яна месціцца і ў фінале, яшчэ раз паўтараецца, завяршаючы дзеянне і ўжо канчаткова вырашаючы канфлікт твора. Незвычайнасць размяшчэння развязкі ўзмацняецца "пераапрананнем", падменай становішчаў герояў-звяроў і герояў-людзей, калі ваўкі разгульваюць на волі, а паны сядзяць у клетках, калі апошнія кусаюць першых і наадварот. Зрэшты, выдаючы за прычыны такіх метамарфоз персанажаў, з аднаго боку, здраду пэўнай часткі грамадства ідэалам 1863 – 1864 гг., з другога – смеласць, "да непрыстойнага", кагосьці размаўляць, выць патутэйшаму, А.Наварыч дапускае, што апісанае ім здарэнне з курортнага жыцця Друскенікаў магло быць і няпраўдай. Вядома ж, "па неспакойным часе хто толькі не коціць бочак на ваўкоў Польшчы, Літвы, іх мову і дурную звычку да волі. Уздумалі ад імперыі адарвацца. Будзе ім".

І такіх інтрыгуюча неверагодных момантаў вырашэння знешне лёгкапазнавальнай з прычыны частай прысутнасці і адноснай распрацаванасці ў вусна-паэтычных жанрах, умоўна-знакавай прасторы ўласна мастацкіх тэкстаў "ваўкалацкай" сюжэтнай лініі ў рамане пісьменніка шмат.

Бачыць сябе воўкам, начуючы на балоце з палешуком Цімохам, настаўнік Арыстоклій Дастоеўскі, ён жа, як потым высветліцца, – Артур Буевіч. У двух ваўкалакаў ператворацца на вачах героя яго нядаўнія рабаўнікі. Маленькім ваўчанём падабраны ў лесе і расце ў пакоях Ежы Урбановіча так і не прывучаны да няволі Інсургент, з неўтаймоўным паляўнічым азартам знішчаючы хатніх катоў і сабак. Апошніх прыгнечаная згасаннем і паразай паўстання маладая жонка аканома Аксана параўноўвае з панамі. Воўк для яе – "звыродак зямлі, істота ад зямлі, мужык, хлоп, селянін, які знішчае ўсё панскае, выкшталцонае, няздатнае для суворага жыцця". Для паэтычнага і веруючага Яся Кавальца Інсургент – адданы сябра і памочнік. Але ж менавіта дзякуючы воўку жандармы здолелі адшукаць у возе з саломай і гаршчкамі некалькі параненых паўстанцаў, у тым ліку і Артура Буевіча.

Думаецца, пагрозлівае суседства ў паводзінах і натуры Інсургента незалежнасці і адначасова выплёскванне сляпых інстынктаў шмат у чым нагадвае сілу і слабасць кожнага стыхійнага бунта з яго безразборлівай нянавісцю да ўсякага іншадумства і супрацьстаяння. Здаецца, якраз гэтую небяспечнасць моманту і мае на ўвазе сталага веку вясковец, спрабуючы астудзіць не па сітуацыі гарачага і шмат у чым безадказнага ў сваёй гульні ў рэвалюцыянера Стасіка Буевіча. Адстойваючы найпершую патрэбу мужыка ў зямлі і спакойнай, засвоенай ад дзядоў-прадзедаў, працы на ёй, стары даводзіць няўдаламу агітатару: "Воля для тых, хто ведае, нашто яму тая воля". Наўрад ці валодае гэтым высокім веданнем меншы з братоў-паўстанцаў, здольны хіба што паўтараць чужыя і гучныя лозунгі. Недарэмна якраз яго, гора-ваяку, і рэнегата Ежы Урбановіча пакусае аддадзены з Манкевіцкай аканоміі ў звярынец Друскенікаў Інсургент. Воўк бязлітасна помсціць тым, хто спачатку прыручыў яго, а потым пазбавіў волі, магчымасці існаваць сярод дарагіх прасторы і пахаў роднай зямлі. І каб дабіцца свайго, каб расправіцца са сваімі крыўдзіцелямі і здраднікамі краю, што працягваюць бяздумна балбатаць высокія словы пра патрыятызм і незалежнасць, ён гатовы прыкінуцца ручным і паслухмяным. А ўжо праз хвіліну звер па-свойму вырашае права кожнага з прадстаўнікоў жывога свету быць свабодным ад нараджэння.

Ёсць у тэксце рамана А.Наварыча яшчэ некалькі прыкладаў сімвалічнага выражэння вольнага і прыручанага духу праз вобразы акаляючага прыроднага свету. У прыватнасці, райскай птушкі з калекцыі старэйшага Бароўскага, якая толькі і чакала моманту, каб пакінуць клетку-вязніцу, і вучонага шчыгла, што здаваўся выключна разумным, але нават пры адкрытых дзвярцах не думае, не хоча пакідаць месца свайго палону, працягваючы аўтаматычна выконваць некалі засвоенае дзеянне.

Сімвалічны падтэкст заключаюць у сабе фінальныя старонкі рамана, на якіх апісваецца хуткі надыход зімы ў прыродзе і грамадстве, тое, што "лёд скаваў край, лёд няволі, лёд нядолі". Ежы Урбановіч, які больш за ўсё любіць спакой, парадак, лад ва ўсім, для якога "рэвалюцыя, бунт ёсць зменлівая форма хаосу, "глупства", не болей, гатовы прыручыць лебедзяў, высекшы на замерзлай сажалцы палонку і паставіўшы карыта з ежай. Для Аксаны, што ўжо вызвалілася ад ілюзій адносна высакароднасці, вальналюбства мужа і вымушана прызнаць няспраўджанасць мары аб незалежнасці Белай Русі, становішча закутага ільдом краю ўяўляецца вэрхалам хлестакоўшчыны. Для яе лебедзі – свабодныя і самаахвярныя птахі, якія за зерне ў кармушцы ніколі не здрадзяць уласнай пранізлівай трубнай песні, магчымасці шырока расправіць у палёце свае магутныя крылы. Якраз развітальны круг лебедзяў над вольнай ад ледзяной скутасці рухомай рачной стыхіяй поўніць сэрца гераіні верай у здзяйсненне выказанай Артурам даўняй і светлай мары пра тое, што "прыйдзе час, і ўсё адродзіцца".

Трэба зазначыць, што пры пераважнай іранічнасці пісьма аўтара, яго першапачатковай і наўмысна падкрэсленай засяроджанасці на інтымна-прыгодніцкай сюжэтнай лініі рамана, адчувальным пасмейванні над квасным патрыятызмам асобных герояў, іх умелай маніпуляцыяй дэмакратычнымі каранямі, як і над сентыментальнасцю, залішнім пафасам, пазнавальнасцю прыёмаў паэтыкі гістарычнага жанру ранейшых гадоў, пісьменнік не можа не прызнаць сапраўдную ўладу вызваленчай ідэі паўстання над духам і душамі акрыленых ёю змагароў. Так, няпростаму рашэнню бедняка Яся Кавальца прыняць паўстанне будзе папярэднічаць нечаканае адкрыццё сваёй мовы, нацыянальнай прыналежнасці. Прычынай адмовы ад царскай службы для капітана жандармерыі Фогеля стане каханне да збяднелай шляхцянкі Марысі Налёткі. Старэйшым з братоў Буевічаў кіруе жаданне "быць вольным у вольнай краіне".. А маўклівым "падданым Яе Вялікасці англійскай кароны" Кастусём Каліноўскім, што толькі тройчы ўласна выявіць прысутнасць у змесце рамана праз фразу "Вось што значыць радзімы кут", спрэчку з правакатаркай пані Валеўскай, напісанне свайго імя на піўной пене ў карчме, рухае нястрымная прага свабоды для ўсяго люду, гатоўнасць дзеля адзінай абранніцы Беларусі ісці на шыбеніцу.

Перадача празаікам самых розных ідэйных перакананняў, грамадскіх пазіцый поўняць зместава-стылёвую прастору рамана шматгалоссем, палемічным запалам, забяспечваюць надзённасць яго гучання. І адвечны сон пакоры, і не да канца здзейсненая з прычыны задушанасці мэта паўстання пры ўсёй плённасці яго зрухаў выглядаюць аднолькава змрочна, бо ўтрымліваюць у сабе смерць, рабства. Іх пагрозлівае і блізкае дыханне, затхласць спакою асабліва выразна адчуваюцца змешчаным у клетку Інсургентам, што не жадае мірыцца з няволяй. Такія паводзіны воўка ў іх трансфармацыі на свет людзей дазваляюць да лагічнага канца ўсвядоміць надзвычай празрыстую пры ўсёй яе фармальнай завуаляванасці ідэю твора. Дакладна: дбаючы пра выжыванне і самазахаванне, важна не забывацца культываваць у сабе пачуццё самадастатковасці. Адмаўляючы богаабранасць адных народаў і адстойваючы роўнасць сябе і іншых сярод усіх, не б'ючыся за шляхецтва, як сумна вядомыя Пратасавіцкія і да іх падобныя, жыць годна і паўнавартасна, каб не трэба было нікому з прабачэннем і прыніжанасцю другараднага бясконца даказваць, што "мы развіваемся ў еўрапейскім рэчышчы".

Пры гэтым відавочна, што пры напісанні рамана А.Наварыч не ставіць за мэту паглыбленую распрацоўку мастацкіх і гістарычных характараў, не імкнецца да стварэння ўзору псіхалагічнага ці інтэлектуальна-філасофскага жанраў, хоць асобныя праявы пералічаных разнавіднасцей буйной эпічнай формы ў структуры "Літоўскага воўка" таксама прысутнічаюць. У большай ступені аўтар рэпрэзентуе той адметны тып сюжэтна-падзейнай прозы на тэму мінулага, дзе разам з вышэй згаданымі фантастычна-прыгодніцкімі элементамі, шырока ўвасобленым прыёмам антрапамарфізму, шчымлівым лірызмам, культурна-этнаграфічнымі і падрабязнымі прыродазнаўчымі апісаннямі, якія ў іншых месцах могуць перарасці ў разгорнуты аповед, да прыкладу, па арніталогіі, вытрыманыя і абавязковыя для ўласна гістарычнага жанру некаторыя атрыбутыўныя характарыстыкі. У прыватнасці, канкрэтна-фактычная аснова твора, дакументалізм, прысутнасць у тэксце побач з мастацкімі персанажамі рэальных асоб.

Варта гаварыць і пра плённае выкарыстанне А.Наварычам самых розных прыёмаў паэтыкі постмадэрнісцкага пісьма. У іх ліку – шматверсійная падача матэрыялу, яго мантаж, калі аўтарам асвятляецца , а праз некаторы час аспрэчваецца толькі што шырока прадстаўлены варыянт пэўнай падзеі і тут жа даводзіцца новы з ранейшым шчырым запэўніваннем апавядальніка. Маўляў, ужо цяпер ён будзе абавязкова трымацца праўды, гаварыць "правільна", "як было насамрэч". Такой манерай выкладу матэрыялу пісьменнік нібы ставіць пад сумненне наступнае меркаванне Ю.Лотмана: "Думка мастака ёсць тэкст. А тэкст ствараецца аднаразова" [7, 331]. Але якраз арыгінальнае ўвасабленне задумы, адметная структурная арганізацыя і рухомасць тэксту дапамагаюць празаіку значна пашырыць і ўзмацніць актуальнасць гучання ідэйна-эстэтычнага зместу гістарычнага твора.

Пэўным чынам такі эфект дасягаецца праз перададзены ў форме шматлікіх парцэляцый і абрываў матыў пераемнасці пакаленняў. "Прыйдуць новыя, нашыя дзеці. Што забудзецца, а што – не. Шмат новай бяды наробіцца, але ж застануцца ў сваіх рэчышчах наша родная Прыпяць і ваш родны Дняпро, адкуль вы родам. Застануцца бары і лясы, застануцца хацінкі, фальваркі, маёнткі, і ў кожным – род, люд... Якога не перакруціць ні на польскі лад, ні на расейскі, маю на ўвазе маскоўскі манер... Чалавечую натуру як ні круці...". Не ў меншай ступені "асучаснівае" гістарычны кантэкст твора асэнсаванне пісьменнікам і яго героямі ўрокаў даўняй рэлігійнай і вызваленчай барацьбы, напалеонаўскай вайны, шматгадовага руска-каўказскага супрацьстаяння. Іх сэнсава-эмацыянальнае супадзенне з многімі падзеямі сённяшняй рэчаіснасці толькі ўзмацняе як агульначалавечы пафас рамана, так і неаспрэчнасць выкладзенага ў ім тэзіса аб самакаштоўнасці і неабходнасці самавызначэння беларусамі ў выбары свайго далейшага шляху.

Тым не менш апавядальнік не абыходзіць увагай незайздросныя, а то і зусім непрыглядныя моманты шляхецка-мужыцкага змагання з яго багатымі праявамі даносаў, баязлівасцю, здрадамі, частым адступніцтвам ад ранейшых перакананняў. Пісьменнік нікольні не ідэалізуе тых, хто збіраецца са скрынкай атрыманай з Англіі зброі выступаць супраць падрыхтаванага царскага войска, хто не ўяўляе памераў адказнасці за свой выбар і лёс падуладных людзей, хто хаваецца або не вытрымлівае наступу суровых выпрабаванняў, здраджвае сабе і нядаўнім аднадумцам. Але няцяжка прасачыць, як аўтарская іронія ці адкрыта выяўлены скепсіс у адносінах да такіх псеўдапатрыётаў у момант змяняецца падкрэсленай ідэалізацыяй, шчырым захапленнем, цёплай спагадай у стаўленні да тых герояў, што гатовы ў сваім максімалізме ісці да апошняга і, ахвяруючы жыццём, адчайна змагацца, аднолькава не прымаць як амаль неабыходлівае ў беларускай гісторыі рэнегацтва, так і дыктат чужой волі, улады.

Удумлівае ўглядванне сучаснага празаіка ў мінулае, учарашні дзень, пераасэнсаванне наноў усіх магчымых варыянтаў нацыянальнага шляху праз канкрэтныя факты, усведамленне вялікай – з прычыны высокага ачышчальна-крэатыўнага запалу – сілы падзей і іх урокаў пацвярджаюць слушнасць слоў В.Быкава: "Былое вышэй за жывое, яно ўжо непадуладнае нікому" [8, 430]. І сапраўды, у мінулым нічога не перайначыць, але і супрацьстаяць плыні таго жыватворнага ўздзеяння, што ўзнікае пры азнаямленні ці перачытванні яго асобных старонак, таксама нельга. Асабліва тады, калі яны ўвасобленыя ў абноўленай паэтычнай структуры, маюць арыгінальнае стылёвае вырашэнне. У такім выпадку творы акрэсленага жанру найбольш спрыяюць абуджэнню гістарычнай самасвядомасці сучаснікаў, пошукам і адкрыццю некалі не выкарыстаных магчымасцей нацыянальнага развіцця, яго заманлівых перспектыў.

Вольга ШЫНКАРЭНКА

АНКЕТА ШТОТЫДНЁВІКА "ЛіМ"

Шаноўныя чытачы, прамінуў яшчэ адзін год зямнога жыцця. Ніхто і нішто вакол нас не памаладзела, толькі вечнасць памудрэла на яшчэ адзін сівы волас...

Хочацца думаць, што і мы, беларусы, пэўным чынам спрычыніліся да той вечнай луні і светласці, *што ёсць там і наш* забел *і наша "*досадная седина*". Страціўшы мову, ці захавалі слова?.. І што за тым словам? Дума, жальба, дзея? Змірэнне, умацаванне, спадзеў?*

*Хацелася б падрахаваць ясельны ўзрост новага стагоддзя, паразважаць, параіцца... "*Ад нулявой адметы веку*" наноў праехаць сваім вузкім літарацкім* колам *па сваіх жа творчых* каляінах.

1. Ці з'явіліся, на вашу думку, на парозе трэцяга тысячагоддзя ў сучаснай беларускай літаратуры мастацкія творы (кніжкі, публікацыі, літаратурныя праекты), што сталіся не толькі новымі, але і *знакавымі*. Калі — так, то што гэтаму паспрыяла, калі — не, то што перашкодзіла?

2. Мужчынская і жаночая літаратура... Ці ёсць насамрэч падобнае творчае падзяленне? Што б вы маглі сказаць адносна жаночага і мужчынскага творчага мыслення і вычування, а таксама схільнасці да той ці іншай літаратуры мужчын і жанчын, як патэнцыяльных чытачоў?

3. Маральнасць у творчасці сучасных літаратараў, як яна вамі разумеецца? Наколькі сёння гэтае пытанне з'яўляецца актуальным і як яно ўплывае на чалавечую духоўнасць і нацыянальную культуру?

4. Што вам падабаецца ў штотыднёвіку "ЛіМ", што не? Якія рубрыкі і чые аўтарскія публікацыі вас цікавяць найбольш? Што вы самі прапанавалі б дзеля паляпшэння формы і зместу газеты?

Ці падпісваецеся вы на "ЛіМ" (набываеце ў шапіках) альбо — не (прычына)?

5. Якія крокі насустрач з абодвух бакоў могуць, на ваш погляд, паспрыяць збліжэнню пазіцый раз'яднаных літаратурных груповак дзеля захавання аслаблай нацыянальнай культурнай і духоўнай прасторы (мовы, літаратуры, мастацтва, традыцый) — беларускай дзяржаўнасці агулам?

Адказы на анкету (аб'ёмам не больш як 3 машынапісныя старонкі праз два інтэрвалы) рэдакцыя прымае да 15 лютага 2004 года. Да анкеты прыкладваюцца: фотакартка, кароткая біяграфічная даведка, адрас ды пашпартныя звесткі (у тым выпадку, калі рэдакцыя іх не мае). Запрашаем да ўдзелу ў анкеце, як сяброў розных літаратурных суполак, так і нашых няштатных аўтараў і чытачоў.

ВЕЧНАСЦЬ У ВОКНАХ ЗЯМЛІ

Чытаючы Фелікса Мысліцкага, адпачываеш душой. Гэта адбываецца найчасцей тады, калі сустракаеш лірычныя радкі настолькі чыстыя, быццам тая кропля дажджу, што з'явілася на лясной кветцы там, дзе не паспеў зрабіць сваю страшную справу Чарнобыль, і гэткія нерушавыя, як вада крыніцы, якая бруіцца на ўзлеску, жывячыся гаючымі сокамі зямлі. Ды так бывае не заўсёды. Узнікае і іншае адчуванне. Нават не адчуванне, а... Цяжка знайсці падыходзячыя словы, бо, пранікненне ў сэнс сказанага аўтарам, вымагае ад цябе напружанай працы. Той жа душы, а яшчэ свядомасці, бо ў галаве імкліва нараджаюцца асацыяцыі, як працяг тых, што знаходзяцца ў вершы, можна сказаць, на паверхні. Але абавязкова ёсць яшчэ і ўнутранае. Тое, што ў асобных выпадках куды значней, чым вытанчаная рыфма, метафарычна насычаны вобраз, па-філасофску напоўненая думка. Гэтае ўнутранае — уся паэтычная прастора, а яна складаецца са шмат якіх элементаў, а галоўнае — свежасці пачуцця, неардынарнасці мыслення.

Адметнасць ягонага таленту даўно заўважылі і належным чынам ацанілі такія паэтычныя мэтры, як Рыгор Барадулін і Ігар Шклярэўскі. Ухвальна паставіўся да творчых набыткаў Ф. Мысліцкага і галоўны рэдактар часопіса "Юность" Віктар Ліпатаў і як сведчанне таму, неаднаразовыя публікацыі гомельскага аўтара ў гэтым, некалі вельмі папулярным маскоўскім выданні. Не прайшоў незаўважаным Ф. Мысліцкі і для такіх вядомых маскоўскіх часопісаў, як "Наш современник", "Октябрь", "Форум" і іншых, чытачы якіх таксама паспелі ацаніць талент гэтага самабытнага паэта.

Цікава тое, што згаданыя часопісы маюць розны палітычны накірунак "чужых" не павінны б пускаць на свае старонкі. Адбываецца ж наадварот. Быццам спаборнічаюць між сабой, каму першаму з іх даць на сваіх старонках слова менавіта Ф. Мысліцкаму. І ўсё ж "Юность" у гэтым добрым творчым саперніцтве абагнала іншых, бо менавіта дзякуючы яе падтрымцы пабачыў свет ладны аднатомнік Ф. Мысліцкага "Біблейская полынь", змест якога склалі вершы і паэмы.

Сапраўднае ж свята паэзіі для кожнага, хто возьме гэты аднатомнік у рукі, пачнецца пасля знаёмства з творамі. Для многіх гэта будзе і сустрэча з ужо знаёмым, бо Ф. Мысліцкі з'яўляецца аўтарам некалькіх кніг і пад вокладку "Библейской полыни" трапілі і вершы, і паэмы з іх. Ёсць аднак і новае, тое, што пакуль вядома прыхільнікам ягонага таленту толькі па часопісных публікацыях.

Марна непакояцца крытыкі (дый самі некаторыя паэты), што час паэзіі мінуў. Канечне, сёння не сярэбраны век яе, але відавочна і іншае. Той, хто любіць гэты жанр літаратуры, усё адно не пакідае яго без увагі. Дый, не будзем забываць, сапраўдная паэзія — гэта ўсё ж штосьці элітарнае. Прыклад з сённяшняга дня. У Германіі кніга самага знакамітага паэта, як правіла, выходзіць накладам усяго 500 асобнікаў. А насельніцтва гэтай краіны ў шмат разоў большае за колькасць жыхароў Беларусі. Значыць, у гэтулькі разоў, па логіцы, павінен быць большым і тыраж кніг. Мы ж усё плачамся, а немцы... Немцы не плачуцца і выдаюць шмат паэтаў і розных. Ды гэта невялічкае адступленне...

Фелікс Мысліцкі не проста і не толькі паэт па прызванні, ён, — кажучы паруску, паэт "по своей сути". Паэзія для яго той рэальны стан душы. Як звычайны чалавек не можа без паветра і вады, так і Ф. Мысліцкі не ўяўляе жыцця без паэзіі. Дарэчы, наконт гэтага ў яго ёсць выдатнае чатырохрадкоўе:

Стихи мои, вы были до меня,
Вы старше этих звезд,
Я всё вчера на ветер променял
И вызвал вас из гнезд.

Гэта не проста паэтычная метафара. Гэта, у дачыненні Ф. Мысліцкага сама рэальнасць. І ён не становіцца ў позу, калі ставіць перад сабой падобную звышзадачу:

Трудись, но так,
что б пред тобой стояли
И, как Шекспира, слушали века.

Узнікла такая думка, безумоўна, з неабходнасці найлепшым чынам самарэалізавацца, з патрэбы не проста пісаць, а з усведамлення пісаць так, каб цябе і заўважылі, і належным чынам ацанілі, а, значыць, і паверылі табе, а паверыўшы, надалі ўпэўненасці.

Упэўненасць гэтая ў яго з'явілася не адразу.

Былі сумненні.

Былі развагі.

Наступалі моманты, калі ў роспачы хацелася апусціць рукі. Але ён не апускаў іх, а спяшаўся туды, дзе ўсё дыхала і дыхае паэзіяй.

У Маскве — гэта магчымасць сустракацца з вядомымі творцамі, акунацца ў жыватворную і жыццядайную паэтычную атмасферу.

У Падмаскоўі — наведванне знакамітага Перадзелкіна, дзе само паветра, здаецца, напоўнена дыханнем майстроў. Прыязджаў туды — і ачуньваў душою:

Униженный журналами Москвы,
Где часто нету неба и травы,
Я мчался в Переделкино, плаксив,
Ходил по пастернаковским следам,
И улыбался мыслям и словам,
Где образ мира высился, правдив.

На радзіме, у Гомелі — нязменна прысутнічала жаданне знаходзіць аднадумцаў, людзей блізкіх па духу, гэтаксама апантана ўлюбёных у паэзію. І пры першай жа магчымасці вырываўся (і вырываецца!) у стольны Мінск, дзе, як заўважыў, у рэдакцыях газет і часопісаў да яго пачалі ставіцца ўсё прыхільней.

Пошукі сябе — і зварот да Бога. Сёння ў многіх паэтаў, гэта, будзем шчырымі, звычайная даніна модзе. У Ф. Мысліцкага — душэўная і духоўная неабходнасць. "У стыхіі верша паэта шмат неба, неба як прыстанку Усявышняга. Да Тварца звернуты ўсе помыслы паэта" (Р. Барадулін). Але зварот гэты, за рэдкім выключэннем не напрамую, хоць Ф. Мысліцкі і не адмаўляе падобнай формы, а вынікае з прамоўленага, калі лірычны герой усведамляе неабходнасць такой лучнасці з Усявышнім. І тады робіцца лягчэй жыць. І не толькі жыць, а і кахаць.

Повстречаю ли снова глаза,
Что гуляли по звездам со мною,
Созову ли опять голоса
Тех, что стали до срока землею?

Есть места, где кругом Божество,
Где не ходит, а молится время.
Где небес и земли торжество
И согласие в мыслях со всеми.

Ну, а здесь чьи-то думы в ночи
Все следят отовсюду за мною...
Не спугни тишины, помолчи,
Покружи, попрощавшись с листвою.

Шлях да Бога ў лірычнага героя Ф. Мысліцкага быў няпростым, у рэшце рэшт, як і ў большасці з нас. І праходзіў ён праз пераадоленні таго выпадковага, што некалі лічылася агульным правілам:

Я память отсекал, блукал подчас
В морщинах века, где, сбиваясь гас,
Я шелеста боялся, и порой,
Дрожа, бежал от глаз чужих домой,
И, спрятавшись в грядущем
от людей,
Спокойствию учился у теней.

"Чарнобыльскія катаклізмы", прысвечаныя Міколу Мятліцкаму, з якіх узята, вышэй прыведзеная страфа, з шэрагу такіх твораў, у якіх у той ці іншай ступені закранаюцца праблемы, звязаныя з наступствамі, выкліканымі самай страшнай у гісторыі чалавецтва катастрофай. "Чарнобыльскія вершы Фелікса Мысліцкага ўрачыста святыя, раздумлівыя, гнеўныя і поўныя пакут памяці" (В. Ліпатаў). А яшчэ, дадам, што гэта — творы, у якіх набалелае аўтарам прапускаецца не толькі праз уласнае ўспрыманне. Апроч усяго, Ф. Мысліцкі глядзіць на тое, што здарылася, і вачыма самога народа — народа, для якога гэтая трагедыя стала і прачынаннем ад сну бесклапотнасці, бяспамяцтва, абыякавасці. А ў выніку, напісанае ім пра Чарнобыль, хоць апошнім часам і з'явілася нямала твораў, што закранаюць гэтую праблематыку, успрымаецца менавіта як сваё адметнае слова пра нашу агульную бяду. Паэт знаходзіць уласны падыход і ніколі не збіваецца на паўтор сказанага іншымі, хоць падобная небяспека і падсцерагала яго.

А яшчэ ў творах Ф. Мысліцкага ў рознай інтэрпрэтацыі прысутнічае паняцце вечнасці і ўспрымаецца яно чытачом, як аб'ёмны вобраз, напоўнены самім космасам. Гэта можа быць космас пачуццяў ці космас таго неабсяжнага, што не заўсёды паддаецца вытлумачэнню, і сведчыць аб бясконцасці жыцця.

У абодвух выпадках паэт дасягае той дасканаласці, калі вобразная напоўненасць радка ўражвае і сваёй першароднасцю, і глыбінёй думкі:

На лозе во вселенной
пылают плоды,
Немота наглоталась
тумана и света.

Ты зачем,
в мирозданье оставив следы,
Поманила меня и растаяла где-то?

Под поросшей луной
зеленей глухомань,
Распахнулась для дум
и ветров бесконечность,
Выходи из сознанья и музыкой стань!
Меж разлукой
и встречей отсутствует вечность.

У "Белай жа Русі" закладзены іншы сэнс, але і ў гэтым творы такая ж пафіласофску глыбокая напоўненасць радка, у выніку чаго, здавалася б, звычайны паэтычны малюнак, нясе ў сабе настолькі шмат, што здзіўляешся таму, як гэта Ф. Мысліцкі здолеў так па-свойму перадаць любоў да Радзімы, разумеючы, што празмерны пафас прытупляе светлыя помыслы:

Кончился дождь,
захлебнулась равнина.
Как акварельна за хатой картина!
Все, что молчит, шелохнуться боится,
Небо измерив, вдруг падает птица,
В окнах земли повторяется вечность,
Даже травинка улучшила вечность.

Цудоўна сказана: "В окнах земли повторяется вечность".

Фелікс Мысліцкі не сцвярджае гэта наўпрост.

Фелікс Мысліцкі піша так, што пра гэта нельга не помніць.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

ІМПРЭЗЫ

ВЫХОЎВАЮЦЬ ЮНЫХ ЭКОЛАГАЎ

Супрацоўнікі Дзятлаўскай раённай дзіцячай бібліятэкі, якой доўгі час загадвае Таццяна Барысавец, імкнуцца выхоўваць юных эколагаў, вучаць юнае пакаленне любіць родную прыроду, разумець узаемаадносіны чалавека і навакольнага асяроддзя.

Бібліятэка не раз выходзіла пераможцам абласных і рэспубліканскіх конкурсаў на лепшую пастаноўку экалагічнай адукацыі і інфармавання мясцовага насельніцтва. Так, летась калектыў быў узнагароджаны Ганаровай граматай Гродзенскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя. А па выніках рэспубліканскага конкурсу бібліятэка прэміравана каляровым тэлевізарам "Гарызонт".

Супрацоўнікі бібліятэкі Святлана Сербіна, Жана Пялецкая і Марына Лапушка афармілі экалагічны куток "Прырода яшчэ спадзяецца". Тут ёсць раздзелы: "Зямлянам — чыстую планету", "Свет ратуецца прыгажосцю", "Трывогі нашы і надзеі". Падабрана літаратура па асновах агульнай экалогіі, пра Нацыянальны парк "Белавежская пушча", пра таямніцы лясного царства і шмат пра што іншае.

Свае гутаркі з чытачамі супрацоўнікі бібліятэкі (часцей за ўсё іх праводзіць Таццяна Барысавец) будуюць на мясцовым, канкрэтным матэрыяле. А расказаць дзецям і іх бацькам ёсць пра што. Напрыклад, непадалёку ад Дзятлава знаходзіцца выдатны сучасны санаторый "Радон", нядаўна яму споўнілася дзесяць гадоў. Тут пабывалі прадстаўнікі Італіі, ЗША, Германіі, Ізраіля, Люксембурга і іншых краін. Дэталёвыя даследаванні беларускіх і замежных спецыялістаў паказалі, што дзятлаўскія радонавыя крыніцы па сваіх лекавых якасцях не саступаюць іншым, даўно вядомым, а па асобных параметрах пераўзыходзяць іх. Таму вельмі важна, — падкрэсліваюць бібліятэкары ў размовах, — берагчы і захоўваць гэтыя унікальныя дары роднай прыроды.

У бліжэйшы час юныя эколагі сустрэнуцца з вядомымі навукоўцамі-біёлагамі Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Янкі Купалы і іншых вышэйшых навучальных устаноў абласнога цэнтра.

Калектыў бібліятэкі працуе плённа і разнастайна. Прыемная вестка днямі прыйшла ў бібліятэку з Мінска. У намінацыі "За адраджэнне традыцый і падтрымку сямейнага чытання" рэспубліканскага конкурсу яе супрацоўнікі занялі другое месца ў краіне (дарэчы, першае месца ў гэтай намінацыі не прысуджалася).

На працягу 2002—2003 гадоў праходзіў рэспубліканскі конкурс-агляд "Бібліятэка — дзецям. Бібліятэка — для дзяцей". Праводзіўся ён з мэтай актывізацыі работы ў рамках рэспубліканскай праграмы "Жыццю патрабуецца міласэрнасць". Па выніках конкурсу-агляду калектыў Дзятлаўскай раённай дзіцячай бібліятэкі адзначаны дыпломам II ступені і грашовай прэміяй.

Іосіф ЗАЯЦ

АНОНС

"ЗЬНІЧ" У СТУДЗЕНІ

Чатыры спектаклі ў першы месяц новага года паказвае Беларускі паэтычны тэатр аднаго акцёра "Зьніч" на сталічнай сцэне (у касцёле св.Сымона і св.Алены).

"У краіне светлай..." , музычна-паэтычны монаспектакль паводле творчасці М.Багдановіча ў выкананні Вячаслава Статкевіча з удзелам гітарыста Сяргея Сарокіна ды "Не праклінай, што я люблю" Н.Гілевіча, паэтычны монаспектакль у выкананні Міколы Лявончыка — гэтыя імпрэзы адкрывалі афішу года. Што далей?

20 студзеня — А.Вярцінскі, "Любіць".У гэтым паэтычным монаспектаклі выступае актрыса Галіна Дзягілева, мастацкі кіраўнік тэатра.

22 — "Віленскія мроі", паводле ўспамінаў Ю.Вітан-Дубейкаўскай і вершаў Н.Артымовіч. Выканаўца — Галіна Дзягілева.

Пачынаюцца ўсе спектаклі а 19-й гадзіне. У іх раскладзе могуць адбыцца змены, таму раім карыстацца тэлефонамі для даведак: 220-56-32, 231-75-53, 231-36-91.

ПАЭЗІЯ

Генадзь АЎЛАСЕНКА

ЯК ХУТКА ЛЕТА ЦЁПЛАЕ ПРАЙШЛО

(Рандэлі)

* * *

І восені здараецца спазніцца.
Які кастрычнік! Чэрвень на двары!
Але рабіна чырванню гарыць
І адышлі кудысьці навальніцы...

У лесе пераспелыя брусніцы
Ад соку ажно свецяцца знутры...
І восені здараецца спазніцца.
Які кастрычнік! Чэрвень на двары!

Ды час бяжыць,
не можа прыпыніцца,
І, пэўна ж, не ілгуць календары...
Аб той далёкай чэрвеньскай пары
Мне ноччу зноўку
светлы сон прысніцца...
І восені здараецца спазніцца.

* * *

Гады, як крыж, трымаю на плячы,
Ну а ўспаміны ўсе ў душу ссыпаю...
Там поўна ўжо!
Там месца не хапае!
І не знайсці патрэбных,
хоць крычы!

Яны прыходзяць потым, уначы,
І моўчкі, сумна ложак абступаюць.
Гады, як крыж, трымаю на плячы,
Ну а ўспаміны ўсе ў душу ссыпаю.

Мне гэты крыж да скону валачы!
Мая душа... Яна зусім сляпая!
Іду, усім дарогу саступаю,
Іду, усім хачу дапамагчы...
Гады, як крыж, трымаю на плячы.

* * *

Жыццё пражыць —
не поле перайсці...
Па полі ж не хадзіце без патрэбы!
А поле ўвосень
вас аддзячыць хлебам.
Без хлеба, як пакрочыш па жыцці!

І я па полі не магу прайсці,
Бо ў ім душа! Яно —
не проста глеба!
Жыццё пражыць —
не поле перайсці...
Па полі ж не хадзіце без патрэбы!

На ім зярнятам трэба прарасці,
Карэньчыкі пусціць, убачыць неба!
Стаю але ж ісці ўсё роўна трэба.
Свой шлях шукаю —
не магу знайсці!
Жыццё пражыць —
не поле перайсці.

* * *

І ў сне самотна паміраць,
Хоць ты не адчуваеш гэта!
Туза казырным б'юць валетам
І свечы чорныя гараць!

Нібыта плугам узараць
Палетак жытні сярод лета...
І ў сне самотна паміраць,
Хоць ты не адчуваеш гэта!

Нам лёс, на жаль, не выбіраць...
Мільгне сталёвы бляск
стылета —
І ўжо, між тым і гэтым светам,
Ты будзеш ціха паўтараць:
— І ў сне самотна паміраць...

* * *

Як хутка лета цёплае прайшло!
Самотны клён галінкамі матляе,
І толькі вецер па палях гуляе,
А ўсё жывое ціснецца ў жытло.

Ад месяца падманнае святло,
Яно не грэе, толькі асвятляе...
— Як хутка лета
цёплае прайшло! —
Самотны клён галінкамі матляе.

А лета... Ці даўно яно было?
Мароз на небе зорачкі люляе,
І снег са мной
аб чымсьці размаўляе,
Ён пад нагой рыпіць,
нібыта шкло...
Як хутка лета цёплае прайшло!

Вадзім КОРАНЬ



Корань Вадзім нарадзіўся ў Мінску ў 1983 г. Скончыў СШ № 54. Цяпер — студэнт IV курса філфака БДПУ імя Максіма Танка. Друкаваўся ў часопісах "Крыніца" і "Маладосць". У "ЛіМе" друкуецца ўпершыню.

* * *

Далёкім ліхтарыкам
Месяц жаўцее.
Хлопчык крылы шукае —
У вырай збіраецца...
Не плач зязюляй.
Вернецца ён летам наступным —
Рамонкам пад акном тваім
Вырасце.

* * *

Першы снег.
Белы-белы.
Не згвалтаваны
Падэшвамі ботаў,
Коламі "Мерседэсаў" і "Фордаў".
Быццам сон,
Што сніўся ў дзяцінстве...
У вясковым
Дзяцінстве
Далёкім,
Пад жоўтым
Сланечнікам
Сонца...

* * *

Ніхто не цверазее,
Злізваючы расу
З вуснаў каханай,
Чытаючы вершы ёй,
Напісаныя на падваконні ночы
Ў чаканні чарнобыльскага сонца.

* * *

Калі мы разам,
Можна гуляць у вайну,
Можна маляваць на сабе рамонкі,
Залізваць языком
Раны на вуснах,
Бо паміраць яшчэ рана.
Спаць немагчыма.
За цішынёю — цішыня.
За хлуснёю — хлусня.
Праз шчыліны ў шпалерах
Бачу
Іншую цемру:
Я не мог раней
Намаляваць яе
Самотнай.

* * *

Пад сталом гулялі ў каханне:
Мяняліся сэрцамі,
Вырэзваючы іх лязом
Мінулых спадзяванняў.
Нарадзілася думка мёртвая.
У кіпцюрах начных жахаў
Вар'ят перамог мудраца.
Назаўсёды.
Твая.
Прыгажосць.

* * *

Языкам яшчаркі,
Пацалункамі змяі
Шукаць цябе,
Няпэўны
Чорны
Вобраз.
У святле
Апошняй цыгарэты
Я не паспеў
Твой твар
Убачыць...

Я
Цябе
Кахаю...

* * *

Не зразумець.
Не адчуць.
Пальцамі не прачытаць:
Апошнім
Вугельчыкам
На табе малюю
Іерогліф.
Памяць.

* * *

Вецер кліча
Цябе з сабою,
Сонца цалуе цябе
Праменнем.
А я прырос да зямлі:
"Застанься са мною,
Маё
Каханне..."

* * *

У п'яных паэмах памерлых паэтаў
Адзінота,
Сабраная з кропель
Восеньскага дажджу.
Тваё адзенне з павуціны
Стала
Срэбраным...
Князёўна,
Прыйшла твая восень.

ШЧАСЦЯ ТАБЕ, БАБЫЛЬ...

АПАВЯДАННЕ

Валянціна КАДЗЕТАВА

Дзень добры, Ніна!

Уяўляю тваё здзіўленне: як гэта такі "вялікі аматар эпісталярнага жанру" раптам наважыўся напісаць табе?

А ўсё наша сумна вядомая правінцыйная тэлефонная сувязь. Разоў мо дзесяць рабіў спробу дазваніцца. Спачатку без асаблівага задавальнення — хоць чутнасць у тэлефоннай трубцы была выдатная — паслухаў некалькі фрагментаў з перадач нашага роднага радыё. Потым бясколерны жаночы голас доўга запэўніваў мяне, быццам нумара, які я набраў, "не существует". У наступны ж раз пашэнціла натрапіць на размову дзвюх сябровак, што дзяліліся вопытам пра тое, як найлаўчэй падманваць сваіх "лапухоў". Каюся, не ўстрымаўся, улез: "А як жа Бог, дзяўчаткі? Ён жа ўсё бачыць і чуе!"

Не ведаю, як Бог, але я пачуў у адказ такое!.. Тым і скончыліся мае тэлефонныя пакуты.

А цяпер пра галоўнае. У гэтым годзе раней, чым у мінулым, пачаўся грыбны сезон. Падкрэсліваю: ужо пачаў-ся! Таму раю кідаць свае цацкі-лялькі і як найхутчэй збірацца, бо неўзабаве пачнецца нашэсце гомельцаў і тады...

Пра нашыя вясковыя навіны пісаць не хочацца. Выміраем паціху. У асноўным, ад "купленай", як ты яе называеш, хваробы. Маці кажа, што хутка "ўжадобку" будзе ўбачыць цвярозы не тое што мужчынскі, але і жаночы твар. Грошай у калгасе па-ранейшаму няма. Замест іх раз на паўтара-два месяцы выдаюць "натуру": кілаграмаў колькі мукі, грэчкі, пляшку-другую алею.

Пра свой прыезд тэлефануй, калі, вядома, удасца. Калі ж не, то прыязджай без папярэджання. Толькі, калі ласка, не давай тэлеграмы. У маці ад аднаго гэтага слова палатнее твар і пачынаюць трымцець рукі. Сама ведаеш, віншавальная тэлеграма ў вёсцы — вялікая рэдкасць, часцей за ўсё тэлеграма тут азначае адно: няшчасце.

Ну вось і ўсё. З заўтрашняга дня іду ў адпачынак і чакаю цябе.

Да хуткай сустрэчы.

P.S. Сплёў для цябе новы кошык з лазы, што нарэзаў ля твайго сада.

"Бабыль" — гэта Уладзік, сын стрыечнай сястры маёй маці. Такіх, як ён, зацятых халасцякоў у Ліпках набярэцца ўжо з два дзесяткі, а гэтае самае "бабыль" чамусьці прыляпілася толькі да яго, хоць і жыве ён не адзін, як тое кажуць сапраўднаму бабылю, а разам з маці. Уладзік "бабыля" за абразу не лічыць, нават сам сябе іншым разам так называе. Я неаднойчы перасцерагала яго: маўляў, трэба акуратней ставіцца да слова, бо можна напрарочыць сабе, але ён толькі пасмейваўся:

— Ат, даўно ўжо ўсё напрарочана! Ну, бабыль я, ну і што? Хіба мы, бабылі, не людзі? Няўжо без так званага сямейнага шчасця жыццё губляе сэнс? Ты зірні, якая прыгажосць наўкола! Чуеш, як пахне падвялае кляновае лісце? І заўваж: яна, прырода, да ўсіх зычлівая: да злых і добрых, да хворых і здаровых, да прыгожых і не вельмі прыгожых. А галоўнае, яна няздатная да подласці і здрады, як... Ды што тут гаварыць, ты сама ўсё разумееш!

Так, я, як ніхто, разумела Уладзіка. Разумела больш, чым яму таго хацелася, і, насуперак ягоным спробам запэўніць мяне — а найбольш сябе! — быццам ТОЕ яго ўжо ніколечкі не хвалюе, ведала: яму яшчэ не перастаў балець далёкі жнівеньскі дзень, калі Міша Марук на бліскучай сваёй "бээмвэшцы" павёз у "сапраўднае жыццё" Веру Цімашкову.

Міша Марук быў з "новых". Вера Цімашкова лічылася Уладзікавай нявестаю. Да іхняга вяселля заставалася два тыдні...

Цётка Арына спадзявалася, што з часам міне ў сына крыўда на "паскудніцу Верку", супакоіцца Уладзік і абавязкова знойдзе сваю "долю". Спадзявалася год, два... сем. Уладзік нібыта ўжо і супакоіўся, але спробы шукаць тую самую "долю" не рабіў. Прыязджаў з Гомеля, дзе працаваў майстрам на "Сельмашы", і калі не было пільнай справы па гаспадарцы, абкладаўся кніжкамі і сядзеў да позняй ночы. А ў выхадныя — у лес ці на рыбалку. І ўсё адзін ды адзін. А ў гэтую восень, як і ў дзве мінулыя, у яго лясных вандраваннях зноў будзе спадарожніца-я.

Тэлефанаваць я не стала. Вырашыла ехаць на наступны ж дзень, бо адчувала: вось-вось на мяккіх да брыдкасці лапках зноў падкрадзецца да мяне ЯНО: нядобрае, бязлітаснае, са з'едлівымі, балючымі словамі: "Ну і хто, і што ты цяпер? Як пачуваеш на брудным цацачным базары, калі па-сабачы зазірнеш у твар кожнаму, хто хоць на імгненне зачэпіцца вокам за тваіх нязграбных зайцоў-вавёрак, і няпэўным голасам (не прызвычаілася, ды і не прызвычаішся ніколі да звання гандляркі!) скуліш: "Купіце, зусім жа танна аддаю! Купіце!" Цьфу!"

Я пачну апраўдвацца, але... Сапраўды, хто я цяпер і навошта? Чаму і як сталася, што ўсё, чым жыла, даражыла, чаму маліцца, раптам стала чужым, далёкім і непатрэбным? Засталося толькі пакутлівае стаянне на базары з уласнаручна пашытымі са штучнага футра цацкамі ды чакання ранняй восеньскай пары, што выблісне сваім яркім развітальным убраннем, уладарна пакліча мяне ў дарогу, і я, паклаўшы ў партманет свой сціплы "цацачны" прыбытак, абы-як пакідаю ў вялікую сумку неабходнае, сяду ў дызель, прыліпну да акна і пачну адлічваць гадзіны, імгненні да жаданай сустрэчы... з кім і з чым? З асірацелай бацькоўскай хатаю? З аскалёпкамі свайго дзяцінства? А можа, і яшчэ з нечым, што хаваю нават ад самой сябе? Не ведаю, ведаю толькі, што трэба ехаць, каб хоць на нейкі час пазбавіцца гэтага жорсткага "хто ты?", крышачку адпачыць душою і... не бачыць па-вераснёўску святочных твараў (былых ужо) калег-настаўнікаў.

*

— Маці! Ніна прыехала! — Уладзік выбягае насустрач, хапае мяне ў абдымкі і разам з сумкаю амаль уносіць у двор. Цётка Арына пазірае на мяне болей стрымана:

— Заходзь, заходзь, Ніна, а то ён ужо вочы прагледзеў.

У цётчыным голасе мне чуецца прыхаваная рэўнасць і яшчэ штосьці не вельмі прыязнае. Я разумею: ва Уладзікавым жыцці жаданых для цёткі Прыны змен па-ранейшаму не прадбачыцца і чамусьці з палёгкаю ўздыхаю.

Уладзік ні хвіліны не сядзіць на месцы: прыносіць свежай вады з "самай смачнай вясковай студні", гатуе свой знакаміты чай з васьмі траў і з бляскам у вялікіх блакітна-шэрых вачах гаворыць, гаворыць, гаворыць...

— Ведаеш, Нінуля, я прыгледзеў новае месца. Далекавата, праўда, затое гарадскія туды яшчэ не дапялі. Заўтра трэба ўстаць рана-рана, каб мы першыя...

— Ды супакойся ты, трамана! — сярдуе цётка Арына. — Дай чалавеку адпачыць з дарогі ды пад'есці. Зусім ужо чакануўся на сваіх грыбах ды ягадах. Дык хай бы ўжо сам іх еў, а то назбірае, нагатуе, а потым амаль усё параздае чужым людзям: "А мне цікава глядзець, як яны радуюцца!" Дурань, што тут іншае скажаш! Мне тых грыбоў колькі трэба? Ну, Анютка крыху сабе возьме. Я ўжо казала, каб прадаваць у Гомель вазіў. Дык злуецца ж!

Цётка падае на стол варану бульбу, яечню з салам, агуркі, памідоры.

— Ніна, ты сёння, можа, у нас пераначуеш? — пытаецца Уладзік. — Не? Я там, у тваёй хаце прыбраў крыху і дроў у грубку наклаў. Можа, золка будзе, дык запаліш. Я забягу ранічкаю і матанём у Воленку.

— Схадзіў бы ты ў магазін, — збіраючы посуд, просіць цётка Арына Уладзіка, — хлеба б купіў ды цукру. І алею няма ўжо.

Уладзік падазрона пазірае на маці, з хвіліну вагаецца, але цётка Арына падае яму торбачку і лёгенька падштурхоўвае да дзвярэй:

— Ну ідзі, бо хутка зачыніцца.

Счакаўшы, пакуль бразне засаўка на фортцы, яна прысядае на канапу:

— Ніна, гэта ж я знарок яго выправіла з дому, бо не дасць пагаварыць. Во, зірні, што ён вырабляе!

Яна згінаецца, лезе пад металічны ложак і выцягвае адтуль драўляную скрыню з вечкам.

— Схаваў, думае, я такая ўжо дурная, не знайду. Знайшла. І зноў спалю. — Цётка Арына выкідае на падлогу нейкія лахманы. — Падзівіся на гэтыя строі.

Я бяру ў рукі вылінялыя, груба залатаныя ў некалькіх месцах штаны, пакамечаную, няпэўнага колеру сарочку, аблезлы блін, што быў некалі картузом Уладзікавага бацькі і запытальна гляджу на цётку Арыну.

— Гэта ж такія "касцюмы" Уладзік апранае, калі Анюта прыводзіць у госці каго-небудзь са сваіх сябровак. Ты ж зразумей, Ніна, яна ж пра яго клапоціцца. Думае, можа, хто-небудзь глянецца яму. Можа, у рэшце рэшт надумаецца сям'ю зладзіць. Я пакуль жывая, але ж здароўя нямашака ўжо даглядаць яго. А як памру, тады што? Застанецца адзін у хаце, брудам зарасце, ды яшчэ і сап'ецца, не дай Бог. Вунь іх колькі паўмірала ўжо такіх, як ён, калі без матак засталіся. Анюта перажывае: адзін брат і то не як у людзей. Тыдні два таму прыехала з ёй жанчынка, ладная такая, медсястрой робіць. Дык ён яшчэ здаля ўбачыў, што Анюта зноў не адна, і — бягом у хату. Усцягнуў на сябе вось такое рыззё, вапасы ўскудлачыў, твар скрывіў, хоць дзяцей пужай, і выйшаў насустрач. А як за стол селі, дык ён чвякаць пачаў, сёрбаць, анекдоты брыдкія расказваць. Тая маладзічка паглядзела-паглядзела і не прыехала больш. Я ўжо і прасіла яго, каб не рабіў так, і сварылася. Лахманы тыя спаліла. А ён мне: "Няма чаго зводнічаць! А ўбор я сабе яшчэ больш "файны" знайду. На гарышчы ў нас такога дабра — процьма. І вось, бачыш, знайшоў. Падрыхтаваўся! Можа б, ты пагаварыла з ім? Ён жа паважае цябе. Можа, паслухаецца. Во, вяртаецца ўжо!

Цётка спешна саўганула скрыню пад ложак і зрабіла выгляд, што працягвае даўно пачатую размову:

— Можа, і п'ець так страшна, што на добрае ўжо не спадзяецца. Хто ў Гомелі працаваў, паскарачалі многіх. Уладзіка, праўда, дзякуй Богу, пакуль скарачаць не збіраюцца. І яшчэ адна навала — зусім маладыя на сухоты хварэюць... Гора ды і ўсё.

Пасядзеўшы яшчэ крыху, я скіравалася да сваёй хаты. Яшчэ здаля заўважыла, што нехта паздымаў шыфер з даху над верандаю. Падышла бліжэй, і рукі міжволі сціснуліся ў кулакі. Сад... Самы вялікі на ўсю вёску сад, што так рупліва некалі даглядаў мой бацька, быў амаль увесь разгароджаны, а пад запатым ранетам, любімай яблыняю нябожчыка, таты, прыкаваны ланцугом да металічнага стрыжня пасвіўся здаравенны конь. Тут жа брындала з паўдзесятка коз і бруднае лычастае свінчо. На месцы калонкі ўбіты заімшэлы драўляны клін. Дзе ж я цяпер буду браць ваду? Ад маёй вулачкі да бліжэйшага калодзежа больш за паўкіламетра...

Адчыніла дзверы ў хату, а там — чарговы "сюрпрыз". Ну каму спатрэбіліся старыя лазовыя крэслы і дапатопная канапа? Хто паздзіраў з вокнаў просценькія фіранкі? Вось табе і "як справы, Ніначка? У госцейкі ў хату сваю завітала? Добрага здароўечка табе, Ніначка!" А сад? Кожнаму, хто жадаў, мой бацька ўласнаручна пасадзіў сад. Тым, каму сваёй садавіны мала было, гаварыў: "Прыходзьце, бярыце, колькі каму трэба. Навошта ж дабру прападаць?"

Прыходзілі, бралі. І мяшкамі, і вазамі нават. "Ой, дзякуй табе, Ягоравіч! Век цябе добрым словам успамінаць будзем! І дзеці нашы, і ўнукі!"

Стук у шыбу перапыніў мае невясёлыя думкі. Уладзік...

— Ніна, можна, я ў цябе пераначую?

— А што здарылася?

— Ды зноў Анюта нейкую мадаму прывалакла. Я прылягу на канапе.

— Ну, на канапе табе, відаць, не ўдасца.

— Чаму? Мо зламалася? Дык я зараз...

— Каб жа зламалася! Сышла некуды. Ды і яшчэ сёетое з сабою прыхапіла. — сумна жартую я.

Уладзік глядзіць на святлейшы ад астатняе падлогі чатырохвугольнік:

— Ну вось жа, нягоднікі. Тры дні таму заходзіў — была канапа. І крэслы былі. А іконы? Ніна, абразоў жа таксама няма! Ну, каб злавіў паскудніка, рукі паадрываў бы! Свае ж, здаецца, людзі!

Дзве просценькія, зусім танныя матчыны іконы... Я і падумаць не магла, што ў некага падымецца рука, каб зняць іх з кута. Павінна ж быць у чалавечай душы калі не вера, то страх нейкі, ці сумленне. Дык як жа гэта? Я плачу, а Уладзік, як можа, суцяшае мяне:

— Ну хопіць, Ніна, хопіць. Я абавязкова дазнаюся, якая жывёліна тут палазіла. Ну, перастань, калі ласка! Кладзіся спаць. Кінь мне якое-небудзь прасцірадла. Я на падлозе пасплю.

Абы-як зладзіўшы пасцелю з таго, што знайшлося ў хаце, Уладзік хутка заснуў, а я яшчэ доўга ляжала з расплюшчанымі вачыма.

*

— Ніна, вось ты настаўніца мовы, няхай сабе і былая, але ж настаўніца. Дык скажы мне, недасведчанаму: хто, калі і з якой нагоды даў такую непрываблівую назву гэтай чароўнай восеньскай пары? — Уладзік пераклаў з адной рукі ў другую ёмісты кошык, поўненькі крамяных баравічкоў, раўніва зазірнуў ў маю пляцёнку, дзе грыбоў было ці не ўдвая меней, і голас яго крыху памякчэў. — Няўжо нельга было прыдумаць што-небудзь больш паэтычнае? Ну няхай сабе лета, хоць якое ўжо тут лета, але чаму — бабіна? Чаму, напрыклад, не бурштынавае? Бурштынавае! Хіба дрэнна гучыць? А то — бабіна! — Уладзік грэбліва скрывіў вусны. — Ды ад гэтага слова анучамі тхне!

— Ты, браток, нагадваеш мне аднаго тургенеўскага героя. Ух, як ён ненавідзеў жанчын! Толькі ж ведаеш, чым для яго ўсё скончылася? Ён закахаўся, ажаніўся і стаў звычайным падкаблучнікам у сваёй немаладой, непрыгожай і да таго ж не вельмі разумнай жонкі. Як кажуць, з чаго пасмяяўся, таму і паслужыў!

Уладзік чмыхнуў:

— Ну, гэта, даражэнькая, ужо ніяк не пра мяне! Папершае, нянавісць — занадта моцнае пачуццё, каб удастойваць ім жанчыну, па-другое... няўжо ты яшчэ верыш у казку пра каханне? Няўжо твае два замуствы цябе нічаму не навучылі?

Нешта, відаць, зрабілася з маім тварам, бо Уладзік амаль шыбануў пад куст нядаўна так ашчаджаны кошык з прыгажунамі-чорнагаловікамі і асцярожна крануў мяне за плячо:

— Прабач, Ніна, калі ласка. Пень я прыдарожны і "дзяроўня". Давай прысядзем, адпачнём. Вось тут, сярод верасу. Кажуць, з яго некалі варылі цудоўны напой. Цяпер жа ў нас вараць хіба што "сівуху"... Не крыўдуй, калі ласка.

— Ды што ты ўсхадзіўся? — знарок грубавата перапыніла я яго. — І ніколькі ты мяне не пакрыўдзіў. Што ёсць, тое ёсць. І настаўніца былая. І жонка таксама былая.

(Заканчэнне на стар.15)

ДУШОЮ — З БЕЛАРУССЮ

Даўно адгрымела вайна. Але яе трагічнае водгулле і дасёння шчымлівым болем адгукаецца ў многіх чалавечых душах. Незарубцаваныя знакі яе бачацца ў лёсе мастака Валеры Дзівіскібы.

Ягоную будучую маму вывезлі на прымусовую працу ў Нямеччыну, дзе ў 1943 годзе і з'явіўся ён, немаўлятка, на Божы свет. Пасля вайны маці вярнулася з сынам у Новую Мільчу, колішнюю вёску, якая цяпер ужо зраслася з Гомелем. Тут Валера скончыў школу. Потым служыў на баявым караблі, а пасля дэмабілізацыі працаваў матросам-матарыстам гандлёвага флоту з прыпіскай у Рыжскім порце.

Паступіў вучыцца ў Латвійскую акадэмію мастацтваў на аддзяленне графікі. Скончыўшы вучобу, зноў некалькі гадоў плаваў, а з 1979 г. перайшоў на творчую працу. Найбольш выявіў сябе ў тэхніцы акварэлі і ў жанрах пейзажа, нацюрморта, партрэта. Удзельнічаў у шматлікіх рэспубліканскіх (латвійскіх) і ўсесаюзных выстаўках. І ў некалькіх беларускіх, прысвечаных вызначальным падзеям і асобам нашай мінуўшчыны.

Голас Валеры арганічна ўплятаўся ў хор пад назвай "мастацтва беларускага замежжа" — цікавай, хаця і маладаследаванай старонкі нашай нацыянальнай культуры.

Ды вось ён, лёс: з набыццём незалежнасці ў Латвію пачалі вяртацца тыя, хто ў свой час па розных прычынах быў пазбаўлены грамадзянскіх правоў. Сярод іх і сын былога эсэсаўца, які прад'явіў, як нашчадак колішняга ўладальніка, дакументы на сваё "законнае" спадкаемства — дамок, што на не менш законнай падставе быў выдзелены мастаку і яго сям'і гарадскімі савецкімі ўладамі Юрмалы...

Такое жыццё з усімі яго нечаканасцямі, паваротамі і зігзагамі, якія, на жаль, вельмі часта спараджаюць людскія драмы, трагедыі і балюча адгукаюцца ў дацклівых сэрцах. Ад гэтага нікуды не дзенешся. І трэба жыць! Нават, па магчымасці, выпраменьваць з душы святло — а ім шчодра напоена творчасць мастака.

Нядаўна Валеру Дзівіскібу споўнілася 60. З гэтай нагоды па маёй ініцыятыве і актыўным спрыянні старшыні Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі Ніны Івановай збіралася ў сталічным Доме дружбы выніковая выстава мастака. Ды, на жаль, не адбылася. Скрушна, але свае 60 Валеру давялося сустракаць у шпіталі. Такое здараецца не упершыню. Апошнім часам усё трывожней адгукаецца перажытае. Не проста жыць з перанесеным інфарктам (а гэта заўсёдны боль у сэрцы), і цукровым дыябетам...

І ўсё ж спадзяюся і веру, што і гэтым разам Валера выйдзе з лякарні падмацаваны духам і целам. Бо ён па натуры — калі шукаць літаратурныя паралелі, — наш своеасаблівы Кала Бруньён.

Хочацца найперш пажадаць Валеру хутчэй адужаць нямогласць і прыехаць у Мінск на адкрыццё юбілейнай выставы, якая ў нас, мяркую, станецца на агульным фоне нацыянальнага мастацтва адкрыццём своеасаблівага і адметнага творцы. Хай шчасціць!

Яўген ЛЕЦКА

НА ЗДЫМКАХ: В. ДЗІВІСКІБА і яго работа — партрэт Ф. СКАРЫНЫ.

«МЯНЕ НАСЫЧАЕ РАДЗІМА...»

Дзейнасць кампазітара, прафесара Беларускай акадэміі музыкі, кіраўніка ансамбля "Ведрыца" Генадзя Ермачэнкава ўражвае сваёй шматграннасцю. Ён вядзе педагагічную працу, кіруе мастацкім калектывам і выязджае з ім на гастролі. А галоўным у сваім жыцці на сённяшні дзень лічыць кампазітарскую справу.

Творчасць Генадзя Ермачэнкава сведчыць пра яго высокую любоў да Радзімы. Гэта мелодыі, пранізаныя беларускімі інтанацыямі, гэта зварот да беларускай паэзіі, да самабытных народных інструментаў.

— Генадзь Аляксандравіч, назвы многіх вашых твораў звязаныя з гісторыяй Беларусі, з яе мінулым. Чаму менавіта гісторыя?

— На Беларусі столькі прыгожых мясцін, што ёсць жаданне выказацца ў музыцы пра ўсе. "Сказ аб зямлі Палескай" для сімфанічнага аркестра, паэма для актэта духавых інструментаў "Нясвіж", "Палескі перазвон" для валторны і фартэпіяна, музычная фрэска "Сабор Святой Сафіі" для цымбалаў, — на гэтыя творы мяне натхніла родная зямля. Захапленню яе гісторыяй паспрыяла таксама знаёмства з творчасцю У. Караткевіча. Перачытаў яго паэзію і прозу, і гэта мяне падштурхнула да напісання новых твораў.

Дарэчы, я вельмі люблю паэзію. Калі я пазнаёміўся менавіта з беларускай паэзіяй, мяне ўразіла глыбіня, меладычнасць, шырыня і распеўнасць твораў М. Багдановіча, У. Караткевіча, М. Башлакова, Л. Пранчака. Напісаў канцэрт "Споведзь" на вершы У. Караткевіча, кантату "Вяртанне да Радзімы" на словы Л. Пранчака, харавы цыкл "У краіне светлай" на вершы М. Багдановіча, навеяныя думкамі пра беларускую зямлю. А кантата "Радзіма надзей і трывог" на словы М. Башлыкова напісана ў памяць аб чарнобыльскай трагедыі. Бо я, як беларус, не мог не выказаць свае адносіны да гэтага страшнага здарэння. І я выказаў свой жах і боль праз музыку.

— Шмат вашых твораў напісана для беларускіх народных інструментаў. Што яны для вас азначаюць?

— Можна сказаць, што выйшаў я з народнай музыкі, бо скончыў кансерваторыю па класе домры. Затым вучыўся ў асістэнтуры-стажыроўцы па класе дырыжыравання народным аркестрам. І ўжо калі быў дацэнтам кансерваторыі (цяпер Акадэмія музыкі) я атрымаў дыплом кампазітара. Для народных інструментаў я не магу не пісаць. Дзякуючы кампазітарскай адукацыі, пішу не простыя апрацоўкі народных мелодый, а творы з развітай драматургіяй, з разуменнем спецыфічных рысаў народных інструментаў, з адчуваннем прыроды інструмента. І лічу, што народна-інструментальная музыка — гэта унікальная магчымасць раскрыць душу музыканта, бо, па сутнасці, усё мы выйшлі з народа. Толькі спазнаўшы народныя інструменты, мы робімся цэласнымі асобамі ў сваёй творчасці.

Маю ўвагу яны прыцягнулі сваім гучаннем, тэмбрам. Народныя інструменты — гэта багацце, створанае нібы самой прыродай. Беларускія цымбалы адрозніваюцца нейкай тэмбравай срабрыстасцю, чысцінёй, звоннасцю, гулкасцю, што вядзе ў неабсяжныя прасторы роднай Беларусі, і гэта захапляе мяне. Цымбалы — своеасаблівы тэатр музыкі, які можа ўвасобіць усялякія адценні нашых пачуццяў. І гэтая палітра інструмента не мае ніякіх абмежаванняў. Яшчэ адзін народны інструмент, які ўжываюць беларусы, гэта домра. Яна перадае маладосць прыроды. Трэмала домры — чароўнае трапятанне, надзвычайнае хваляванне, як першая зеляніна, як пралескі, што распускаюцца вясной. Балалайка мае пяшчотны, і матавы, мяккі, і сакавіты, звонкі тэмбр. Дарэчы, ва ўсіх народных інструментах схавана вялікае багацце, якое мы павінны цаніць і берагчы.

— Больш 20 гадоў як вы кіруеце ансамблем народных інструментаў "Ведрыца". Ці дапамагае вам гэта ствараць музыку?

— Магчыма, думкі наконт стварэння музыкі прыйшлі да мяне менавіта падчас працы ў ансамблі. Арыгінальных твораў у рэпертуары амаль не было, а склад ансамбля шмат чаго мог выказаць. Таму я, яшчэ да атрымання прафесійнай кампазітарскай адукацыі, пачаў пісаць музыку для свайго калектыву, каб выказаць менавіта ўласныя думкі, пачуцці. Мой ансамбль — гэта мая майстэрня, дзе я рэалізую задуманае, эксперыментую з новымі музычнымі фарбамі, знаходжу заспакаенне і зараджаюся для творчасці. У кампазіцыю я прыйшоў з дырыжыравання. І ў гэтым нейкі імпульс да творчасці. Бо дырыжор разумее прыроду аркестра знутры, ён ужо ведае, як трэба пісаць. Выкладаючы дырыжыраванне кожны дзень, дакранаешся да выдатных класічных твораў. Гэта эмацыянальна ўзбагачае, пашырае кола пачуццяў, бо з кожным годам адзін і той жа твор адкрываеш з новых бакоў, яго па-новаму чуеш. І калі сам пачаў пісаць, то ў мяне ўжо была добрая аснова — я чуў кожны голас у партытуры.

ЛІЧБЕ НАЎЗДАГОН

Закруглілася "Круглая лічба". Бо час для яе прыйшоў: закругляцца! Закругляцца ды саступаць прастору іншым. "Іншыя" — гэта ж хто ці што? Экспанаты, аб'екты, героі. Фантазіі, алюзіі, вобразы. Усе складнікі ды ўсе вытворныя чарговай мастацкай экспазіцыі, якая прыйшла ў галерэю Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта на змену "Круглай лічбе".

Аднак, заўважце, ніхто не кінуў наўздагон: "Бывай, закруглёная!" Наадварот, як і ў дзень прэзентацыі, арт-грамада, згуртаваная вакол гэтага нешараговага эпізода жыцця сталічных галерэй, — як і ва ўрачысты час адкрыцця, спявала: "Няхай жыве круглая лічба!"

І яшчэ заўважце: лічба — не дата. Вядома, унікальны выставачны праект пад назвай "Круглая лічба" інспіравалі менавіта пэўныя каляндарныя даты. Але, думаю, вы наўрад ці ўспрымалі б іх як даты круглыя: 121-годдзе Пабла Пікасо ды 242-годдзе класіка японскага жывапісу Кацусікі Хакусая, 96-годдзе з часу заснавання кубізму і першага публічнага паказу знакавых "Авіньёнскіх дзевак" П.Пікасо і столькі ж гадоў з дня нараджэння знакавай гістарычнай персоны Л.Брэжнева. А вось гарэзлівы і востры позірк на самі лічбы, безумоўна ж, прыкмеціць і круглявасць абрысаў, і загадкавую сіметрыю, і гульню знакаў, — усё тое, што нагадвае пра нумаралогію і настройвае на ігру мастацкага ўяўлення...

Кругабег (ці КРУГЛАбег?), кругазварот (ці КРУГЛАзварот?) падзей, гэтых невыпадковых выпадковасцяў у жыцці будзённым і ў жыцці мастацкім, выявіўся праз хэпенінгавую эстэтыку, праз постмадэрнісцкія прыёмы, далікатна скарыстаныя чыннікамі "Круглай лічбы" — удзельнікамі творчай суполкі "Басталія і сябры". Пэўна, таму можна было гадзінамі блукаць-кружляць па зусім не круглай выставачнай зале, круг за кругам адкрываючы для сябе штосьці нечаканае, адначасова прамінаючы нейкія, магчыма, важныя, але так і не ўгледжаныя аб'екты, дэталі, візуальныя метафары...

Крутануўшы элементарны механічны прыбор (дарэчы, круглы!), злучаны з цэнтральнай інсталяцыяй, можна было адчуць, як варочаецца кола часу, як спрацоўвае рухавік ідэй, а генератар энергіі распаўсюджвае наўкола флюіды маладосці. Менавіта памаладзелай адчула сябе гераіня выстаўкі, 96-гадовая Ганна Фабрыстава, ганараваная букетам з 96-ці хрызантэмаў, маці аднаго з мастакоў: ёй выпаў гонар першай дакрануцца да магічнай "завадзілкі", парушыўшы сон сваіх адналетак на карціне, напісанай у перайманне Пікасо і разгайданай на стрункіх лонжах-тросах. Абярнулася круглая лічба 96, "закруглілася" да 69...

А зрэшты, лічбы, даты, узрост — усё гэта ўмоўна, адносна, неадэкватна: хіба вы не заўважалі, што апантаны мастацтвам талент зазвычай абыякавы да нумарацыі гадоў свайго жыцця, што сустрэчы і стасункі даравітых творчых асоб здараюцца нібы па-за зямным часам? Размова вядзецца "па душах". А душа — па-за ўзростам: вечная. Вось і паяднала "Круглая лічба" таленавітых продкаў і спадкаемцаў. І такіх вонкава розных сучаснікаў, пераважна мастакоў-рэстаўратараў, манументалістаў, жывапісцаў. (Прынамсі, у складзе "Басталіі" — Алег Хадыка, Фёдар Сарока, Мікола Залатуха, Ігар Кныш, Іван Мядзведзеў, Андрэй Радзіёнаў, Алена Ахрамовіч, Андрэй Кальга, Алена Емяльянава, Уладзімір Ракіцкі).

У прасторы галерэі суседнічалі — на пару "Авіньёнскім дзеўкам" — дасціпныя "Пружанскія хлопцы" А.Кальгі ды У. Ракіцкага. Менская конка і праз яе ўраз пазбаўленыя працы, разгубленыя балаголы на старых вулках — серыя графічных аркушаў, размешчаная на вокнах, якая нібы "скругліла" куты ў вялікім выставачным пакоі. Неакласічны, працяты своеадметнай сямейнай міфалогіяй, "Дом у галандскім стылі", створаны І.Кнышам для заможных мінчукоў. Імпрэсія А.Радзіёнава: фактурыстае радно з іерогліфамі Хакусая, з крымскімі імартэлямі, выпетранымі паўднёвым ветрам, ды роднай бела-

А для дырыжора сёння вельмі важна тэмбравая якасць гуку. Тэмбравы каларыт трэба чуць і адчуваць, бо ўспрымаць толькі вышыню гуку — мала. Характар гуказдабывання, кожны штрых — гэта не проста знак у нотах, а дакладны сэнс, які праясняе змест твора. Калі дырыжор не мае тэмбравага слыху, дык лепей яму не падыходзіць да пульта. Перш, чым узмахнуць рукой, стаўшы за дырыжорскі пульт, я праектую гучанне, фарміруючы ўнутранае ўяўленне пра гожасць гуку. Толькі характар музыкі мае сэнс і, на сённяшняй ступені развіцця выканальніцтва, чысціня павінна быць перш за ўсё тэмбравая.

Добра адчуваючы тэмбры інструментаў, я ведаю, як напісаная мною музыка будзе гучаць, якому інструменту яе аддаць. Калі я знайшоў нейкае меладычнае зерне, то адразу чую яго тэмбравую афарбоўку. Тэмбравы слых дапамагае мне дакладней перадаваць на ўласнай кампазіцыі найтанчэйшыя адценні пачуццяў.

— Генадзь Аляксандравіч, ваша дзейнасць здзіўляе сваёй насычанасцю. Адкуль бяруцца сілы?

— Мяне насычае Радзіма — роднае Палессе, адкуль мой род. Кожны творца, мастак, кампазітар, на маю думку, павінен вяртацца да сваіх вытокаў, бо жывіць, надае сілы, моц тая зямля, дзе ты нарадзіўся, дзе былі твае продкі. Радзіма — гэта крыніца, з якой ты жывішся ўсё жыццё. Доўгія расстанні з бацькаўшчынай адмоўна адбіваюцца на творчасці. Калі я доўгі час не прыязджаю дадому, мяне ахоплівае шчымлівая туга і праца не ладзіцца. Мой родны край крыху сумны, пакрыты нейкімі мінорнымі фарбамі. Гэта ніцыя вербы, якія скланяюцца над Дняпром, мурожныя лугі, досвіткі, змярканні, лясы, бязмежныя далячыні, азёры, прыгажэй за якія нідзе болей не бачыў. Кожны мастак, успрымаючы прыгажосць роднага краю, на нейкім этапе пачынае стварацъ нешта новае. Так здарылася і са мной. І я вельмі ўдзячны Радзіме за тое, што яна мяне падтрымлівае ўсё маё жыццё.

— Я дзякую вам за размову і жадаю, каб ваша крыніца натхнення была невычэрпнай і беларуская зямля надавала сілы для новых здзяйсненняў.

Ірына ТОЛКАЧ

рускай дзеразой. Уражлівая панарама старасвецкага палявання — роспіс М.Залатухі, навеяны П.Учэлам ды "Песняй пра Зубра" М.Гусоўскага. Хрэстаматыйныя матывы Дзюрэра, Джарджоне, Вермеера Дэльфцкага і ... Сайферціса. І яшчэ — 96-гадовы (!) кабінетны раяль: за ім вяла рэй гаспадыня галерэі ЕГУ Таццяна Бембель, якая старанна "выстуквала" мелодыю, акампануючы мастакоўскаму хору: "Няхай жыве круглая лічба!"

Няхай жыве "Круглая лічба", якая, безумоўна, пакінула яркі адбітак і ў эмацыйнай памяці наведнікаў галерэі, і на досыць шырокім ды стракатым палатне выставачнага жыцця нашай сталіцы...

С.БЕРАСЦЕНЬ

НА ЗДЫМКАХ: Г. Фабрыстава "заводзіць"; фрагмент роспісу М. Залатухі.

СТАКГОЛЬМ 1899

Маргарэта САРЫ

Кастрычнік. З дрэў падае жоўтае лісце. Нейкія халаднаватыя вятры з паўднёвага ўсходу залятаюць паміж дамамі, але на адкрытых плошчах нахабна дзьме паўночны вецер.

Пінжак празмерна тонкі. Але будучыня светлая. Аўгуст атрымаў пасаду мастака-дэкаратара ў Пера Мальмё на Рэгерынгсготан і яму ветліва прапанавалі пакой побач з майстэрняй за прыстойны кошт. Але Аўгуст адхіліў прапанову, бо хутка стане навучэнцам самай лепшай мастацкай школы Стакгольма. Настаўнікі ў школе спадзяюцца на яго талент. Гэта амаль невыносна шчаслівае пачуццё. Яно скрабе ў жываце, стукае ў мозгу, надае яму галавакружэнне і неразборлівасць. Іншым разам ён думае, што ашалее. Аўгусту, гэта шчырая праўда, падрыхтавана месца навучэнца па прадмеце эскіза і жывапісу і прызначана гадавое ўтрыманне ў 4 кроны!

— Ваша імя і прозвішча ў сапраўднасці гучыць як Аўгуст Лінквіст? — спытала маленькая пані. Гэта было страшэнна радыкальна!

— Можа, пані пытаецца для часопіса "Новы чытальнік"? Таварыства правільнага вымаўлення бачыла ў спрашчэнні вымаўлення магчымасць зменшыць розніцу паміж вышэйшымі і ніжэйшымі слаямі, паміж тым, хто атрымаў магчымасць вучыцца, і тымі, хто яе не атрымаў.

— Пан Лінквіст, ці правільна абраў прадмет вывучэння? — дзёрзка цяўкнула маленькая пані. — Можа, літаратурная творчасць лепш падыходзіць вашым амбіцыям?

Тады ён зрабіўся вельмі сур'ёзным.

— Не думайце, пані, — кажа ён. — з усіх відаў мастацтваў літаратурная творчасць — найцудоўнейшая. У мяне да літаратурнай творчасці ніколі не хапала таленту. Ці чытала пані Аўгуста Стрындбурга?

— "Аўгуст" — хіхікнула, не спалохаўшыся, яна. — Ён таксама не радыкал? Ён жыў тады, калі не зваўся Аўгустам?

— Вы шэльма! — кінуў ён, не помнячы сябе ад злосці. — Не смейцеся з мастацтва! Няма нічога больш цяжкага за гэта.

— Я не смяюся з мастацтва, — прамовіла яна. — Я смяюся з пана.

Ён меў свой наняты сціплы пакой на Пармэтарэготан, на Кунгсхольмене. Гэта быў самы танны пакой, які ўдалося знайсці, і яшчэ нашмат прасцейшы за дом, што ён пакінуў у Хельсінгфорсе. Цяпер Аўгуста мяняецца на "Свэльтхольмен" — ён чуў, так завецца Кунгсхольмен.

Пах галечы ўдарыў яму ў нос. Ён чыхаў ад смуроду, бо намерваўся перадольваць галечу. Імкнуўся адолець усе перашкоды. Сыны батракоў таксама людзі. Мы ўсе людзі роўныя! Мы ўсе маем правы. Сацыялісты зразумелі гэта. Ён жыў у дзіўны час. На працягу гэтай чвэрці стагоддзя ўсё ў свеце змянілася. Дзіця атрымала магчымасць хадзіць у школу, дзяўчаты сталі паўналетнімі, незадаволеныя рабочыя выйшлі на страйк, што заўгодна было магчымым. Усё тое, з чаго б яго маці смяялася, як з летуценняў і яго бацька б праклінаў як ідыёцтва — гэта здаралася цяпер кожны дзень. Што было цяпер немагчымым? Усё! Што здаралася? Усё!

Аўгуст брыў наўсцяж па вуліцы. Ён не спяшаўся дадому. Не вельмі сумавалася па ім, гэтай халупе. Пасля царквы ён павярнуў прэч управа і павольна рушыў уверх, міма паліцэйскага ўчастка, уверх па крутых лесвіцах, уздоўж агароджы батанічных садоў, міма маленькіх хацін з іх маляўнічымі кавалачкамі зямлі. І вось ён на месцы. У доме нумар дваццаць тры знаходзіўся ложак, які ён здымаў. Аўгуст пераадолеў лесвіцу некалькімі хуткімі крокамі.

Унутры пакоя ён сутыкнуўся з аглушальным шумам. Гэта былі яго сябры па пакоі, што пакутавалі ад смагі.

— Будзеш піва, фінскі д'ябал? — сябра хіхікаў усёй фізіяноміяй і працягваў бутэльку. Паны пабывалі ўнізе ў глухой Марыі, і пастараліся.

— Гэта цудоўна, мець краму ў доме, — ззяў сусед па пакоі. Лепш не прыдумаеш. Ці як, Лінквіст? — сябар набіваўся з бутэлькай.

— Дзякуй, — адмовіўся Аўгуст, — але ў мяне прызначана сустрэча. Я павінен зараз жа ісці.

— Д'яблы! Мужык, ты не можаш выглядаць чалавекам. Гаворыш, як прафесар!

— Канечне, — адказаў Аўгуст.

Ён збег уніз па вуліцы. Чаму галеча такая подлая? Чаму такія агідныя тыя бедныя людзі, што хочуць выставіць сябе багатымі?

Ён кінуўся па лесвіцах і спусках уніз, у куток пры царкве. Конка ішла за ім у пары кварталаў, але Аўгуст не траціўся на тое, каб ехаць. Дваццаць пяць эрэ можна было выкарыстаць лепш. Тут, на гары, на паўдарозе да неба, знаходзілася Хедві ў доме нумар дваццаць шэсць. Ён не забыў яе. Гэтага ён не зробіць ніколі. Яе жыццё ўзаемазвязана з ягоным. Вось якраз ён стаіць перад яе дзвярыма.

Мужнасць пакінула Аўгуста. Ён прайшоў міма да кафэ "Дом на Полюсе". Піва і бутэрброд яму б спатрэбіліся. Гэта тое нямногае, што ён атрымае сёння з раніцы. Званочкі віталі над дзвярыма, калі іх адчыняў. Ён коратка ўсміхнуўся. Сеў за вольны столік, непадалёк ад смяшлівай пары.

— Бледная Графіня! — крычаў мужчына. — Два піва!

Зараз жа з'явілася з заказам тая, якую клікалі. Гэта была Хедві.

Аўгуст самлеў. Афіцыянткай у піўной рабіла Хедві. Ён спачатку не мог паверыць — простая афіцыянтка, але яна стаяла тут, перад яго вачыма, і пыталася, чаго ён хацеў.

"Цябе, — хацеў ён адказаць. — "Я хачу цябе".

— Бутэрброд і піва, дзякую. З селядцом, калі ёсць.

— Піва з селядцом? — смяяўся пан за сталом побач.

— Бутэрброд з селядцом, — удакладніў Аўгуст збянтэжана. — І піва.

— Дзякую, — прамовіла Хедві.

Яе голас быў сумны і бясколерны.

— Ці Вы новы Вы? — дапытваўся смяшлівы пан.

— Так, зусім, — прызнаўся Аўгуст.

Пан прадставіўся і працягнуў руку. Аўгуст паціснуў яе, але адразу забыў імя.

— Лінквіст, прыемна.

— Скажы, адкуль.

— Сатакунда.

— Канечне, канечне, чуў, — пераймаў пан яго дыялект. — Наша дарагая братэрская краіна Фінляндыя! І што вы тут робіце, шаноўны Лінквіст, на вашым забытым Богам востраве? Артыст?

Аўгуст кіўнуў.

— Цырк? — дапытваўся пан і цвёрда пагрукаў у акно нейкім падлеткам, што шумелі знадворку. — Сын жонкі, патлумачыў ён, — самы худы і бледны гарэза.

Але Аўгуст не звяртаў увагі на хлопчыкаў.

Чаму пан называў афіцыянтку Бледнай Графіняй?

— Вы не любіце, як яна абслугоўвае? Бледная, як мармур, з манерамі графіні. Гэта прыгажосць Кунгсхольмена, гэтая дзяўчына.

Аўгуст згадзіўся, што яна была страшэнна прыгожай. Ён моўчкі разлічыўся і пайшоў.

На рагу, дзе Хандтвэркарэготан скрыжоўваецца з Пармэтарэготан, месцілася двухколка нумар трынаццаць. Тут заўважаліся раз на тыдзень распусныя жанчыны. Фурманы днямі стаялі ў чарзе да Капланскай гары ў чаканні аблегчыць дамам зваротны шлях.

Можа, ён павінен таксама стаяць у чарзе? Будзе, відаць, лепш, калі ён не застанецца чакаць.

Як мог ён убачыць у сне Хедві? Аднойчы ён сустрэне яе, уціснецца ў яе знатную сям'ю. Прыгажэйшая дзяўчына на Поўначы будзе ягонай. Іншы раз, калі ў Аўгуст меліся грошы, ён выпраўляўся ў дарогу з сябрам па мастацтве да Бернса або Люстраной Залы, але часцей у які-небудзь шынок талерку супу на абед і, як тыя кажуць, студэнцкім бутэрбродам — па дармовую лусту хлеба, намазаную гарчыцай, боскай для галоднага.

Перад Калядамі паслаў ён Хедві друкаваную паштоўку. Прывітання ў адказ не атрымаў. Дні праходзілі за маляваннем. Аўгуста вывучаў таксама нямецкую мову, часткова з дапамогай дзяўчыны з Ругена, што прыслугоўвала ў шынку "Апошні глыток". Так доўга працягваліся дні, амаль прыдатныя для прагулак, Аўгуст звычайна купляў для яе чэрствыя пірожныя за дробную манету ў булачнай Янсана на Крунубергсготан. Яна любіла дармавыя пірожныя, гэтая дзяўчына.

У навагодні вечар, якраз апоўначы, ён апынуўся адзін сярод масы народа ў Скансене. У суправаджэнні музыкі і хору да вяршыні гары Рэнберг рухалася факельнае шэсце, там дэкламавалі "Званіце, званы, званіце!" Адначасова пачалі званіць званы ўслед адыходзячаму стагоддзю. Затым яны сціхлі.

Стрэл абвясціў, што новы год пачаўся. На гары запалілі касцёр. Пачала гучаць музыка, зайгралі псалм і з горада даносіліся гукі званоў усіх цэркваў Стакгольма.

Дзінь! Дон!

Галеча будзе знішчана. Знікне несправядлівасць. Розум, школа і мастацтва перамагаюць.

Дзінь! Дон!

Дваццатае стагоддзе абяцае ўсё.

Дзінь! Дон! Дзінь! Дон! Дзінь! Дон!

Пераклаў са шведскай Уладзімір СВЯЖЫНСКІ

ІМПРЭЗЫ

УШАНАВАЛІ ЮБІЛЕЙ ЗЕМЛЯКА

Ушанаванне памяці земляка — гаданавая справа. Да 120-годдзя з дня нараджэння Язэпа Лёсіка, беларускага пісьменніка, лінгвіста, першага дырэктара Інстытута мовазнаўства Нацыянальнай акадэміі навук, на яго малой радзіме, на Стаўбцоўшчыне, прайшло святкаванне юбілею. Ініцыятарам гэтага мерапрыемства выступіў загадчык аддзела культуры Стаўбцоўскага райвыканкама Анатоль Грэкаў. Вечарыны, прывечаныя жыццёваму і творчаму шляху Язэпа Лёсіка, прайшлі ў Мікалаеўшчынскай і Любкаўшчынскай школах, а таксама ў Кнотаўшчынскім прытулку для дзяцей-сірот і ў Стаўбцоўскай раённай дзіцячай бібліятэцы. Важна, што найперш адбылося далучэнне да нашай беларускай спадчыны школьнікаў — тых, хто будзе вызначаць культуру і развіццё грамадства ў будучым. І дзеці ахвотна прымалі ўдзел у чытанні твораў свайго славутага земляка — роднага дзядзькі Якуба Коласа, а ў Стаўбцоўскай дзіцячай бібліятэцы пад кіраўніцтвам яе дырэктара Наталлі Даўлют нават удзельнічалі ў своеасаблівай тэатральнай пастаноўцы аднаго з апавяданняў Язэпа Лёсіка, які шмат пісаў і для моладзі.

Маргарыта ПРОХАР

ПОМНЮ ЎСЁ, ШТО БЫЛО...



М. АЎРАМЧЫК, У. КАРАТКЕВІЧ і В. БЫКАЎ.

З біяграфічнай даведкі

Мікола Аўрамчык нарадзіўся 14 студзеня 1920 года ў вёсцы Плёсы на Бабруйшчыне. Пасля дзесяцігодкі ў 1938 годзе паступіў на філфак Мінскага педінстытута...

— Мне пашанцавала. Было б мне ў 30-я гады на пяць болей — мой лёс быў бы вырашаны — трапіў бы ў тую ж мясарубку, што і Зарэцкі, і Галавач. І Панчанку пашанцавала... Тое ж было б і Максіму Танку, калі б ён у 35-м перайшоў мяжу ў Савецкую Беларусь. Яго б знішчылі! І няхай зараз камуністы не віхляюць хвастом, маўляў, гэта была не заканамерная з'ява. Заканамерная! Так была іхняя машына закручана тады — на знішчэнне нацыянальнай культуры. Так было ва ўсіх рэспубліках...

З біяграфічнай даведкі

У час Вялікай Айчыннай вайны Мікола Аўрамчык удзельнічаў у баях на Паўночна-Заходнім і Волхаўскім франтах. Пры акружэнні ў чэрвені 1942 года быў узяты ў палон і вывезены немцамі ў Рур на каменнавугольныя шахты (пра гэта ягоны раман "У падзямеллі", што выйшаў у 1986 годзе). Пасля вайны працаваў на аднаўленні Данбаса. У 49-м скончыў філфак БДУ, працаваў у рэдакцыях газет "Чырвоная змена", "Літаратура і мастацтва", часопіса "Полымя". З дня арганізацыі ў 1953 годзе часопіса "Маладосць" і да пенсіі — рэдактар аддзела паэзіі.

— Калі памёр Сталін — я плакаў. А праз колькі дзён сустрэў свайго сябра Андрэя Макаёнка і пытаю, дзе ты ўсе гэтыя дні быў? А ён смяецца. Мы, кажа, з Алёшам Русецкім гарэлку пілі з радасці, што гэты акалеў... Падумаў тады, Божа мой, я пабываў у нямецкім палоне, прайшоў апраметную. Андрэй жа быў на вайне палітруком. А якое рознае стаўленне да рэчаіснасці! Да мяне многа пазней прыйшло разуменне пачварнасці сталіншчыны...

Пасля вайны я асабліва не вытыркаўся. На трыбуну не лез, горла не драў — не з маёй біяграфіяй! Але афіцыёзаў асабліва не ўнікаў. Працуючы дзесяцігоддзямі ў "Маладосці", карпеў над чужымі рукапісамі, сам жа пісаў мала... Затое па краіне паездзіў удосталь! Лічы, ва ўсіх рэспубліках былога Саюза пабываў. І не раз! Сябраваў з многімі нацыянальнымі пісьменнікамі. У застоллі іншы раз гаварылі так шчыра, такія тайны адкрывалі, што ні ў якім артыкуле тады не выпадала надрукаваць! Роднай жонцы баяліся такое казаць! Мне кіргізы прызнаваліся, што, добра вам, беларусам, у вас столькі часопісаў па-беларуску выходзіць — і літаратурных, і дзіцячых, і для жанчын, і гумарыстычных, а ў нас жа таго няма! Туркмен Курбанпесаў расказваў, што калі ў іх на пісьменніцкай нарадзе прысутнічаў хаця б адзін рускамоўны літаратар, то ўсе пераходзілі на рускую... Тлумачыў так: калі мы, туркмены, пры рускім будзем гаварыць па-свойму, то нас абвінавацяць у нацыяналізме, бо прыніжаем годнасць рускага! А той рускі пражыў у Туркменіі ўсё жыццё! А па-іхняму — ні ў зуб нагой. Не хацеў проста! Ленаваўся. А то і грэбаваў. Дык то літаратар, а звычайны чалавек?! Мяне абурае, калі рускамоўныя ў Прыбалтыцы бунтуюць перад тэлекамерамі: уціск нацменшасцяў! Ды ты ўсё жыццё там пражыў! Вывучы мову ды гісторыю дзяржаўную, атрымай грамадзянства і жыві! Не, яго верне ад тамтэйшай мовы! І нашых, беларусаў, сярод іх хапае. Ну-то й будуць абзываць акупантамі. Латышскія пісьменнікі неяк расказвалі — калі два латышы добра нап'юцца, то будуць ісці па вуліцы і гаварыць па-руску, каб думалі: во! два рускія напіліся! Зваротная рэакцыя! А я ж ўсё жыццё быў інтэрнацыяналістам. Потым толькі зразумеў, чаго варты той савецкі інтэрнацыяналізм... Яўрэі ў 50—80 гады былі вымушаны цурацца і пятай графы, і прозвішчаў. Кампаў стаў Палявым, Гінзбург — Аксёнавым, Гангус — Еўтушэнкам... Са сваім прозвішчам ім было не прабіцца ў літаратуру. Камуністы пакрыёма, але цвёрда трымаліся дзяржаўнага антысемітызму. Вось маскоўскія паэты Казлоўскі ды Хелемскі выдалі ўсяго па дзве-тры кніжачкі сваіх вершаў. А пераклалі дзесяткі кніг нацыянальных паэтаў. Яны "далі свету" Расула Гамзатава! І жылі як у Бога за пазухай!

З біяграфічнай даведкі

Мікола Аўрамчык пераклаў на беларускую мову паасобныя творы Дж. Байрана, А. Міцкевіча, Л. Украінкі, І. Франка, М. Джаліля, Г. Эміна, С. Міхалкова, М. Нагнібеды.

— Мае вершы перакладалі Аляксандр Пракоф'еў, Усевалад Раждзественскі, Рыма Казакова, Вераніка Тушнова... Але бліжэй за ўсіх да арыгінала былі пераклады ялцінскага паэта Ігната Кандрашэнкі — у іх я знаходзіў свае думкі, вобразы, нават слоўцы...

Зараз скажу крамольную думку, якой не адцураюся ніколі. Два вялікія славянскія паэты не гучалі і дагэтуль не гучаць ні па-руску, ні па-беларуску — хто б вы думалі?! Паляк Адам Міцкевіч і ўкраінец Тарас Шаўчэнка! Такіх геніяў павінны перакладаць роўныя па таленце паэты. Пушкін напісаў некалькі вершаў паводле Міцкевіча, але ж толькі "паводле"! Лірыку Міцкевіча з ягонай выбуховай страфой, дзе кожны радок па вобразнасці, метафарычнасці настолькі нагружаны, што без страт пры перакладзе яго немагчыма ўціснуць у наш кананічны радок! Я пераклаў адзін з ягоных "Крымскіх санетаў" ("Пілігрым") — ото была мука! А Шаўчэнка?! Як з ім абыходзіліся? Ну, кабзар, народны пясняр... А пачытай яго ў арыгінале — гэта ж філосаф роўны Скаварадзе! А Скавараду і ў Амерыцы ведаюць... Шаўчэнку ж спросцілі, выхаласцілі, ледзь не да ўзроўню фальклору...

1955 г. В. ГРАМЫКА, І. ГРАМОВІЧ, М. АЎРАМЧЫК, Г. ШЧАРБАТАЎ, А. РЫЛЬКО і Я. ВАСІЛЁНАК.

З біяграфічнай даведкі

У 1964 годзе за зборнік вершаў "Сустрэча былых канагонаў" Міколу Аўрамчыку прысуджана Літаратурная прэмія імя Янкі Купалы. За літаратурную дзейнасць ён узнагароджаны ордэнам "Знак Пашаны" і медалямі.

— У хрушчоўскую адлігу намерыўся наш парторг пісьменніцкага саюза Ілля Гурскі прыняць мяне ў партыю. Кажу: не з маёй біяграфіяй — палон, рурскія шахты. "Ды кінь ты, не тыя часы!" — і пайшоў наш Ілля Данілавіч у абкам партыі "параіцца". Быў ён чалавекам вельмі шчырым, праўдзівым і далікатным. Інтэлігент з рабочых. Калі, працуючы ў "Полымі", вяртаў аўтару бяздарны раман, дык вінаваціўся: "Ваш твор малавысокамастацкі..." Вярнуўся ён з абкама засмучаны, маўчыць. І я маўчу. Усё і так зразумела. А потым неяк кажа мне: "З усіх рэпрэсаваных і знішчаных пісьменнікаў ведаю двух, якія былі крыштальна чыстымі, нават я ў іх не сумняваюся — Галавач і Зарэцкі..."

Пасля мне не раз прапаноўвалі ў партыю, але я ўжо сам не хацеў. Ды адліжныя павевы ўсё ж адыгралі сваю ролю — у 1964 годзе мне далі Літаратурную прэмію імя Янкі Купалы. Дарэчы, пра прэміі. Калі Сталінская прэмія была скасавана, у рэспубліках задумаліся — неяк жа трэба адзначаць лепшыя творы. На Украіне сталі прысуджаць прэмію імя Шаўчэнкі, у Грузіі — Руставелі, у нас — Купалы і Коласа. Але твораў ніхто не вылучаў, не абмяркоўваў. Штогод 31 снежня выклікалі ў Саўмін, дзе ўручалі канверт з двума тысячамі рублёў. І ўсё. Гэтак жа было, дарэчы, з узнагародамі — давалі ордэн ці медаль, як тады казалі "з мяшка", ні ўрачыстасцяў, ні слова ў газетах... Апошнімі атрымалі такім макарам прэміі Пестрак, Вялюгін і я. Дык Мележ і кажа, напішыце ў Саўмін ліст: што гэта за прэмія, калі ні знакаў, ні папак... Мы напісалі. Праз нейкі час выклікаюць усіх нас, чалавек дваццаць, хто да гэтага атрымаў прэмію, і ўручаюць скураныя папкі з выціснутым золатам тэкстам "Лаўрэату Дзяржаўнай прэміі..." Папкі былі вузкія і доўгія — між сабою пісьменнікі называлі іх "голенище". Правільней па-беларуску "халява", але гэта мела б ужо другі сэнс!

Макаёнак тады абурыўся: "У статуце пазначана, што ў галіне паэзіі і драматургіі прэмія носіць імя Купалы, а ў мяне — Коласа!" Чынавенства прысела: ой, выбачайце, мы пераробім! І выправілі яму "голенище" імя Купалы... А медалькі сталі значна пазней даваць.

У канцы 90-х мы з Сяргеем Грахоўскім часта выступалі перад мінскімі чытачамі. Аднойчы былі ў дыпламатаў, яны запыталі: чаму вы заўсёды разам? Дык я кажу: Сяргей — глухі, я — сляпы, нам удвух лацвей — ён бачыць, я чую... Пойдзем вось у пераход міласціну прасіць. Дыпламаты зніякавелі, не ведаюць, што і казаць.

Не, я не наракаю на сённяшнюю беднасць пісьменніцкую — і раней ніколі асабліва багатым не быў! Ну, з'ездзіш з жонкай па літфондаўскай пуцёўцы ў Крым ці Піцунду, а ўжо з дзецьмі — не, не той ранг! Зарплаткі былі мізэрныя, выручалі ганарары. Выйшаў у мяне аднатомнік, чакаю грошай — жонка з дочкамі (іх у мяне чатыры!) прысталі: купі легкавік ды купі! А дзвюх тысяч не хапае. Пайшоў да Макаёнка. Той адчыніў шуфляду стала, дастаў заклеены канверт — вось, кажа, дзяржпрэмія, яшчэ і не ўскрываў, бяры! Андрэй быў заможны, але і вельмі шчодры — усіх частаваў, у пазыках не адмаўляў.

Купіў я таго "Масквіча" — сам ездзіць не ўмею, жонка таксама. Прасі некага, каб звазіў у грыбы-ягады. Так ён і згінуў...

Выйшаў у мяне двухтомнік — мае жанчыны ізноў: купі-купі! Купілі "Ладу". Толя Грачанікаў загнаў на стаянку аж на ўскрайку Мінска. Стаіць тая "Лада" пад брызентам, гніе, нехта зверху каменем рубануў... Нарэшце старэйшая дачка здала на правы, спрабуе на дачу выязджаць. Так што не бедна жыў — легкавікі мяняў як пальчаткі!

Шкадую, што не вёў дзённікаў. Помню ўсё, што было, але ж дэталі!.. У 1958 годзе, калі Барысу Пастарнаку далі Нобелеўскую прэмію, узнялася хваля абурэння ў друку — арганізаваная, канечне. І ў нас у Саюзе пісьменнікаў сабраўся сход. Большасць выступоўцаў гаварылі так: "Я "Доктара Жывагу" не чытаў, але Пастарнака асуджаю!" Будучы акадэмік Барысенка так распаліўся, што замест Пастарнак, выгукнуў: "Гэты праз-рэнны Пястрак!" Піліп сядзеў як заўсёды ў першым радзе і, калі прамоўца скончыў, папрасіў слова. І сказаў векапомную фразу: "Вучоным трэба гаварыць па-пісаным". І сеў. А ў 70-м на ўрачыстым сходзе, прысвечаным 100-годдзю Леніна, зноў быў лаканічным. Выбраўся на трыбуну на добрым падпітку і грымнуў: "Ленін — гэта вам не абы-што! Ленін — гэта ведаеце што? Не абы-што!" І пайшоў з трыбуны, зачапіўшыся за хаднік, вінтом. Яго падхапілі. Нейкі клерк з ЦК у прэзідыуме быў чырвоны, што рак: ну, пісьменнікі! Учынілі балаган. Але Піліпу ўсё даравалася — падпольшчык, пры паляках у Картуз-Бярозе сядзеў!

Помню шмат, але ці напішу... Ужо ж і чытаю з лупаю!

*

Запіс гэтай размовы з Міколам Якаўлевічам быў зроблены мною не сёння. Ды падвяла тэхніка — паламаўся дыктафон. І дзве касеты праляжалі не расшыфраванымі да гэтай пары. Дзякаваць сябру, даў свайго магнітафона, і вось вытрымкі з шматгадзіннага застолля ў кватэры Аўрамчыка на вуліцы Усходняй увайшлі ў гэтае інтэрв'ю.

Зараз Мікола Якаўлевіч большую частку года жыве ў сваёй сястры на Бабруйшчыне. У сталіцы бывае наездамі. І ніводнага разу не папракнуў — ну, дзе ж тваё інтэрв'ю?!

Алесь ГАЎРОН

І ЁН БЫЎ СА СВЕТАЧАМ

У першыню пабачыў на вокладцы выдання прозвішча Ластоўскага на другім курсе універсітэта ў Вільні — купіў там у кнігарні, у букіністычным аддзеле ягоны "Падручны расійска-крыўскі (беларускі) слоўнік", выдадзены ў 1924 годзе ў Коўне.

Усю дарогу ў цягніку гартаў яго, здзіўляючыся і ад адмысловай прадмовы ("вярхі нашага нацыянальнага дрэва, пэрыёд за пэрыёдам, засыхалі і адпадалі ад народнага пня", "наша мінуўшчына — гэта блуканне па раздарожжах і муках, а мы цяпер ізноў пры крыніцах гаючае і жывучае вады, пры сваім народзе Крывічанскім..."), і ад перакладных слоў і тлумачэнняў (Аборыген м. лац. першыя пасяленцы краю... пракаветнікі, первабытнікі, тутэйшыя. Мы людзі тутэйшыя, пракаветнікі, а не якая набрыдзь чужацкая") і г. д. Чытаць тады такое было незвычайна.

У Мінску перасцярог Рыгор Семашкевіч: выдатная рэч, але хавай, нікому не паказвай! Аўтар слоўніка ў нас забаронены! Як і Язэп Лёсік (навуковец, грамадска-палітычны дзеяч, пісьменнік), Алесь Гарун (паэт) ды тыя, што за мяжой, лічыцца ярым нацыяналістам, ворагам народа! Тады ў нацыяналізме бачылі толькі крайнюю яго праяву, фашызм, а таго, што гэта можа быць свядомасць, ідэяй змагання за нацыянальна-дзяржаўную незалежнасць, не бачылі. Ды і цяпер многія не адрозніваюць, нацыяналіст ужо толькі за тое, што гаворыш па-беларуску. Праўда, нам, пісьменнікам, некаторым вучоным, настаўнікам, журналістам, ёсць і пэўная скідка. А што да таго экземпляра слоўніка, то яго з маёй валізы хтосьці з сяброў-студэнтаў "пазычыў і не аддаў", цяпер маю толькі факсімільнае выданне.

Рыгор Семашкевіч тады, у 1960-ыя, праз Ніну Ватацы прыладзіў мяне рабіць заказы ў беларускім аддзеле "ленінкі" і чытаць побач з вучонымі мужамі, дык па "Нашай ніве" сярод іншых аўтараў сустрэўся з некаторымі вершамі, легендамі, казкамі, публіцыстыкай і Власта — Ластоўскага, пазней, у перабудову, былі з ім сустрэчы па часопісах "Крывіч" і "Беларускі шлях", а ў 1997-ым па тому выбранага ў серыі "Беларускага кнігазбору" з выдатнымі прадмовай і каментарыямі Я. Янушкевіча, былі і іншыя сустрэчы, што ўсё разам памаглі ўявіць постаць гэтага асветніка, палітычнага і дзяржаўнага дзеяча, вучонага і пісьменніка далёка не радавога значэння.

"Адзін з галоўных беларускіх нацыяналістаў і ворагаў", ён нарадзіўся 8 лістапада 1883 года на Дзісеншчыне ў каталіцкай сям'і і, магчыма, ягоныя продкі былі са шляхты. Апошняе важна падкрэсліць таму, што ў XIX ды і на пачатку XX стагоддзяў найперш выхадцы з гэтых слаёў не толькі разам з простым людам захоўвалі, але і развівалі беларускасць — вывучалі і прапагандавалі сваю даўніну, лічылі сябе не "крэсамі" і не "ветвью", а народам са сваёй гісторыяй, культурай і былой дзяржаўнасцю, пісалі па-беларуску, чым абудзілі беларускае пытанне ўвогуле, якое, як бачым, у нас яшчэ як след не вырашанае і сёння, на пачатку XXI ст., хоць ужо даказана імі ж, што мы — "пракаветнікі"!

Ластоўскі ў навучальных установах вучыўся мала — канечне ж, з-за нястачы, змалку зведаў цяжкую сялянскую працу, на паслузе ў крамцы, але вялікае жаданне вучыцца прывяло яго ў Пецярбург, дзе уладкаваўся працаваць у бібліятэку і нелегальна слухаць лекцыі свяціл ва універсітэце. З 1902-га далучаецца да палітычнай дзейнасці, праз год жэніцца са швачкай Марыяй, якая пазней стане літоўскай пісьменніцай, прынясе яму нямала пакут і болю. Новыя шляхі-дарогі прывялі ў Рыгу, дзе спрабуе атрымаць дакумент аб адукацыі, але строга паставіліся да ягоных ведаў па рускай мове і атэстата не далі. Адпаведна, трэба было ісці да святла, да навукі толькі адзіным накірункам для такіх, як ён, — праз самаадукацыю. І праз яе ён спасцігае гісторыю, філалогію, а калі пасля 1905-га дазволілі ўжыванне беларускай мовы (не ўсюды і не ўсім) то і сакрэты журналісцкай прафесіі ў газеце "Наша ніва". Тут і ён разам з А. Уласавым, братамі Луцкевічамі, Я. Купалам і іншымі спаўняў вялікую навуковую і творчаю, асветна-культурную, нацыянальную работу для ўсяго беларускага краю. "Наша ніва" — гэта факел (згодна Ластоўскага, лучнік, лучніца, светач) у цемры, у якой трымаў наш народ царызм, агонь быў відаць далёка і радасна вабіў да сябе, да святла і цяпла, усіх шчырых і свядомых, але з застуджанаю душой. Па-грамадзянску, творча рос Ластоўскі-Власт і сам, а 1910 год для яго ў гэтым сэнсе надзвычай удалы і плённы — найперш за публікацыю ў "Нашай ніве", а пасля і за выданне ў друкарні Марціна Кухты ягонай "Кароткай гісторыі Беларусі". Сам ён сціпла зазначаў, што гэта "па Кіркору". Зразумела, штосьці было ад кіркоравых "Літоўскага Палесся" і "Беларускага Палесся" альбо з тых выданняў, што той рэдагаваў, але Ластоўскі свой твор акрэсліў не проста на прынцыпе гістарычнай памяці, але ў духу нашаніўскіх ідэй, нацыянальнай свядомасці, каб кожнаму чытачу ўзвысіцца над сваёй "тутэйшасцю", адчуць, убачыць, усвядоміць тое, што цяпер дасягненне (досьціг) у іншых, эканамічна і культурна развітых народоў. Як і ў Купалы, заклік да заняцця свайго "пасаду" паміж дзяржавамі, годна падаць свой голас на ўсім свеце. Канечне, мары, мэты, задачы і дзеі былі не простыя, на іх ажыццяўленне патрабаваліся вялікія намаганні і сілы, але ўсё было асвечана высакародным агнём розуму і душы. І, галоўнае, ўсё было для ўсіх, без чыгосьці ўзвышэння і ўніжэння кагосьці.

Сталеючы, набіраючыся вопыту, ён у 1913-ым, безумоўна, добра разумеў, што і як ужо зрабілі, падтрыманыя М. Горкім, Я. Купала і Я. Колас, М. Багдановіч, але вырашыў падварушыць інтэлігенцыю,маладых вядомых пісьменнікаў, падахвоціць іх да дыскусіі пра стан, развіццё тагачаснай літаратуры, пачаўшы яе, дыскусію, даволі задзірыста. І Купала, і Гарэцкі адказалі на выклік Юркі Верашчакі, не усім пагадзілася, але сама тая дыскусія была патрэбная для тагачаснага літаратурнага працэсу, бо разглядаліся, як слушна зазначае Я. Янушкевіч, "шляхі развіцця, творчы метад, кірунак і стыль будучай літаратуры". Пазней шмат робіць для выдання беларускіх школьных падручнікаў.

Як вядома, у сувязі з першай сусветнай вайною "Наша ніва" перастала выходзіць і сканцэнтроўваць вакол сябе маладыя беларускія сілы, хоць у Вільні кайзераўскія акупацыйныя ўлады побач з пытаннямі польскім і літоўскім праявілі інтарэс і да беларускага, да нашай гісторыі, мовы і культуры, дазволілі іхні ўжытак, вывучэнне ў пачатковых школах, арганізацыю грамадска-палітычных суполак і правядзенне іхніх сходаў, пачалі выдаваць пашпарты па-беларуску і г. д. Канечне, ва усім гэтым была і свая зацікаўленасць, але тыя з беларускіх дзеячаў, хто не пакінуў Вільню, пачалі выкарыстоўваць дазволеныя магчымасці і ўжо ў 1916 годзе ў Лазане вылучылі і для ўсёй Еўропы беларускае пытанне, а крыху пазней утварылі віленскую Беларускую раду на чале з А. Луцкевічам, у сакавіку 1918-га менавіта віленцы паўплывалі на ідэю аб'яўлення і сцвярджэння БНР, што, зразумела, было зусім не па гусце ні бальшавікам, ні маладым польскім адраджэнскім сілам. БНР называлі "папяровай", але і за кароткі час яна паспела нямала чаго зрабіць ва ўмовах кайзераўскай акупацыі, разруху і нястачы (яшчэ да вайны з Беларусі было шмат чаго вывезена, а пазней і мяснікоўцы павезлі ў Смаленск куфры з грашыма, кінулі люд на холад і голад), за кароткі час нямала еўрапейскіх краін прызналі той акт дзяржаўнасці, завялі ў сябе беларусія калі не амбасады, то пэўныя аддзелы. Ёсць ускосныя звесткі, што каб не было БНР, то не было б і БССР, якую найхутчэй стварылі як буфер перад Польшчай, як плацдарм для ўварвання ў Еўропу пад сцягам "мировой революции".

Цяпер пра тое можна спакойна разважаць ці спрачацца, а тады за гэтым стаялі лёсы і жыцці, будучыня ці, наадварот, безнадзейнасць. У стасунках з бальшавікамі і іншымі партыямі, якіх было нямала, з польскімі і літоўскімі дзеячамі, з кайзераўцамі беларускае пытанне зведвала ўзнясенні і падзенні, крызіс (віленская і мінская Рада, БНР, БССР, нейкая беларуска-літоўская федэрацыя); многія вагаліся-хісталіся, падзяляліся на розныя групы (кажуць, і ў масонаў шукалі шчасця); Ластоўскі ў той віхурны, спрэчны, вельмі зменны час, як можна меркаваць па фактах, абраў для сябе шлях змагання за БНР, як за апошні шанц для беларусаў вярнуць былую дзяржаўнасць. Быў яе прэм'ер-міністрам, за што пад гнеў польскіх улад трапіў у іхнюю турму, пасля яго выслалі за межы Беларусі, не давалі спакою і ў Латвіі, правакуючы, што і ён падыме "латгальскае пытанне". Знаходзіць прыстанак у Коўна (Каўнасе), дзе яго чакалі вялікія засмучэнні: падчас ранейшых вобыскаў з ягонай бібліятэкі знікла шмат кніг, дакументаў, у тым ліку і старажытных (яшчэ з 1021 года!).

Засмучэнні трэба было пераадольваць, і ён робіць гэта новай, тытанічнай працай па беларускай гісторыі, як лічыць Я. Янушкевіч, "сціслай энцыклапедыяй", якая, "на вялікі жаль, засталася ў выглядзе машынапіснага рукапісу". Ды зноў новыя гарко-

З Янкам Купалам у рэдакцыі "Нашай Нівы".

ты: Савецкая Расія, каб набыць у асобе Літвы саюзнікаў у паходзе на Польшчу, перадае Літве "яе" землі — не толькі Вільню, але і Гродна, Ліду, Браслаў, Паставы, свядома зноў уразаючы БССР да крошкавай дзяржавы. Ластоўскі спадзяецца, што насельнікам беларускіх абшараў на плебісцыце ўдасца дабіцца сваёй самастойнасці (дарэчы, на гэты конт была цікавая публікацыя польскага вучонага П. Ласоўскага "Беларуская карта ў якасці літоўскага козыра 1918–1924 гг." у "Беларускай мінуўшчыне" ў № 4 за 1994 год). У 1920–1923 гадах Ластоўскі наведвае многія еўрапейскія краіны, дзе акцэнтуе ўвагу на лёсе Беларусі, якая ў 1921-ым паводле Рыжскага міру са згоды ці без удзелу Мінска будзе падзеленая і дзе ў адной з частак, у Заходняй, адразу ж пачалі ўладарыць польскія чыноўнікі, паліцэйскія, асаднікі, зусім не зважаючы, што яшчэ нядаўна палякі і беларусы разам цярпелі ад царызму, што кіруючыя польскія колы абяцалі сваім нацменшасцям нацыянальна-культурнае, рэлігійнае развіццё. Ды, падкрэсліваў падарожны, і ў іншай частцы, "незалежнай", амаль нічога няма "свайго" — грошай, войска, пошты, чыгункі, пасольстваў за мяжой. "Ні там, ні тут не мае беларус свабоды... і там, і тут знаходзіцца ў няволі, у рабстве. Каторая няволя горшая, маскальская ці польская, сказаць цяжка. І саломенны і раменны хамут муляе шыю".

І Ластоўскі "муляў" усім "і там, і тут". Мінску таксама. Мінскія ўлады робяць усё, каб яго зганьбіць. І Ластоўскага прыбіраюць з прэм'ерства рукамі сваіх жа. Новы ўдар, але "чала я не хіліў прад сілай" і, які раз пераадолеўшы горыч, ён бярэцца выдаваць часопіс "Крывіч" грамадска-палітычнага і літаратурнага накірунку і на "незалежніцкай" пазіцыі (праз некалькі гадоў літоўскія ўлады прыпыняць выданне, бо палічаць беларускую справу не зусім спрыяльнай сабе), піша прозу (вядомая аповесць "Лабірынты"), у 1926-ым бярэ ўдзел у Мінску ў навуковай канферэнцыі па праблемах беларускага правапісу. Не зважаючы на ягоныя часамі агрэсіўныя выпады супраць савецкай улады, яго тут сустрэлі паважліва, запрасілі сюды на працу, паабяцаўшы, што ніякай помсты не будзе, а наадварот, будуць створаныя ўсе спрыяльныя ўмовы для навуковай і творчай дзейнасці. Як і некаторыя іншыя нашаніўцы і "незалежнікі", Ластоўскі пачынае верыць, што беларускасць можа рэалізавацца толькі ў БССР пры падтрымцы ўлад, назусім пераязджае ў яе сталіцу са сваім архівам, з новенькай, выдадзенай у 1926-ым у Коўне кнігай "Гісторыя беларускай (крэўскай) кнігі", дзе аналіз больш 1000 важных рукапісных кніг, грамат, старадрукаў з пачатку X ст., і пачынае натхнёна працаваць сакратаром у Акадэміі навук (быў і на іншых пасадах). Піша шмат навуковых даследаванняў і літаратурных артыкулаў, дбае пра новыя слоўнікі, ладзіць этнаграфічныя экспедыцыі, матэрыяльна дапамагаючы са сваіх ганарараў заходнебеларускай інтэлігенцыі (Язэпу Драздовічу, Рыгору Шырму).

Ды "беларусізацыя" заціхала, згортвалася, а калі неўзабаве звольнілі з сакратарскай пасады ў акадэміі, а пасля і арыштавалі па выдуманай гучнай справе "Саюз вызвалення Беларусі", ён не мог не зразумець: яго, як і іншых, проста двудушна заманілі сюды. Было 10 месяцаў зняволення, допытаў, абраз і абвінавачванняў, хоць урэшце абышлося яшчэ не сурова: выслалі не ў тайгу ці тундру, а ў Саратаў, далі магчымасць працаваць у бібліятэцы. Але з узмацненнем тэрору перагледзелі справу: у 1937-ым арыштавалі паўторна, ужо катаваннямі давялі да адчаю. "Я жыву между двумя ужасами, — напіша ён следчаму, — ареста жены и ужаса ложного показания. Прошу следствие понять, что я мог дать такие показания только в состоянии психоза, высидев 38 часов на стуле, при угрозе ареста друга моей жизни, инвалида жены».

Следчых гэты крык ягонай душы зусім не цікавіў. Яны цешыліся, што за 38 гадзін няспыннага допыту (следчыя мяняліся, елі, спалі, а яго трымалі пры напрузе пад святлом, не тым, высакародным, а асляпляльным), дабіліся ад яго "показания". А ў ім — не многа і не мала, а "агент польскай разведкі і ўдзельнік нацыянал-фашысцкай арганізацыі", г зн. усё пад расстрэльны артыкул. І 23 студзеня 1939-га, калі яму не было яшчэ і 55 гадоў, яго расстралялі, на паўстагоддзе пазбавіўшы добрага імені, а чытача — ягоных кніг.

...Ластоўскага рэабілітоўвалі двойчы: у 1958-м з агаворкамі, не для ўсёй грамадскасці (можа, каб і не ўсе ведалі, што ён ужо не "вораг народа"), у 1988-ым — поўнасцю, у 1990-ым вярнулі пасмяротна званне акадэміка, а значыць і прызналі яго вялікія заслугі перад навукай і культурай, народам.

Генрых ДАЛІДОВІЧ

БЫВАЙ, ЛЕАНІД КАЛОДЗЕЖНЫ...

Заўчасна пайшоў ад нас пісьменнік Леанід Калодзежны. Жыццёвы шлях якога быў абпалены і самой вайной і яе водгуллем — холадам, нішчымніцай ды непасільнай працай...

Скончыўшы вясковую школу і Віцебскае мастацка-графічнае вучылішча, з маладых гадоў пачаў супрацоўнічаць з газетамі; пісаў артыкулы на злобу дня, нарысы пра людзей працы, а ў вольныя хвіліны набалелую самабытную прозу вясковага жыцця... Доўгі час працуючы мастакам-афарміцелем на Аршанскім ільнокамбінаце, у рэшце рэшт, у сорак гадоў дапісаўся да сваёй першай кніжкі апавяданняў "Аўсяны звон", якая займела шмат станоўчых водгукаў, у тым ліку і ад такіх майстроў пяра, як Серафім Андраюк, Алесь Жук, Генадзь Шупенька...

Не часта і не лёгка, але пісаліся і выходзілі да чытача яго наступныя кніжкі, назапашваліся новыя задумкі, творчыя планы, ды вось...

На правінцыйным бальнічным ложку, ужо асуджаны на непазбежнае, доўга й цярпліва чакаў ён сваіх сяброў-таварышаў, калег па пяру і проста выпадковых, але шчырых спадарожнікаў жыцця... Аднак сёння, асабліва ў сталіцы, знябожаныя літаратары мала дбаюць пра іншых.

"Ехаць да яго ў тую далеч пасярод зімы... як на той свет... Мо пацяплее як... Самі напаўжывыя..."

Ён трымаўся з апошніх сіл, але з гэтага свету так нікога й не дачакаўся. Толькі Бог заўважыў яго, бо не пакідае нас адных, усё ж ладуючы нам сустрэчу... няхай сабе й на тым, мажліва, не горшым свеце...

Спачуваем яго блізкім. А яму — пухам зямля.

Супрацоўнікі Рэдакцыйна-выдавецкай установы "Літаратура і Мастацтва".

У ТВОРЧЫХ САЮЗАХ

❑ Адбылося пасяджэнне Бюро секцыі паэзіі СБП, прысвечанае абмеркаванню творчасці паэтаў: А. Бабоўка, Т. Барысюк, А. Барадача, М. Гарэлавай, В. Вабішчэвіча, М. Маскевіча, А. Новіка, Н. Стаховіч, Ю. Пацюпы. У працы секцыі прынялі ўдзел: М. Шабовіч, В. Гардзей, В. Жуковіч, Ул. Мазго, М. Скобла, А. Камоцкі, В.Слінко, К. Камейша, Я. Хвалей.

Па выніках тайнага галасавання ўсе паэты, акрамя А. Барадача і А. Новіка, атрымалі рэкамендацыі для ўступлення ў СБП.

Вёў секцыю Э.Акулін.

❑ У мінскім Інстытуце парламентарызму і менеджменту адбылася творчая сустрэча з удзелам старшыні СБП Алеся Пашкевіча і ягоным намеснікам Барысам Пятровічам. Усё, што тычыцца жыцця сучаснай беларускай літаратуры, пачынаючы ад мітрэнгаў вакол аўтарства "Сказа пра Лысую гару" да "брэндаў" сённяшняй паэзіі і прозы, стала прадметам зацікаўленай размовы паміж студэнтамі і пісьменнікамі.

❑ Чарговае пасяджэнне Бюро секцыі прозы прайшло ў Доме літаратара. У працы секцыі ўзялі ўдзел : А.Рыбак, П. Місько, А. Казлоў, Г. Багданава, А. Наварыч. Была абмеркавана творчасць празаікаў А. Краўцэвіча, А. Каўкі, Ул. Давыдоўскага, М. Карпечанкі, П. Сямінскага. Па выніках галасавання ўсе прэтэндэнты атрымалі рэкамендацыі да ўступлення ў сябры СБП.

Вёў секцыю Барыс Пятровіч.

ЯнАк

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

З Новага года стала магчымым аформіць падпіску ва ўсіх аддзяленнях сувязі на яшчэ адзін беларускамоўны хрысціянскі літаратурна-культуралагічны часопіс (штокварталнік) "Наша вера", колькі гадоў таму заснаваны Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіяй.

На першае паўгоддзе можна падпісацца да 15 лютага 2004 года.

Кошт індывідуальнай падпіскі:
(Індэкс — 74913)
на тры месяцы — 4470 рублёў;
на шэсць месяцаў — 8940 рублёў.

Кошт ведамаснай падпіскі:
(Індэкс — 74913/2)
на тры месяцы — 4500 рублёў;
на шэсць месяцаў — 9000 рублёў.

ДЗМІТРЫЙ БУГАЁЎ:
«ЛІТАРАТУРА — ПАДМУРАК НАЦЫЯНАЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ"

Зусім нядаўна — 12 студзеня — наш суразмоўца Дзмітрый Бугаёў адзначыў 75-гадовы юбілей. Мы аніяк не маглі прамінуць такую нагоду сустрэцца са знаным крытыкам хаця б таму, што і XX стагоддзе, і эпоха сацыялізму засталіся ў мінулым, але ніхто лепей за крытыка не змог бы ацаніць той этап развіцця ў беларускай нацыянальнай літаратуры.

— Вам, як крытыку, даводзілася аналізаваць сутнасць ледзь не кожнага больш-менш значнага твора айчыннай літаратуры. Вашы назіранні: літаратура развівалася з падрэзанымі крыламі?

— Так, наша літаратура і ў дарэвалюцыйныя, і ў савецкія часы развівалася ў складаных умовах. Але яна нараджалася з патрэб народнага жыцця і так ці іначай гэтыя патрэбы адлюстроўвала. "З глыбінь жыватворных народнага духу" (коласаўскі выраз) да літаратурнай творчасці ўздымаліся нашы вялікія класікі — Купала і Колас, Багдановіч і Гарэцкі, шматлікія прадаўжальнікі іх традыцый. А наконт "падрэзаных крылаў" будзе справядліва зазначыць, што нашым пісьменнікам часта не толькі падразалі крылы, але і адымалі галовы. Асабліва лютавалі ў гэтых адносінах бальшавікі, якія пазнімалі мудрыя галовы многіх выдатных пісьменнікаў, вынішчаючы найперш самых таленавітых з іх. Выключэнні былі вельмі рэдкімі. Але на змену знішчаным прыходзілі новыя. І літаратура ўсё ж выстаяла.

— З вышыні вопыту: якія пачуцці ў вас выклікае беларуская літаратура XX стагоддзя: расчараванне, сум, абыякавасць, гонар..?

— Наша літаратура XX стагоддзя выклікае ў мяне перш за ўсё гонар за тое, што яна ёсць. Самы моцны падмурак беларускай нацыянальнай культуры складала і складае побач з народнай творчасцю (фальклорам) менавіта літаратура. Дзякуючы ім яшчэ жыве ў нас нацыянальны дух. Даводзілася і расчароўвацца, назіраючы, як выдаваліся за сапраўдную літаратуру творы лакіровачныя, дагодліва-лакейскія, якія пісалі не толькі літаратурныя пасрэднасці, але і некаторыя таленавітыя аўтары з гнуткай спінай пры мажнай паставе. З сумам чыталіся творы бяздарныя. Абыякавасці ніколі не было. У мяне халерычны тэмперамент, актыўная эмацыянальная рэакцыя на ўсё, што здараецца ў жыцці і літаратуры. Таму абыякава ставіцца ні да чаго не магу. Кажуць, гэта шкодна для здароўя. Але ж заспакоенасць — вынаходства д'ябла. Не стану сцвярджаць, што д'ябал не падбіваў і мяне на розныя дурыкі (у побыце, у звычайных жыццёвых стасунках). Але ў стаўленні да літаратуры ад гэтай д'ябальшчыны я імкнуўся адкараскавацца, неяк адбівацца. Іншая справа — наколькі гэта ўдавалася. Тут відней збоку, а не самому сабе.

— З вышыні ўзросту: што з напісанага за савецкім часам мае права на прыналежнасць да нацыянальнай літаратуры? Ці ёсць кнігі, што, умоўна кажучы, застануцца ў вечнасці?

— Пра вечнасць і за яе гаварыць рызыкоўна. Тут вельмі лёгка памыліцца. Але я не сумняваюся, што ў нас ёсць творы, імёны творцаў, якія будуць жыць, пакуль застануцца ў свеце беларусы. У савецкія часы насуперак усякаму ціску нараждалася магутная творчасць Васіля Быкава, які для майго пакалення стаў знакавай фігурай № 1. А яшчэ ж да яго за савецкім часам у пакутах, у блуканнях ад ссылак да турэмных камер нараджаліся выдатныя творы Максіма Гарэцкага. Ды былі ж у нас яшчэ Кандрат Крапіва і Кузьма Чорны, Іван Мележ і Уладзімір Караткевіч, Аркадзь Куляшоў і Максім Танк, Пімен Панчанка і Яўгенія Янішчыц, мой добры сябра Іван Чыгрынаў і цэлы шэраг іншых неардынарных пісьменнікаў. На поўную сілу творыць і цяпер Янка Брыль. Яны не толькі належаць да нацыянальнай літаратуры, але і складаюць яе гонар, хоць некаторыя з гэтых выдатных творцаў мусілі пісаць і рэчы ангажаваныя, з відавочным праслаўленнем сталіншчыны, савецкага таталітарызму. Такія накладкі, відаць, непазбежныя для пісьменнікаў, вымушаных працаваць ва ўмовах несвабоды. Але гістарычны вопыт паказвае, што цалкам зацісну́ць культуру, мастацтва, літаратуру ніколі не ўдаецца.

— Вы аўтар фундаментальных прац пра творчасць многіх літаратараў. Што, акрамя мовы, у іх творчасці было агульным, што яднала гэтых людзей?

— Я не стаў бы называць кнігі фундаментальнымі. Якраз за фундаментальнасцю не гнаўся ніколі. Мне здавалася, што трэба імкнуцца да іншага, пісаць так, каб і крытычныя, літаратуразнаўчыя працы чыталіся без натугі, прымусу, а наадварот, з цікавасцю. Гэтая ўстаноўка на эмацыянальны кантакт з чытачом для мяне заўсёды была вельмі істотная. Пісаў я пераважна пра пісьменнікаў выдатных ці па меншай меры добрых. Усіх іх яднала тое, што я вынес у загаловак сваёй кнігі "Служэнне Беларусі" (выйшла ў 2003 годзе ў "Мастацкай літаратуры"). Гэтае служэнне, любоў да бацькаўшчыны яднае не толькі пісьменнікаў, якія жылі і яшчэ жывуць у Беларусі, але і прадстаўнікоў дыяспары, тых, каго мы адносілі да эміграцкай літаратуры. Людзі з супрацьлеглымі ідэалагічнымі поглядамі менавіта па гэтай прыкмеце (імкненне служыць бацькаўшчыне, любоў да Беларусі) збліжаюцца трывала і надзейна. М. Танк і Н. Арсеннева, прававерны А. Куляшоў і Л. Геніюш з яе непрыманнем савецкіх парадкаў тут ідуць поруч як прадстаўнікі аднаго народа, адной нацыі.

— Ці заўжды пісьменнік, пішучы мастацкі твор, расказвае пра сябе?

— Пісьменнік так ці іначай, непасрэдна ці больш ускосна адлюстроўваецца ў сваім творы і ў гэтым сэнсе абавязкова расказвае і пра сябе. Тут розняцца мастакі адзін ад другога толькі ступенню і формамі сваёй выяўленасці, адкрытасці. У лірыкаў яна звычайна навідавоку. У эпікаў ці драматургаў больш апасродкаванасці. Але асоба аўтара ў добрым творы заўсёды будзе адчувацца. Зрэшты, па тым, што робіць кожны чалавек, можна меркаваць і пра яго самога. У літаратуры і мастацтве гэта выяўляецца найбольш ярка і пэўна.

— Часам кнігу параўноўваюць з лекамі ад адзіноты. Чым кніга ўяўляецца вам?

— Для мяне кніга — духоўнае апірышча, без чаго я сваё жыццё не ўяўляю. Я многа часу трачу і на свае ўласныя кнігі. Але гэта таксама тое, чым я жыву. Ну, няхай не ўсё, бо трэба ж чалавеку яшчэ падтрымліваць сваё фізічнае існаванне на грэшнай зямлі. Але без кнігі, зрэшты, як і без праўдзівых сродкаў інфармацыі, чалавек у сучасным грамадстве паўнацэнна жыць не можа.

— Калі праўда тое, што аўтар уяўляецца нам духоўнікам, а ў яго творах мы шукаем перш за ўсё адпаведнасці са сваім унутраным светам, дык хто з літаратараў найбольш "ваш" (з нацыянальнай і сусветнай літаратур)?

— Часткова на гэтае пытанне я ўжо адказаў раней, назваўшы Васіля Быкава. Тут дадам, што ягоная творчасць і сама асоба ўражвалі мяне найбольш, у цяжкія хвіліны падтрымлівалі. Цяпер грэе памяць пра яго чалавечнасць і выключную далікатнасць. Але блізкае, патрэбнае, павучальнае я знаходзіў і знаходжу не толькі ў Быкава. Мне пашанцавала на добрыя кантакты з многімі выдатнымі беларускімі пісьменнікамі. Назаву Дубоўку і Крапіву, Лынькова і Мележа, Адамовіча і Брыля, Танка і Панчанку. З рускіх пісьменнікаў-сучаснікаў і прадстаўнікоў іншых, як тады казалі, братніх літаратур у свой час захапляўся А. Твардоўскім, С. Залыгіным, В. Астаф'евым, А. Салжаніцыным, І. Драчом, А. Ганчаром, Д. Паўлычкам, Ч. Айтматавым, Р. Гамзатавым, Д. Кугульцінавым, К. Куліевым. Кантактаў тут ужо ці не было зусім, ці справа абмяжоўвалася адзінкавымі, найчасцей выпадковымі сустрэчамі. Бывала, што прыходзілася і расчароўвацца. Вялікім кумірам і для мяне, і для многіх маіх равеснікаў быў А. Салжаніцын, толькі за чытанне якога некалі можна было атрымаць дзесяць гадоў зняволення (пасля з'яўлення "Архіпелага ГУЛАГа"). Але цяпер калі чую, чытаю прапановы Аляксандра Ісаевіча ўключыць Беларусь у склад Расіі, бо беларусы нібыта настолькі блізкія да рускіх, што нас можна не лічыць адметным народам, дык усякае захапленне былым кумірам знікае. А нараджаецца прыкрасць і шкадаванне, што колішнія пракокі паўтараюць адыёзныя, для нас абразлівыя сцвярджэнні самых зацята-р'яных русіфікатараў з імперскай закваскай, дабра ад якіх беларусам ніколі не было. Сярод прадстаўнікоў зарубежнай літаратуры захапляўся Я. Гашакам (яго неўміручая кніга пра Швейка ў мяне і цяпер на падхваце), Міцкевічам і Байранам, Хемінгуэем, Фолкнерам, Сэлінджэрам, Маркесам. Заўсёды хвалявала і хвалюе руская класіка ад Пушкіна да Л. Талстога, Дастаеўскага і Буніна.

— Станоўчы герой большасці кніг, якія вам даводзілася разглядаць як крытыку, герой савецкай эпохі ў сённяшняга маладога пакалення можа выклікаць хіба што іронію... Які ж сучасны герой можа задаволіць сучасную публіку?

— За сённяшняе маладое пакаленне гаварыць не бяруся. А наконт іроніі, якую нібыта абавязкова павінен выклікаць сёння няхай сабе толькі ў маладых герой савецкай эпохі, дык магу зазначыць, што на яе (іронію) штурхае павярхоўны погляд. Урэшце ж літаратура — люстра грамадства свайго часу, эпохі. І мне бывае цікава перачытваць, вядома, пад настрой, самыя павярхоўныя творы савецкай пары з яўнай ідэалізацыяй такой станоўчасці, якая сёння сапраўды можа выклікаць усмешку. А я чытаю і радуюся: усё ж так наша жыццё перамянілася істотна. Як бы мы ні наракалі на наш час (гэта робіцца сучаснікамі заўсёды), а і па той спрэс прыгладжанай літаратуры відаць, як далёка мы адышлі ад дзікасці, прымітыву, заціснутасці, ва ўмовах якіх некалі мусілі жыць.

— Ці супадае роля, якую грамадства ўскладае на пісьменніка, з роллю, якую ён сам сабе прызначае?

— Супадзенні тут вельмі рэдкія. Самыя выдатныя пісьменнікі, як правіла, не ўкладваюцца ў звыклыя грамадскія стэрэатыпы. Яны самое грамадства штурхаюць наперад, за што іх і б'юць, бывае, што і неміласэрна, з вялікай зацятасцю, нават лютасцю. Могуць і распяць геніяльнага творцу. А помнік яму паставяць пасмяротна, праз працяглы час пасля знішчэння. Але сапраўдныя мастакі ідуць сваёй дарогай, не зважаючы на крыкі, выццё, улюлюканне, пагрозы, шантаж. З аглядкай жа, з баязлівым прыслухоўваннем (а што там падумае грамадства ды яшчэ ў асобе афіцыйных прадстаўнікоў) вялікія мастацкія адкрыцці не робяцца. Толькі голас уласнага сумлення, покліч уласнага таленту і з'яўляецца надзейнай апорай мастака. Некалі гэтую думку я імкнуўся сцвердзіць, назваўшы кнігу пра Івана Мележа "Вернасць прызванню". Мележ тым, што ўвайшло ў гэтую кнігу, быў усцешаны.

Гутарыла В. КУРТАНІЧ

ВЕЦЕР У ГРЫВАХ

Яшчэ тыдзень будзе працаваць у памяшканні Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі выстава твораў скульптара Сяргея БАНДАРЭНКІ "Бронзавы век".

Усё пачалося са станковай скульптуры Кастуся Каліноўскага на кані, якую Сяргей Бандарэнка рабіў, праходзячы на пачатку 80-х аспірантуру ў майстэрні Заіра Азгура. Менавіта выява каня пад Каліноўскім не задавальняла маладога скульптара — нейкі невыразны ён атрымаўся, як нежывы. І Бандарэнка паехаў на конезавод у Ратамку, дзе пазнаёміўся са славутым вершнікам, алімпійскім чэмпіёнам Пятром Угрумавым і ягоным Саідам — канём тракененскай пароды, не менш славутым, чым ягоны гаспадар. Вось тут і запаў Бандарэнка на коней! Большасць экстэр'ерных рысаў Саіда мастак перадаў каню пад Каліноўскім — моц, грацыёзнасць, упартасць ды рахманасць. Зараз Сяргей упэўнены, што не памыліўся — толькі такі конь мог быць пад нацыянальным героем, чалавекам маладога веку, але досыць уладарным, мужным, гожым паставаю і тварам.

Тады ж Бандарэнка зрабіў заадно партрэтную групу — Угрумаў і Саід. Зараз Угрумаў жыве ў Маскве, лічыцца адным з лепшых трэнераў па выездцы ў Расіі, а Саід неўзабаве пасля Алімпіяды "выйшаў на пенсію" і дажываў свой век на ратамскай стайні, непадалёк ад якой і быў пахаваны. Засталася дагледжаная магіла, на якой, кажа Сяргей, варта было б ратамскім заводчыкам паставіць помнік славутаму каню, а нашчадкаў у Саіда не засталося. Бо быў ён мерынам. Звычайна выязных коней у маладосці пакладаюць, каб характарам быў рахманы. Так было і з Саідам. Але, калі ён стаў славутым чэмпіёнам, аб гэтым пашкадавалі — ён мог бы даць добры завод і прынесці немалыя прыбыткі. Як гэта робіць Івярнэл — неаднаразовы чэмпіён тракененскай пароды, патомкі 2-3-гадовага ўзросту якога каштуюць на аукцыёне 300—350 тыс. еўра. Па замове гаспадара Івярнэла Бандарэнка ездзіў у Германію, дзе паблізу Гамбурга гадуецца славуты конь, і з натуры рабіў у пластыліне ягоную партрэтную скульптуру. Гаспадар дазволіў: рабі колькі хочаш копій і выстаўляй, дзе толькі можна — і мастаку прыбытак і заводчыку рэклама! Часцяком прафесійныя конезаводчыкі, жакеі ці трэнеры, трапіўшы на замежную выставу скульптур Бандарэнкі, з першага зірку пазнаюць паставу каня: "О! Івярнэл!"

А іншы гаспадар замаўляе скульптурны партрэт свайго ўлюбёнца толькі ў адзіным экземпляры і, крый Божа, парушыць дамову! Нават у аўтара не застаецца копіі. Гэта, вядома, засмучае Сяргея. Тэхніка ліцця, якую ён выкарыстоўвае ("замяшчэнне воску"), дазваляе рабіць да дзесяці копій, але Бандарэнка задавальняецца чатырма-пяццю: якасць — ветлівасць мастака. Прадаючы копіі, ён зарабляе сабе на пражытак, творчыя паездкі, выставы, а галоўнае — на метал для будучых работ. У Беларусі ягоныя скульптуры мелі б большы попыт, ды ў людзей грошай няма, таму большасць работ ідуць за мяжу і ў Расію.

Мяне зацікавіла скульптура "Вецер у грывах". Як прызнаўся Бандарэнка, гэта спроба рэканструкцыі каня, на якім у XVI стагоддзі ездзілі воі Вялікага княства Літоўскага — Мікалай Радзівіл Чорны, Леў Сапега, Кастусь Астрожскі альбо Сцяпан Батура. "Крыжакі ды лівонскія рыцары, вяртаючыся з войнаў за "гроб гасподні", прывозілі з Блізкага Усходу арабскіх скакуноў, якія тады вельмі цаніліся ў Еўропе, — мяркуе Сяргей. — Тут яны скрыжоўваліся з нямецкімі тракенамі ды, мабыць, з ліцвінскімі дрыгкантамі, шмат разоў памянёнымі ў творах Караткевіча. Ад арабскага аргамака нашаму мешанцу перадаліся жвавасць і грацыёзнасць, ад тракена — дужасць і адвага, ад дрыгканта — цярплівасць і цягавітасць. Менавіта такі конь павінен быць на Гербе "Пагоня"! — упэўнены Сяргей Бандарэнка.



Скончыўшы ў 1981 годзе аддзяленне скульптуры Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (зараз Беларуская акадэмія мастацтваў), С. Бандарэнка завяршаў прафесійную адукацыю ў творчых майстэрнях аспірантуры ў аднаго з самых знаных манументалістаў нашага часу Заіра Азгура. Гэта, мусіць, і абумовіла накірунак ягонай творчасці ў рэчышчы акадэмічнай традыцыі. Скульптуры С. Бандарэнкі вельмі нагадалі мне графіку вядомага мастака У. Лукашыка, таксама "павернутага" па конскай тэме.

Дык хто ён, Сяргей Бандарэнка, — мастак-аніміаліст ці станковы скульптар? Пры ўсім ягоным грунтоўным досведзе ў "конскай справе" — анатоміі і экстэр'еры каня, ягонай псіхалогіі, гісторыі конезаводства і паходжання конскіх парод — Бандарэнка не прыкладны аніміаліст, а адзіны, як кажуць, сёння ў Еўропе мастак-скульптар, што абраў аб'ектам сваёй творчасці коней.

Акрамя добрага табуна, на выставе ёсць і іншыя "бронзы", як іх называе Сяргей. Гэта напаўміфічныя, закаваныя ў браню насарогі, сланы, пачварныя крабы. Тры цудоўныя "цёплыя" скульптуры — "Фаэтон", "Дзяўчына. Ню" ды "Галава каня" зроблены з чырвонага дрэва "махагоні", кавалак якога Сяргею перапаў у спадчыну ад Азгура.

Дык ці ўласцівы творчасці Сяргея Бандарэнкі дух камерцыялізацыі? Так, адкажу я пераканана, бо не бачу ў гэтым нічога благога. Мы звыкліся ўслед за Марксам чаўпсці пра капіталістычную залежнасць мастака ад грашовага мяшка. Ну, а сацыялістычная залежнасць ад дзяржавы, хіба лепей?! Вядома ж, натхненне не прадаецца! Але ж "можна рукапіс прадаць"... Сёння мастацтву без камерцыі, без рэкламы, без раскруткі наканавана пыліцца па закутках.

Алесь ГАЎРОН

ШЧАСЦЯ ТАБЕ, БАБЫЛЬ!..

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 9)

Ілгала я Уладзіку. Была крыўда. На сябе, на няўдалы свой лёс. Ды і ці можа ён быць іншым у такіх, як я? Я з тых, пра каго ў вочы гавораць "не от мира сего", а за вочы пакручваюць пальцамі ля скроні. Мяне, сталую жанчыну, да гэтага часу балюча раняць не толькі грубыя, але і здавалася звычайныя словы, але сказаныя "не такім голасам". Я не люблю гасцей з застоллямі, не люблю хадзіць у госці сама. Не люблю пустой каляпад'ездная балбатні, не ўмею хітрыць і падладжвацца. А яшчэ, як бы гэта далікатней сказаць, я не належу да жанчын, разняволеных у інтымных плане. І ўвогуле, мне здаецца, што "гэта" ні ў якім разе нельга выносіць на публічнае абмеркаванне, а тым больш на ўсеагульны, як тое сёння робіцца ў кіно і на тэлебачанні, паказ. Я ўся сцінаюся, калі пачынаецца рэклама тых прадметаў, пра існаванне якіх мужчыны, па-мойму, нават здагадвацца не павінны. А ўрэшце, хопіць пералічваць. Думаю, і так зразумела.

Я і да сённяшняга дня не магу пагадзіцца з думкаю, што цяжарная школьніца — ніякая не трагедыя, а зусім паўсядзённая справа, што цяжарнасць ужо афіцыйна лічыцца ПАДСТАВАЮ для ВЫЗВАЛЕННЯ АД ЭКЗАМЕНАЎ. Цяжарыць нашы "дзяўчаткі" сталі штогод, і некаторыя з класных кіраўнікоў узялі на сябе абавязак хадзіць у адведкі да парадзіх.

Не магу пагадзіцца і з тым, што асноўным зместам так званага "палавога выхавання" становіцца прапаганда супрацьзачаткавых сродкаў і бяспечнага сексу. Калі ж на адным са шматлікіх нашых пасяджэнняў я сказала, што замест таго, каб прапагандаваць бяспечны секс, трэба выхоўваць у падлеткаў цнатлівасць і чысціню, з мяне толькі пасмяяліся: "Пра якую цнатлівасць, можна гаварыць, калі адна Міхальцова з восьмага "а" чацвярых аднакласнікаў цікавай хваробаю ўзнагародзіла!"

Я адмовілася ад класнага кіраўніцтва, перастала прыносіць дадому вучнёўскія сшыткі.

Думкі пра тое, каб назусім пакінуць настаўніцкую працу, у мяне тады яшчэ не было. Яна прыйшла пазней, разам са словам-мутантам "инновация", а па-нашаму "новаўвядзенне", "навізна" і тое, што яно за сабою прынесла.А ў школе між тым пачаўся сапраўдны "инновационный" бум: дакладныя, рэферэты, планы, справаздачы, эксперыменты і — праверкі, праверкі, праверкі... Займацца асноўным сваім абавязкам — вучыць дзяцей — стала немагчыма. А тут яшчэ папаўзлі чуткі пра дванаццацігадовае школьнае навучанне...

Вядома ж, перш чым звольніцца, трэба было знайсці работу. Я ж спачатку звольнілася, потым пачала шукаць. І вось цацачны базар. Маё пакаранне і мая ганьба.

*

Немагчыма ўжо ўведаць, хто пашыў першую цацку са штучнага футра, што вырабляла галоўнае прамысловае прадпрыемства нашага горада і якая гэта была цацка. Мо паўсюдна вядомы "мішка"? А можа, блазнаватая малпа ці казачная царэўна-жаба? Спачатку новым рамяством займаліся адзінкі і вырабы свае прадавалі на пероне ля цягнікоў, якія спыняліся на нашай даволі буйнай станцыі. Але прыйшла часіна, калі "выдатак праклятага капіталізму" — беспрацоўе — стала горкай рэальнасцю нашага "самага шчаслівага ў свеце грамадства", і колькасць "цацачнікаў" пачала хутка расці. Вось тады і вырашана было стварыць базар. "Базар" уяўляе сабой заасфальтаваную пляцоўку, размечаную белай фарбаю на роўныя квадрацікі, на кожным з якіх той жа фарбаю напісаны нумар. Адразу ж з'явілася тут мажная кабета з рулончыкам квітанцый, а на хуткую руку ўзведзеная з не вельмі радасным для "цацачнікаў" рускамоўным надпісам "Налоговая полиция". Час ад часу з будачкі выходзіла тройка-чацвёрка паважных дзецюкоў са скуранымі папкамі і тады на базары пачыналася мітусня: "камерсанты", сярод якіх было нямала дзяцей, хапалі свае цацкі і разбягаліся хто куды. Дзецюкі са скуранымі папкамі імгненна гублялі сваю паважлівасць і ператвараліся ў азартных паляўнічых. Хтосьці плакаў, хтосьці прасіўся, з лаянкай шпурлялі свой тавар пад ногі "паляўнічым" — значная большасць "цацачнікаў" не мае пасведчання прадпрымальнікаў, бо не ў стане была заплаціць велізарныя ў параўнанні са сціплым заробкам налогі...

Вось такі ён, цацачны "базар". Маё пакаранне і мая ганьба. Можа, і не стала сілы трываць усё гэта, калі ў даўно пакінутых мною Ліпках не было ў мяне сваёй хаты. А яшчэ... яго, "бабыля" Уладзіка.

*

— Ну, што? — Уладзік зноў асцярожна кранае мяне за плячо. — Заўтра зноў забягу на досвітку. Калі будзеш спаць, я ў акно пастукаю, ты толькі не пужайся.

Назаўтра я ўсхапілася на пачатку пятай гадзіны. Таропка апранулася і, час ад часу пазіраючы ў акно, выпіла кубачак гарбаты. Прайшло паўгадзіны. Потым яшчэ паўгадзіны. Ужо развіднела, а Уладзік не з'яўляўся. Няўжо праспаў? Я кінула ў кошык некалькі яблыкаў і напрасткі, праз луг, пашыбавала да яго. На ўскрайку сцежкі, за якой пачыналіся агароды, нешта бліснула. Я схілілася, каб лепш разгледзець, што там такое. Завушніца? Так, залатая завушніца. І вельмі прыгожая: у чашачцы, стылізаванай пад кветку лілеі, перламутравы каменьчык, падобны на кропельку ранішняй расы, якую яшчэ не паспелі запаліць сонечныя промні. Я паклала знаходку ў кішэню вятроўкі і прыспешыла крок.

Цётка Арына ўжо завіхалася ў двары.

— Добрай раніцы, цётачка! — прывіталася я. — Уладзік спіць?

— Якое там спіць?! — прабурчала цётка Арына. — Хвілін пяць таму, як прыйшоў.

Я здзівілася:

— Адкуль прыйшоў?

— А гэта ты ў яго спытайся, — цётка Арына адчыніла фортку і пачала выганяць карову. — Можа, па грыбы хадзіў.

— Ноччу?

— А што — ноччу? Узяў сабе ліхтарык, ды і ідзі. Яго ж нічога, апроч грыбоў, не цікавіць.

Я зайшла ў хату. Уладзік ляжаў на ложку за квяцістай шырмаю, задуменна глядзеў у столь і, па ўсяму відаць было, нікуды ісці не збіраўся.

— А як жа Асіннікі? — з дакорам у голасе спыталася я. — Ці ты, можа, захварэў?

— Ды не, не захварэў.

— Здарылася што-небудзь?

— Потым. Я ўсё раскажу табе потым. Вось толькі пасплю крышачку. А ты адна ў лес не ідзі, добра?

— Добра. Тым больш, што адзін грыб я і так знайшла. Зірні, — і я паказала яму "лілею".

— Адкуль гэта ў цябе? — усклікнуў Уладзік і амаль выхапіў з маіх рук завушніцу. — Дзе ты ўзяла?

— Ды што з табою? — пакрыўдзілася я. — Ты ж не думаеш, што я каго-небудзь абрабавала? Знайшла гэтую завушніцу. Ля сцежкі знайшла, за вашым агародам. Можа, хто з гомельцаў згубіў па дарозе ў лес. Трэба аб'яву напісаць і прыклеіць на станцыі.

— Не трэба ніякай аб'явы. Ведаю, чыя гэта завушніца. Я сам яе аддам, — ледзьве чутна прамовіў Уладзік і чамусьці пачырванеў.

— Ну і чыя ж?

— Верына завушніца. Гэта мой колішні падарунак ёй. — Уладзік нейкае імгненне памаўчаў, а потым загаварыў хутка і горача. — Ніна, яна прыехала. Развялася са сваім Мікам і прыехала. З сынам. Яшчэ тры дні таму. Я думаў, што мінула ўсё. Але ўчора мы зусім выпадкова сустрэліся. Там, на лузе. Яна ад рэчкі ішла. Мы да самай раніцы там хадзілі. І вырашылі... Словам, кахаю я яе... І яна мяне — таксама! І мы вырашылі...

Ну, вядома ж, я павінна была ўзрадавацца, павіншаваць Уладзіка... Замест гэтага няўклюдна патапталася на месцы, і, перамагаючы сябе, няшчыра ўсміхнулася:

— Ну што ж, шчасця табе, бабыль...

Да дзвярэй ішла чамусьці вельмі доўга. І яшчэ даўжэй адчувала спінаю поўны неўразумення і крыўды Уладзікаў позірк.

*

Той жа самы дызель. Нават вагон той жа самы — з надрапаным на сцяне адвечным "Таня + Толя". Праплываюць за акном і хаваюцца за прысадамі мае Ліпкі.

— Вось і ўсё! Вось і ўсё! — настойліва выстукваюць колы.

— Што — "усё"?! — злуюся я.

— Ха-та! Ха-та!

— Але што я зраблю? Няхай расцягваюць! Няхай багацеюць! Мне ўсё роўна!

— А Ула-дзік? А Ула-дзік? — не адступаюць колы.

— Уладзік — проста мой сябра! Проста сябра! — амаль крычу я.

— Так-так! Так-так! — насмешліва гучыць мне ў адказ. — І што ця-пер? І што ця-пер?

— Жыццё! Проста жыццё! Яго ніколі не позна пачаць наноў. Вось павыкідваю свае цацкі і пайду... у школу!

— Так-так! Так-так! — і ў зладным стуку мне ўжо не чуецца ні насмешкі, ні дакору. Толькі з а д у м е н н а с ц ь і с п а г а д а: так-так...

• ЛеГалІЗАЦЫЯ •

Уладзімір КАЛЕСНІК:

"У паэтаў, надзеленых мяккасцю і чуласцю душы, існуе праблема пераадолення пачуццяў. Вядомы псіхолаг творчасці Л.Выгоцкі слушна заўважае: "Нават самае шчырае пачуццё само па сабе не ў стане стварыць мастацтва. Для гэтага неабходны яшчэ акт пераадолення гэтага пачуцця, яго вызвалення, перамогі над ім, і толькі калі гэты акт становіцца фактам, толькі тады здзяйсняецца мастацтва".

Пераадольваць пачуцці — значыць ператвараць іх у вобразы, тыпізаваць, надаваць ім эстэтычную змястоўнасць, здольнасць абуджаць аднолькавыя з паэтавымі душэўныя зрухі ў чытача. Недастатковасць пераадолення пачуцця прыводзіць да імпрэсіўнасці або чуллівасці паэтычных вобразаў, а празмернае пераадоленне — да абстракцый ці маралізатарскай засушанасці."

Васіль ЖУКОВІЧ. *"У храме хараства і смутку"* (кніга паэзіі, Мінск, выд-ва "Мастацкая літаратура", 2003г., рэдактар У.Мазго, 1500 экз., 165 стар., кошт 2240).

Васіль Жуковіч — паэт вопытны і ўжо немалады. Хоць кажуць, што сапраўдныя паэты не старэюць... Бог ведае. Не пра тое рэч, а пра ўзрост. Усё, што да гэтай пары напісаў Васіль Аляксеевіч мела адэкватны яго голасу розгалас... І сам ён чалавек вельмі чыстай душы, шчыры і дабрадушны. Свой першы зборнік В.Жуковіч выдаў толькі ў 34 гады. А найбольш удалая яго кніжка "Цана цішыні" памятаецца мной і па сёння. Не магу нават сфармуляваць чым, якімі радкамі, — нейкай агульнай цнатліва-лірычнай аўрай...

І гэты свой (апошні па часе) зборнік "У храме хараства і смутку" В.Жуковіч пачынае адмысловым пралогам:

Калі б не адчуваў, што напішу,
як да мяне паэты не пісалі...
...няхай бы рыфмы падалі да ног,
клянуся: не падняў бы аніводнай!

Ой як самаўпэўнена! (Праўда, прачытаўшы кніжку да канца, у гэтым сумняваешся.) Аднак на пачатку заўжды верыш паэту, тым больш, што і першы раздзел "лірычных вершаў" *разгортваецца*, можна сказаць, з пераказу Багдановічава запавета "пра жыта і васількі" ці, як звычайна цяпер кажуць, пра "паэзію чыстай красы". Тут, прызнаем, ёсць колькі адметных па сваіх мастацкіх выявах вершаў. Ну, вось хоць бы такія радкі:

Лёс мой, суровы мой бог,
чуеш душы прашэнне:
не пасылай перамог
горшых за паражэнне!

Аднак, чым далей гартаеш старонкі зборніка, тым шчыльней *агортвае* цябе чытацкая абыякавасць і недаўменне. У чым тут справа? — думаеш ты. Навошта паэту спатрэбілася зарыфмоўваць усе свае надзённыя дзеі і стасункі з блізкімі людзьмі? Зрэшты — няхай, бо гэта яго ўласная справа, але навошта ўсё тое друкаваць у кніжцы выдадзенай за дзяржаўны кошт? Вунь, колькі ў нас таленавітых паэтаў кніжак не маюць: і Юрась Пацюпа, і Галіна Дубянецкая, і Наталля Кучмель...

І каму толькі ў зборніку няма прыватных прысвячэнняў, якія мала што гавораць канкрэтнаму чытачу N., якога спадар Васіль, спадзяюся, не хоча страціць... А калі ўлічыць, што ёсць тут яшчэ цыклы *"фігурных"*, *"апавядальных"* і *"акравершаў"*, то міжволі ўспамінаеш час **альбомных** захапленняў. Занатаваў "вершаванае пасланне" для сябе ці для некага — і досыць... Навошта дзеля публікацыі падобных вершаў выдаваць кніжку? Прыклады? Ды колькі заўгодна! Вось прысвячэнне прыхільніку хуткай язды Руслану:

Імчышся з хуткасцю сто дваццаць,
сваіх вязеш ты — бацьку ды сынка,
спяшаешся (прывык ужо спяшацца) —
цябе чакаюць справы, рызыкант,
і я маўчу, не час цяпер спрачацца.

Памаўчым і мы наконт мастацкай якасці працытаваных і шмат яшчэ якіх, падобных да гэтых, радкоў.

Знайшоў я і прысвячэнне нашаму вядомаму пісьменніку Андрэю Федарэнку. Верш называецца "Шахматы". Для недасведчаных патлумачу, што гады тры таму, калі В.Жуковіч працаваў яшчэ ў часопісе "Полымя", у тым пакоі, дзе цяпер знаходзіцца бухгалтэрыя РВУ "Літаратура і Мастацтва", пасля абеду, як па камандзе, ледзь не штодня збіраліся аматары шахмат. Разгортваліся яшчэ якія бітвы, часам даходзіла ледзь не да мардабою... Сярод *гарачых* лічыліся і ўпомнены вышэй А.Федарэнка, і Р.Тармола-Мірскі, і Б.Пятровіч, і Ю.Станкевіч, а таксама аўтар гэтых радкоў (найчасцей як "балельшчык"). Толькі адзін В.Жуковіч быў спакойны і непахісны. Ён і перамагаў...

Камусьці — радасць перамогі:
тупік фінальны — каралю!..
Як мора, як прастор дарогі,
як волю, шахматы люблю.

Не ведаю, як можна параўноўваць любоў да шахмат з *морам*, *прасторам дарогі* а тым больш *воляй* (бо кожны змушаны гуляць, хоць і *сваю* партыю, але ж па *адзіных* для ўсіх *правілах*!)

Што да мяне, то я, наколькі памятаю, прайграў спадару Жуковічу ўсе свае "палымянскія" партыі. Агулам трэба прызнаць, што гэтаму паэту, відаць, і сёння ў шахматах няма роўных сярод беларускіх літаратараў. Тут ён сапраўдны *мастак*.

Паэзія ж унікае спакою і прагматызму. Яна якраз **творыцца** на *парывістасці і гарэнні*...

Ніна РАДЗІВОНЧЫК. *"Паляшучка"* (вершы; Мінск, выд-ва "Мастацкая літаратура", 2003г., 1000 экз., рэдактар К.Жук, кошт 1130).

Ніна Радзівончык — паэтка *даўняя*. Не сказаць, каб яна муляла вочы прыхільнікам краснага пісьменства, але час ад часу заяўляла пра сябе на старонках нашых часопісаў і газет. Была аўтарам калектыўнага зборніка "Лагодны прамень раніцы" (1988). Друкавала і апавяданні, але, прынамсі мне, найбольш запомнілася як крытык.

Вершы Н.Радзівончык, напісаныя пераважна ў традыцыйна-класічнай манеры, не вызначаюцца ні асаблівай стылістычнай арыгінальнасцю, ні навізной формы, таму і не выдзяляюцца на фоне сучаснай эксперыментальнай вершатворчасці нейкай сваёй самабытнай *пэўнасцю*. Гэта, аднак, не азначае, што паэтка не мае свайго голасу, найперш натуральных фізічных інтанацый і глыбока болевага біяграфічнага прыдыхання.

Бывае, што яшчэ адзіны міг,
Адзіны боль ці крыўда хоць якая,
Памрэ душа, зняверыцца, для ўсіх
Такою стане, як сцяна глухая.

Снег, яго першабытная белізна і чысціня — складаюць асноўны метафарычны і вобразны рад гэтага паэтычнага зборніка. Калі ў крытыцы, як я ўжо зазначаў, ды і ў прозе можна і трэба ставіць пэўныя грамадскія праблемы, то вострыя праблемы сучаснага грамадскага жыцця ў паэзіі — гэта прыкмета творчай нямогласці аўтара. Н.Радзівончык зашмат паказвае, канстатуе і характарызуе, замест таго, каб ажыўляць слова, маляваць уяўнасць, уваскрашаць сны і згаслую прыгажосць жыцця...

Аднак жа, ёсць у зборніку і вершы, што пакідаюць пасля прачытання *памяткі* для душы і сэрца. Як гэты — "Першы снег":

А снег ляжыць безабаронна-белы.
Зямля, як чысты ліст паперы, —
бяры, твары...
Перад даверам гэтай чысціні
Так боязна бяды.
Зірні:
Няўжо ў кагосьці з'явяцца намеры
На ім пакінуць чорныя сляды?

Не думаю, што паэтцы гэтак важная мая ўхвала ці крытыка яе кніжкі. Пэўна, ёй больш важнае маё стаўленне да яе ўласнага *мастацкага свету*. Скажу, што яно станоўчае ў тых межах, дзе *"не старэюць паэты, як і Зямля,// Што кожнай вясной сябе абнаўляе"*...

Астатняе — проза.

Алена ГІНЬКО. *"Пяшчота пры журбе"* (Серыя "Дэбют", вершы, Мінск, выд-ва "Мастацкая літаратура", 2003, рэдактар К.Жук, 1000 экз., 86 стар., кошт 2550).

Кожны сапраўдны мужчына ведае, што пераважная бальшыня жанчын дасканала выяўляе сабой і *змест* і *форму* самай адмысловай паэзіі. Ва ўсякім разе тое, што кожная жанчына — натура паэтычная, у любы час пацвердзіць вам айчынны маг любоўнай лірыкі Леанід Дранько-Майсюк, калі не насамрэч, то ў вершах абавязкова:

"Патухла свечка летняя. Даволі!
Адно прадонне і адзін зеніт.
"Паэт не памыляецца ніколі", —
Што ж, радуйся, самотны Леанід."

Шкада, канечне, што ў сваім "дэбютным" зборніку вершаў "Пяшчота пры журбе" абсалютна невядомая мне паэтка Алена Гінько нічога мне **невядомага** не адкрыла... Ды такой, здавалася б, бяды, бо яна ж сама — любоў: яе ўздых, зачараванне, боль і слёзы... Закавыка, аднак, у тым, што **форма** і **змест** аказаліся тут **разведзенымі**, а журба настолькі пераважыла пяшчоту, што пачала вырывацца з жаночай істоты, як перапоўнены гарачай лавай вулкан, і ад тых спарадычных эмоцый чытач натуральна *адстароньваўся*...

І пасыплецца град,
і дажджы загалосяць...
Адзінота наўсцяж
панаставіла кроснаў.
І снуе, і пляце
без малога прачуху
адзінокі павук
аднастайную скруху.

Працытаваў лепшае, бо далей пайшло, скрозь і падрад, чыста інерцыйнае — аўтару, як жанчыне, пэўна ж, важнае і балючае — але якая справа чытачу да таго, што *"Так хочацца шчасця паэту..."*, і таму вось *"Пяро рыпіць, галосіць ліра, душа ірвецца ў беспрасвет..."*

Цікава, хістаўся я ў подумках ад неўразумеласці таго жаночага енку і галашэння, а *ці чытае на ноч Алена малітвы*-вершы Дранько-Майсюка? Ці вучыцца паэзіі кахання з першых рук? Варта было б, бо галоўнае, па ўсім відаць, спасцігла:

Паэтава сэрца на крыж
штодзень і штоночы трапляе.
Відаць, ужо доля такая,
паэту спасланая звыш.

Наастатку хацелася б працытаваць *змысна скроены* мной своеасаблівы дыялог паэткі з самой сабою. Якраз на тэму творчасці і мастацтва.

"Ці талент ты маеш?..
Ці проста дзівак?..
Ці фарбаў няма больш вясёлых?.."
...Маўчыць на мае запытанні мастак,
ды чуюць маўчанне — анёлы.

Свет (о так!),
пяшчотай запалонены, знямее...
Не паланёны ж Музаю мастак
занатаваць-аздобіць не сумее
Яе, Мелодыю...

Таму пажаданне Алене Гінько адно — заручыцца гармоніяй зместу і формы. І — *"будзе дзень, калі пачуе мілы шэпт"*... Арфея...

Шаноўныя чытачы, усе гэтыя кніжкі вы можаце набыць у "КНІГАРНІ ПІСЬМЕННІКА", (Мінск, вул.Казлова, 2.)

ЛіМ

Выходзіць з 1932 ГОДА
У 1982 годзе ўзнагароджаны ордэнам Дружбы народаў

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР
Анатоль КАЗЛОЎ

Рэдакцыйная рада:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ,
Леанід ГАЛУБОВІЧ,
Віктар КАВАЛЁЎ,
Вольга КУРТАНІЧ,
Віктар ПАТАПЕНКА — намеснік галоўнага рэдактара,
Віктар ШНІП — адказны сакратар.

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220005, Мінск, вул. Захарава, 19
ТЭЛЕФОНЫ:
галоўны рэдактар — 284-6673
намеснік галоўнага рэдактара — 284-4404
адказны сакратар — 284-6673

АДДЗЕЛЫ:
публіцыстыкі — 284-7965
пісьмаў і грамадскай думкі — 284-7965
літаратурнага жыцця — 284-7965
крытыкі і бібліяграфіі — 284-7965
паэзіі і прозы — 284-7965
музыкі — 284-8153
тэатра, кіно — 284-8153
выяўленчага мастацтва — 284-8153
карэктарская — 284-8091
бухгалтэрыя — 284-6672
Тэл./факс — 284-84-61

Электоронны адрас:
e-mail: minsk@lim.by

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра РВУ "Літаратура і Мастацтва"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня Рэспубліканскага унітарнага прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку" г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 79

Індэкс 63856 Наклад 1635
Умоўна друк. арк. 3,72
Нумар падпісаны ў друк 15.1.2004 у 11.00

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь
Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Літаратура і Мастацтва"

Рэгістрацыйнае пасведчанне № 715

Заказ 61

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12